Па выніках навукова-даследчай работы ў 2008 г.

# Матэрыялы
## навукова-практычнай канферэнцыі

2009

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ПОЛАЦКІ
ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ
МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК

Па выніках навукова-даследчай работы ў 2008 г.

# Матэрыялы
## навукова-практычнай канферэнцыі

Полацк 2009

**ББК 63.3(4Беи)**
**М35**

**Друкуецца па рашэнні навукова-метадычнай рады НПГКМЗ**

**Укладальнік:** ***Т.А. Джумантаева,***
наместнік дырэктара па навуковай рабоце

М35 **Матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі:** (па выніках навукова-даследчай работы ў 2008 г.) / уклад. Т.А. Джумантаева. — Полацк: НПГКМЗ, 2009. — 236 с.: іл.

**ББК 63.3(4Беи)+79.1(4Беи)**

© Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік, 2009

## Ад укладальніка

Музей у сучаснай музеялогіі разглядаецца як гістарычна абумоўлены шматфункцыянальны інстытут сацыяльнай памяці, з дапамогай якога рэалізуецца грамадская патрэбнасць у адборы, зберажэнні і рэпрэзентацыі групы культурных і прыродных аб’ектаў, усведамляемых грамадствам як каштоўнасці, якія неабходна перадаваць з пакалення ў пакаленне. Зыходзячы з гэтага, музеі Полацка ўспрымаюцца беларускімі музеязнаўцамі як захавальнікі багатых старонак айчыннай культуры, як складовая частка культурна-гістарычнай прасторы горада. Яны са сваімі унікальнымі экспазіцыямі з’яўляюцца своеасаблівымі культурнымі тэкстамі. Рэпрэзентуючы наведвальніку тыя альбо іншыя артэфакты культуры, уводзячы яго ў сімвалічную рэальнасць, музеі здзяйсняюць у сваёй практычнай рабоце пераход ад мінулага да сучаснага і нярэдка робяць наведвальніка непасрэдным актыўным удзельнікам той ці іншай падзеі.

Полацкія музеі ў другой палове XX ст. пашырылі поле сваёй дзейнасці, уключыўшы ў працэс музеефікацыі не толькі асобныя аб’екты, але і культурную прастору горада ў цэлым. Яны маюць розныя формы, метады і спосабы арыентацыі наведвальніка ва унікальнай і разнастайнай культурнай прасторы горада і эфектыўна ўплываюць на засваенне суб’ектамі культуры сацыяльнага вопыту беларусаў. Што тычыцца музеяў-запаведнікаў, то яны наогул могуць служыць сімвалічнай крыніцай дыстантных вобразаў вялікага маштабу. Так, вобраз Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка рэдукуецца да аднаго сімвала — Сафійскага сабора, які ў сваю чаргу факусіруе ў свядомасці вобраз Беларусі ў цэлым.

Культурная прастора горада і музейная дзейнасць, якая арганізавана вакол яе, як адна з формаў сацыяльна-культурнай практыкі, сталі ўмовамі адраджэння рэгіянальнай культуры. Культурны рэгіён, які фарміруецца пры ўзаемадзеянні прыроднага і культурна-гістарычнага асяроддзя з сучаснай сацыяльна-культурнай практыкай, з’яўляецца асноўным аб’ектам рэгіянальнай музейнай дзейнасці. У сучасных умовах музейная дзейнасць разумеецца як дзейнасць грамадства ў адносінах да

прыроднай і культурнай спадчыны. Яна павінна стаць складаючай часткай мясцовых культурных працэсаў, а музейная сетка горада — сфарміравацца ў самастойны культурна-гаспадарчы комплекс. У выніку гэтага працэсу музей ператвараецца ў адзін з важнейшых рэгіёнаўтвараючых фактараў, і структура музейнай дзейнасці пачынае супадаць з рэгіянальнай прадметна-прасторавай структурай культурнай спадчыны.

Сёння музеі звяртаюцца непасрэдна да грамадства. Новыя экспазіцыйныя ідэі, прадстаўленне музейнай педагогікі ў якасці самастойнага напрамку, выкарыстанне ў музейнай практыцы апошніх дасягненняў сацыялогіі, семантыкі, камп'ютэрнай тэхналогіі ператвараюць традыцыйны музей у інтэграваны сацыяльны інстытут. Тэмы навуковых дакладаў, якія прагучалі на справаздачнай канферэнцыі па выніках навукова-даследчай работы супрацоўнікаў Музея-запаведніка ў 2008 г., пацвярджаюць гэта.

Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік у пэўнай ступені выступае як сімвал стабільнасці развіцця музейнай справы краіны. Абапіраючыся на шматвекавую гісторыю і выконваючы сваю сацыяльную функцыю, ён далучаецца да выхавання паўнацэнных грамадзян — будаўнікоў сваёй краіны, творцаў будучыні. Ва ўмовах музеефікацыі цэлых гістарычных тэрыторый, як гэта адбываецца ў Полацку, працэс ідзе тым імклівей, чым хутчэй ён спрыяе далучэнню чалавека сённяшняга да спрадвечных гістарычных вартасцяў свайго горада, рэгіёна і нарэшце, краіны. Музей ужо сёння ёсць неад'емная частка культурнай прасторы, самаідэнтыфікацыі народа, фарміравання яго самасвядомасці на падмурку спрадвечных агульначалавечых маральных каштоўнасцей і прынцыпаў.

# Навуковыя даследаванні

# Роль музейного предмета в образовательно-воспитательной функции музеев

***Андреева Н.А., Смирнова Т.Р.***

Революция в области информационных технологий конца XX в. практически перечеркнула чисто информационную функцию музеев. Электронные средства хранения и передачи информации сегодня «доставляют» сведения об уникальных экспонатах и их изображения из любой точки планеты и в любое место. Однако, институциональные задачи музея не только не потеряли своей актуальности, но ожидаемы обществом в ещё большей степени. Изменились запросы, но сохранились потребности общения с экспонатами, с музейным пространством, с профессиональным собеседником.

Музейный предмет (далее — МП) — не только центральное звено всей музейной деятельности, без которого последняя теряет свою музейную специфику, но и источник эмоционального воздействия, источник знаний.

Музеологи выделяют ряд свойств МП и практически единогласно называют три свойства:

- информативность (способность МП являться источником информации);
- экспрессивность (способность МП вызывать эмоции);
- аттрактивность (способность МП привлекать внимание, вызывать определенные чувства).

Но не хотелось бы исключать такие свойства МП как:

- репрезентативность (способность служить образом, представляющим целый ряд схожих с ним предметов);
- ассоциативность (способность вызывать ассоциации),

т.к. три из названных свойств — экспрессивность, аттрактивность и ассоциативность — характеризуют способность предмета вызывать эмоции, а два — информативность и репрезентативность — характеризуют способность предмета служить источником информации.

То есть музейный экспонат в условиях музейной среды имеет уникальную возможность воздействовать на интеллектуальные, волевые, эмоциональные процессы личности посетителя одновременно, а каждая экспозиция представляет собой программу передачи через экспонаты знаний, навыков, суждений, оценок и чувств. И поэтому каждый музейный сотрудник, независимо от вида музейной коммуникации, осуществляет образовательные, воспитательные, познавательные, информационные, развлекательные цели.

Природа предметов обусловливает их информативные возможности и особенности и определяет их принадлежность к конкретному типу источников: вещественным (памятникам материальной культуры), изобразительным, словесным (письменным и устным).

Вещественные памятники привлекают большее внимание посетителей, в т.ч. детей. Это лишь отчасти связано с трёхмерностью этих экспонатов, облегчающей, как известно, их восприятие и делающих их наиболее аттрактивными. Главная причина их воздействия — разнообразие заключённой в них информации, которую посетитель воспринимает в соответствии с наличием накопленных знаний и с помощью ряда экспозиционных приёмов.

Именно вещественный памятник как «след» реальной действительности в наибольшей мере вводит посетителя в обстановку прошедших или происходящих событий, способствует созданию образа этих событий, чувства причастности к ним и вместе с тем удостоверяет их, являясь частью реальности.

Иное место, как по своему содержанию, так и по музейным качествам, занимают письменные источники. Их значение для понимания исторического события, процесса, явления неоспоримо. Однако содержание письменных источников может быть воспринято только путём прочтения — процесса более сложного и длительного по сравнению со зрительным восприятием, и в большинстве случаев невозможно ни на экскурсиях, ни на музейно-педагогических занятиях (далее — МПЗ). Поэтому письменный источник-экспонат выступает в первую очередь в качестве знака эпохи, её памятника, доказательства или констатации определённого факта. И если брать

во внимание возраст, о котором мы говорим (это дошкольники и младшие школьники), то следует учитывать форму, фактуру, шрифт, почерк, оформление документа.

То есть МП в целом предстаёт перед осприятием посетителя и как воплощение исторической памяти, и как художественный образ, и как сенсорно выразительный объект. Его существование в сознании посетителя многозначно, и для полноценного понимания содержания памятника недостаточно усвоить некоторый объём вербальной информации. Посетителю необходимо умение наблюдать, сравнивать, переживать увиденное, умение анализировать, обобщать, делать выводы.

Практический опыт работы показал, что очень немногие приходящие в музей дети обладают перечисленными навыками и умеют применить их на практике. Ребёнок через общение с МП, с музейной средой должен приобрести навыки и умения:

- визуального общения,
- изложения и оценки самостоятельных суждений,
- интерпретации зрительных образов в условиях постоянного возрастающего потока информации,
- осмысление достижений общества,
- творчески активного отношения к окружающему миру.

Поэтому МПЗ для детей дошкольного и младшего школьного возраста изначально должны иметь педагогическую направленность, но нельзя забывать при этом, что в центре музейно-педагогического процесса находится МП, что принципиально отличает музей от других институтов образования и определяет специфику его методики. Т.е. перед музейными педагогами встает проблема подготовки к процессу обучения в музее, или, иными словами, необходим подготовительный этап, который можно определить как формирование внутренней готовности или установки на восприятие МП. Роль такого подготовительного этапа выполняют программы для детей 4-х, 5-и, 6-и и 7-и лет. Т.е. удельный вес музейно-педагогических программ (далее — МПП), подготавливающих детей к восприятию МП, составляет 80 % от всех существующих сегодня МПП.

Но недостаточно направить образовательный процесс в музеях только на передачу определённых знаний, умений и

навыков, не активизируя, не развивая познавательные психические процессы ребёнка.

Основными познавательными психическими процессами дошкольного и младшего школьного возраста являются: мышление, воображение, восприятие.

Мышление характеризуется возрастными новообразованиями, специфическими для каждой из стадий психического развития ребёнка. По форме мышление подразделяется на наглядно-действенное, наглядно-образное и словесно-логическое.

В наглядно-действенном мышлении умственные операции проявляются на основе действий с предметами; в наглядно-образном — на основе действий с предметами и образами; в словесно-логическом — на основе логических операций с понятиями.

Воображение — сложная психическая деятельность, формирующаяся в процессе развития ребёнка под влиянием условий жизни и воспитания.

Как отмечают Д.Б. Эльконин, А.В. Запорожец, воображение ребёнка, по сравнению с воображением взрослого человека, беднее, однообразнее, содержит меньше творческих элементов. Психологи выделяют следующие виды воображения: воссоздающее (произвольное), которое возникает под влиянием словесных воздействий, и творческое (в процессе создания образов ребёнок пользуется как комбинированием ранее полученных представлений, так и преобразованием, которое осуществляется путём анализа и синтеза уже имеющихся представлений).

Процесс восприятия рассматривается как ведущий психический процесс, который выполняет интеграционную функцию: объединяет полученный опыт об окружающем мире в форме представления и образов и формирует целостную картину мира в соответствии с уровнем развития ребёнка. Значение восприятия в жизни очень велико, т.к. оно создаёт фундамент для развития мышления, способствует развитию речи, памяти, внимания, воображения.

Особое место в блоке «психические процессы», на наш взгляд, должно быть отведено:

- речи (поскольку в речевую форму облекаются не только результаты практической деятельности, но и её способы);

- вниманию, которое является основой любого психического процесса, влияет на успешность обучения; оно всегда включено в деятельность, является важнейшим условием её продуктивности и выступает в единстве с различными психическими процессами: познавательными, эмоциональными, волевыми;

- памяти (память как особый психический процесс не дана ребёнку в готовом виде. Память теснейшим образом связана с личностью, её внутренним миром, интересами, образом жизни, поэтому развитие памяти происходит вместе с развитием всего индивидуально-психологического облика ребёнка).

Таким образом, в практической части работы мы исследуем:

**Дети 5–6 лет.**

Как МП воздействует на развитие психических познавательных процессов детей дошкольного возраста (речь, внимание, память). Именно этот возраст является самым благоприятным периодом для развития психических познавательных процессов, поскольку в школьном возрасте ведущей деятельностью становится учебная, и сложнее формировать навыки внимания, наблюдательности, творческого восприятия мира.

**Дети 7–8 лет.**

Сформированность децентрации в логическом мышлении (т.е. умение рассматривать объект с различных позиций, точек зрения, умение включать этот объект в разные системы предметов).

**Дети 8–9 лет.**

1. Сформированность умений устанавливать причинно-следственные связи, умение моделировать собственное понимание и выражать собственное отношение к происходящему.

2. Сформированность художественно-творческих способностей детей (уровень развития процесса воображения).

3. Если у ребёнка сформированы выше перечисленные способности, то у него появляется интерес — форма проявления познавательной потребности, обеспечивающая направленность личности на осознание целей деятельности и тем самым спо-

собствующая ориентировке, ознакомлению с новыми фактами, более полному и глубокому отражению действительности.

Музейная педагогика своими методами и средствами способна усилить воздействие музея на любознательную юную душу.

Музейный педагог помогает ребёнку осознать многообразные связи, которые существуют между нами и нашими предками. Наши занятия должны помочь ребёнку в формировании представления о том, что процесс становления и развития окружающего мира сложен и длителен, но не менее сложен и интересен путь его познания. Ведь путешествие даже с обыкновенными утилитарными предметами сопряжено с большими открытиями: за каждым стоит история, огромный опыт, накопленный человечеством за время своего развития.

Чтобы определить роль МП в воспитательно-образовательном процессе дошкольных учреждений и начальных классов, мы провели небольшое эмпирическое исследование.

В нём участвовало 5 групп детей дошкольного возраста (всего 90 детей) из детских садов г. Полоцка, 4 класса детей младшего звена начальной школы (74 ученика) средних школ г. Полоцка, третий класс (22 человека) средней школы № 1 г. Полоцка и один четвертый класс (22 человека) средней школы № 1.

Основные методы исследования: наблюдение, опрос, беседа, анкетирование, тестирование, выполнение творческих заданий.

Главные цели эмпирического исследования:

- определить, способны ли дети разного возраста, с учетом их интеллектуального развития, распознавать скрытые смыслы в МП, в отдалённых явлениях, фактах культуры, выявлять главную цель экспозиции или комплекса;

- проследить, как совершенствуется у детей процесс восприятия МП и информации о нём, а соответственно, как развиваются основные познавательные процессы (память, внимание, мышление), умение выражать собственное отношение к происходящему.

Процесс эмпирического исследования мы проводили в два этапа.

На первом этапе мы наблюдали за детьми во время проведения МПЗ, беседовали с ними.

На втором этапе проводили индивидуальные беседы, опрос, анкетирование, тестирование, творческие задания в классах, в детских садах.

Исследование проводили по возрастным категориям: 5–6, 7–8, 8–9 лет.

На каждом возрастном этапе мы ставили свои задачи.

Эмпирическое исследование детей дошкольного возраста (5 групп, т.е. 90 человек).

Учитывая, что в формировании процесса мышления огромную роль играет образная память и сенсорное восприятие, полученные в раннем детстве, мы исследовали процесс запоминания информации, полученной на МПЗ.

Детям предлагались следующие вопросы:

- Назовите музеи, которые вы посетили.

- Что больше всего вам запомнилось в Софийском соборе, Музее ткачества, Художественной галерее, в Детском музее?

- Какие интересные герои встречали вас в музеях?

- Какие необычные музейные предметы вы запомнили, что вы о них можете нам рассказать?

С помощью последнего задания нам нужно было определить не столько способности каждого ребёнка описать форму, величину, цвет, свойства и назначение музейных предметов, сколько уловить способность детей к собственному суждению о предмете, определить, насколько музейный педагог способствовал формированию чувственного осязания, умению «видеть руками».

На эту задачу мы обратили особое внимание, так как главный методический принцип музейной педагогики совпадает с принципом ценностного освоения действительности: «Ценностям нельзя научиться, ценности необходимо пережить».

А поскольку дети практически на всех занятиях имели возможность самостоятельно действовать с предметами, заинтересованно воспринимали предлагаемую информацию, выражали положительные эмоции, мы можем утверждать, что у детей достаточно хорошо сформировано устойчивое

внимание, способность логически мыслить, отвечать на поставленные вопросы.

Наблюдения за этими же детьми на МПЗ позволяют нам сделать вывод о том, что музейные педагоги смогли общечеловеческие ценности включить во внутренний духовный мир каждого ребёнка. Поэтому 80 % из опрошенных детей вспомнили название всех музеев, перечислили и описали запомнившиеся музейные предметы, темы экспозиции того или иного музея, с восторгом называли героев, с которыми они встречались на занятиях («эхо», кукла, Карандаш, Муха-Цокотуха), а также продемонстрировали способность к собственным суждениям.

Процессы внимания и памяти дошкольников мы диагностировали, используя игру «Собери самовар». В группе каждому ребёнку был выдан конверт с разрезными картинками самоваров (использованы фотографии самоваров, представленных в экспозиции Детского музея) и отведено пять минут на выполнение задания. Педагогу требовалось отследить:

а) частоту обращений за помощью взрослого;

б) сопровождает ли рёбенок свои действия речью;

в) сформированность умений образно представить предмет;

Результаты:

- в трёх группах (60 %) дети правильно составили картинки и назвали детали самовара, а в двюх группах (что составило 40 %) требовалось конкретная помощь взрослого.

Т.е. у 60 % детей достаточно хорошо развита образная память, так как целое составлялось из деталей не путём механического подбора, а путём представления целостного предмета. Причём, мальчики работали более быстро, сосредоточеннее, дружнее, чем девочки, не отвлекаясь друг на друга, на воспоминания, какие предметы они видели не только на занятиях, но и в залах музеев (старые камни, монеты, оружие, ядра).

Выводы:

1. Дети 5–6 лет, работающие по МПП способны воспринимать научную информацию, события, отдаленные во времени.

2. Все дети, участвующие в опросе, смогли эмоционально рассказать о предложенном МП, его «характере», «настроении», о времени бытования предмета.

3. Дети умеют выражать адекватную эмоциональную реакцию, получают эстетическое наслаждение, открыты в общении с музейным педагогом. Они задавали вопросы, переспрашивали, выражали чувство восторга. Значит, МПЗ способствуют развитию речи и мыслительных навыков, ведь эти процессы развиваются и приобретаются лишь в общении со взрослыми.

Эмпирическое исследование детей 7–8 лет (74 человека).

У детей 7–8 лет предметное содержание мыслительной деятельности усложняется. Дети этого возраста последовательно овладевают следующими мыслительными операциями: «часть-целое», «предмет-предмет», «предмет-система предметов».

Но с чем мы сталкиваемся, когда к нам приходят учащиеся первых классов? У этих детей сформированы первичные навыки восприятия музейной экспозиции, дети способны воспринимать не только назначение предметов, но и их историческую значимость. В активном словаре 7–8-леток появляется уже больше прилагательных. Но есть учащиеся, а чаще классы, в которых дети страдают фрагментарностью восприятия, поверхностным мышлением, сниженным интересом, что затрудняет проведение МПЗ, сказывается на его результативности. И в этом случае можно назвать несколько причин.

1. Особенности индивидуального психического и физического развития детей.

2. Педагоги не желают, а иногда не имеют возможности систематически посещать МПЗ, что снижает уровень восприятия и интерес.

3. Недостаточно осуществляется преемственность среди научных сотрудников, работающих по МПП.

4. Во многих школах уже на протяжении семи лет (из наших наблюдений) идет отбор учеников и деление их на сильные и слабые классы. Наблюдения за детьми 7–8 лет на МПЗ мы осуществляли по определённой схеме, в соответствии с которой набор заданных параметров помог нам выделить группы с «высоким интеллектуальным потенциалом» (70 %) и группы с «низким интеллектуальным потенциалом» (30 %).

5. Не все родители активизируют образную, эмоциональную и двигательную память детей, в силу своей занятости они мало общаются с детьми.

Дети из групп с «высоким интеллектуальным потенциалом» характеризуются тем, что они эмоционально активно включались в тему занятия, проявляли и поддерживали интерес в процессе всего занятия, задавали вопросы, отвечали сами (особенно активны мальчики). Используя определённую терминологию, например: «городище», «древний», «копия», «реставратор» и др., демонстрировали первичные навыки сформированности пространственно-временных отношений. Напомню, что лишь к 13–14 годам у детей полностью формируются временные представления. Поэтому для музейных педагогов формирование понятийного аппарата — одна из наиболее сложных задач, которые он ставит перед собой.

В таких случаях очень важна роль школьного педагога, который является проводником в музейно-педагогической системе занятий. И то, как он акцентирует внимание детей в процессе занятия и подготовит их к посещению музея (а часто педагог заставляет детей вспомнить, сравнить, сопоставить, ассоциирует образы, впечатления, события), зависит степень включённости детей в занятие, а в дальнейшем — и общий уровень осведомлённости и интеллектуального развития. Поэтому, наверное, есть необходимость для воспитателей и педагогов выделять словом, жестом, эмоциональной интонацией нужную информацию о том или ином музейном предмете.

Группы со «слабым интеллектуальным потенциалом» характеризуются фрагментарностью восприятия, в результате чего эмоциональное восприятие в интерес не переходит. Дети часто отвлекаются, задумываются о посторонних вещах, не слышат, разговаривают, рассматривают другие объекты, задают вопросы не по теме. В такой группе педагогу приходится как можно чаще применять приёмы эмоциональной поддержки интереса, оживлять рассказ показом. В таком случае наши занятия больше выполняют функцию коррекционных занятий по формированию навыков слушания, переключения внимания.

На втором этапе работы исследовалась сформированность умений классифицировать и обобщать.

Детям были предложены бланки с заданиями на классификацию и обобщение. Использованы методики «Назови одним словом», «Назови предметы прошлого и настоящего».

Учащиеся из категории «высокий интеллектуальный потенциал» выполнили задание самостоятельно (что составило 90 %) при незначительной помощи взрослых. 60 % детей из категории «низкий интеллектуальный потенциал» справились самостоятельно, а 40 % детей не проявляли заинтересованность, некоторые отказывались выполнять задания, не понимали лексического значения отдельных слов.

Выводы:

- дети 7–8 лет воспринимают информацию, анализируют и сравнивают, классифицируют и элементарно обобщают;
- от занятия к занятию у ребят формируется потребность приходить в музей, узнавать что-то новое;
- дети ярко фиксируют образ МП;
- лишь к четвёртому классу, т.е. к 9–10 годам, дети способны самостоятельно описать предмет, понять его историческую значимость и ценность, выделить его как главный объект, ради которого они приходят в музей, эмоционально зафиксировать образ МП.

К таким выводам мы пришли в результате проведения эмпирических исследований с учащимися третьих и четвёртых классов образовательной школы № 1 г. Полоцка (43 человека). Используя адаптированные методики «Дополни фразу», «Аналогии», «Оценка особенностей речи», мы определяли состояние активного словаря учащихся, сформированность понятийного аппарата.

На бланках было предъявлено 100 слов. Ребёнку предлагалось отметить те, которые ему известны и которые он использует в своей речи. Смысл некоторых слов (по указанию экспериментатора) нужно было объяснить.

Ученики третьего класса:

- 80 % детей отмечали по 60 слов из 100, в том числе 20 слов с музейной направленностью, и смогли объяснить смысл указанных экспериментатором слов.

Ученики четвёртого класса:

- 90 % детей отмечали до 70 слов из 100, в том числе 17 слов с музейной направленностью. Пояснения эти учащиеся давали развёрнутые, демонстрируя сформированность целостных представлений о понятиях или предметах.

Особенности развития долгосрочной памяти мы исследовали с помощью методик «Дополни фразу», «Аналогии».

Через две недели после проведения занятий ученикам нужно было дополнить предложение нужным словом. (Например: слово «фотография» состоит из двух частей, которые обозначают — «пишу…»). 60 % учеников из 3-го и 4-го классов требовалась помощь взрослого. Возможно, это объясняется тем, что новые слова (в нашем случае — музейная терминология) не переходят в активный словарный запас, память детей перегружена информацией и впечатлениями, мало речевых упражнений используется как на МПЗ, так и в повседневной жизни.

То есть, на МПЗ необходимо очень внимательно относиться к тому, как формулирует вопрос или ответ ученик, отвести время на индивидуальную работу на закрепление терминов (повторить их вслух, записать, придумать кроссворд, индивидуальные задания).

Выполнение творческих заданий явилось последним этапом в нашем исследовании с детьми третьего и четвёртого классов. Класс делили по подгруппам, каждой из которых предлагали самостоятельно подготовить информацию о музейном предмете. Исследование проводилось на экспозиции Детского музея. Выполняя задания, дети вспоминали информацию, полученную на занятиях. Каковы же результаты?

1. В своих высказываниях дети использовали сложные синтаксические конструкции.

2. Дети владеют информацией о музейных предметах, проявляют интеллектуальную активность, высокий уровень зрительного восприятия.

3. Дети смогли творчески подойти к выполнению данного задания:

- использовали стихи;

- смогли распределить информацию по степени сложности и преподнести ее последовательно;

- грамотно пользовались документальными источниками, литературой.

Таким образом, исследования показали, что в процессе восприятия музейного предмета на МПЗ активизируются такие важные психические процессы, как внимание, память, вообра-

жение, мышление. К 9-и годам дети способны стать активными участниками МПЗ, т.е. они проявляют устойчивый интерес, концентрируют внимание на наиболее важной информации, моделируют собственное понимание события, способны творчески подойти к выполнению заданий.

Если говорить о детях дошкольного и младшего школьного возраста, то осознание музейного предмета как наиболее важного звена всей музейной деятельности приходит не сразу и не просто. И как нам кажется, медвежью услугу нам оказали так называемые «мини-музеи», которые есть в каждой школе и чуть ли не в каждой группе дошкольного учреждения.

Надо отдать должное учителям: в этих музеях можно увидеть предметы, достойные внимания музейщиков. Но у детей, которые учатся, играют, едят, спят в окружении предметов музейного значения на протяжении NN количества лет, формируется не совсем правильное восприятие среды, наполненной такими предметами, восприятие самих предметов и как следствие — неумение выделять музейный предмет в ряду других предметов, трудность в восприятии свойств музейного предмета.

Рекомендации:

- Необходимо осуществлять преемственность среди научных сотрудников, работающих по МПП, что позволит интегрировать занятии с учётом интеллектуального потенциала групп.

- Решать задачи по развитию речи, особенно дошкольников (формировать активный словарь ребёнка, обращать внимание на то, как ребёнок формирует вопрос, ответ и т.д.).

- На речемыслительную деятельность дошкольников надо обращать особое внимание, поскольку освоение речи в единстве произносительной и смысловой сторон перестраивает мыслительную деятельность. Ребёнок получает возможность познавать то, что нельзя воспринять с помощью органов чувств, учится управлять своим поведением, осознавать свою активность.

- Развивать способности детей ассоциировать, сравнивать, развить умения генерировать информацию, погружать ребёнка в пространство творчества и игры.

- Учить детей воспринимать музей как целое, но в то же время акцентировать внимание на музейном предмете как на источнике знаний, источнике эмоционального воздействия.

## Список литературы

**1.** Артемов, Е.Г. Музейно-педогогические технологии. — СПб., 2006. — 32 с.

**2.** Бесова, М.А. Познавательные игры младших школьников. — Мн.: УП ИВУ Минфина, 2005.

**3.** Гатанова, Н.В., Тунина, Е.Г. Тесты для подготовки ребёнка к школе детей 6–8 лет. — СПб.: Издательский дом «Нева». — М.: Олма-пресс, 2001.

**4.** Детская психология: учеб. пособие/ под ред. Я.П. Коломинского. — Мн., 1988.

**5.** Кон, И.С. Психология ранней юности. — М.: Просвещение, 1989.

**6.** Коссова, И.М. Музей. Образование. Культура. Процессы интеграции. — М., Бранден, 1999.

**7.** Краткий психологический словарь / Под общ. ред. А.В. Петровского. — М.: Политиздат, 1985.

**8.** Левыкина, К.Г., Хербста В. Музееведение: М.: Высш. школа, 1988.

**9.** Люблинская, А.А. Учителю о психологии младшего школьника. — М.: Просвещение, 1977.

**10.** Мелих-Пашаев, А.А. Психологические проблемы эстетического воспитания школьников // Вопросы психологии. — 1989. — № 1.

**11.** Общая психология: учебник для студентов пед. институтов / Под ред. проф А.В. Петровского — М.: Просвещение, 1977.

**12.** Сенько, Т.В. Успех и признание в группе. — Мн.: Народная асвета, 1991.

**13.** Столяров, Б.А. Музей в системе образования (к проблеме специфики музейно-педагогической деятельности в современном социо-культурном процессе). Международный музейно-педагогический семинар «Здравствуй, музей!». Тезисы. — СПб., 1995.

**14.** Столяров, Б.А. Бойко, А.Г. Художественный музей в образовательном процессе. — СПб., 1998.

**15.** Столяренко, Л.Д. Основы психологии. — Ростов на/Д.: Феникс, 1997.

# Полацкае Дваранскае павятовае вучылішча

***Воднева І.П.***

У 1776 годзе, пасля падзелу Рэчы Паспалітай, Полацк стаў цэнтрам губерні. Новы статус даваў гораду шмат прывілегій. Змены закранулі не толькі адміністрацыйны ўклад, але і сістэму адукацыі. У 1788 г. Камісіяй аб зацвярджэнні вучылішчаў прымаецца рашэнне аб адкрыцці на тэрыторыі Беларусі, якая ўвайшла ў склад Расійскай імперыі, двух галоўных вучылішчаў. У выніку, 15 красавіка 1789 г. у Полацку было адкрыта Полацкае галоўнае народнае вучылішча[1]. Гэта была ўсесаслоўная пачатковая навучальная ўстанова адкрытага тыпу,падпарадкаваная Міністэрству народнай асветы, пасля заканчэння якой хлопчыкі маглі паступаць у гімназіі. На жаль, звестак пра дзейнасць вучылішча захавалася даволі мала. Вядома, што ў 1789 г. тут навучалася 117 чалавек, праз 6 гадоў колькасць вучняў павялічылася да 235.

У 1796 г. Полацкае намесніцтва было скасавана, і Полацк стаў павятовым горадам. У выніку гэтага колькасць вучняў пачала рэзка змяншацца. Захаваліся звесткі, што ў 1803 г. адукацыю атрымлівалі толькі 22 хлопчыкі (8 вучняў у малодшым класе і 14 — у старэйшым). У сувязі з адукацыйнымі рэформамі дадзеная навучальная ўстанова некалькі разоў мяняла сваю назву. З 1804 г. яна стала называцца павятовым, а з 1828 г. — Полацкім дваранскім павятовым вучылішчам. Становішча палепшылася ў 30-я гг. XIX стагоддзя. У 1828 годзе ў вучылішчы быў адкрыты 4-ты клас. У 1842 г. класаў было ўжо 5 (магчыма, з 1836 г.). Захаваўся спіс вучняў за 1846–1847 гг. Паводле звестак з гэтага дакумента, сярэдні ўзрост вучняў 1-га класа складаў 9–13 гадоў, 2-га класа — 11–16, 3-га класа — 14–17, 4-га класа — 16–18, 5-га класа — 17–18 гадоў. Праўда, да канца навучання колькасць вучняў значна памяншалася. Калі ў 1-м класе навучаўся 51 чалавек, то ў 5-м — усяго 12. Агульная колькасць вучняў у 1849 годзе была 145 чалавек[2].

---

[1] Філатава А.М., Глазырын Я.У., Савіцкі Э.М. У складзе Расійскай імперыі // Памяць. Полацк. Мн.,2002. С. 228.

[2] Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей — НГАБ), ф. 2504, воп. 1, с. 294.

Полацкае дваранскае вучылішча ўтрымлівалася за кошт Дзяржаўнай казны і платы бацькоў. Але асобныя вучні — дзеці выкладчыкаў і са збяднелых дваранскіх сем'яў, згодна прадстаўленых пасведчанняў аб беднасці — вызваляліся ад аплаты, якая складала 1 руб. 43 кап. у год (дадзеныя на 1841 г.)[3].

Зразумела, каб размясціць дзяцей розных класаў адной установы разам, патрэбен будынак з дзесяткам пакояў. На карце горада Полацка 1796–1802 гг. народнае вучылішча размяшчалася на вуліцы Ніжне-Пакроўскай, у былым эканамічным доме Богаяўленскага манастыра. Пасля закрыцця Полацкай езуіцкай акадэміі і вучылішчаў пры ёй, на галоўнай плошчы павятовому вучылішчу разам з 1-класным прыхадскім вучылішчам належалі 3 мураваныя будынкі. Гэта пабудовы на карце Полацка 1830 года пад літарамі R, Q, J, якія значацца як дом і 2 флігелі. У пабудове пад літарай J размяшчаўся падрыхтоўчы ланкастарскі клас прыхадскога вучылішча, а таксама пакоі настаўніка і вартаўніка. Пабудова Q доўга нікім не была занятая. У 1830 г., калі прымаецца рашэнне аб адкрыцці ў Полацку кадэцкага корпуса, пабудовы Q і J, а ў 1831 г. і R, перадалі пад новую навучальную ўстанову, а вучылішча атрымала дамы O і O». Але дом O» хутка забралі для гарадскіх патрэб. Пабудова O (верагодна, пабудаваная ў 1813 г.) была адрамантавана ў 1833 годзе. Праўда, двухпавярховы мураваны будынак быў невялікім, у ім не хапала месца для заняткаў замежнымі мовамі, аб чым і паведамлялася папячыцелю Беларускай вучэбнай акругі Р.І. Карташэўскаму[4]. У 1837 г., згодна са звесткамі архіва, вучылішча размяшчалася ў доме яўрэя Гардэна[5], а ў 1842 г., пасля рамонту, мураваны двухпавярховы дом, дзе месцілася вучылішча, знаходзіцца ўжо на казённым забеспячэнні[6].

Ведаючы пра палітычныя матывы 1770-х гадоў на тэрыторыі Беларусі, Міністэрства народнай асветы кіравала народнай адукацыяй «имея главным намерением правительства упрочение в

---

[3] НГАБ, ф. 2507, воп. 1, с. 173.

[4] НГАБ, ф. 1297, воп. 7459, с. 1, л. 1.

[5] НГБА, ф. 2507, воп. 1, с. 87, л. 32.

[6] НГБА, ф. 2507, воп. 1, с. 191, л. 1.

крае русской народности»[7]. Паўстанне 1830–1831 гадоў толькі пацвердзіла думкі царскага ўрада наконт забароны польскай мовы. Галоўнымі навукамі становяцца руская мова і руская гісторыя. Акрамя гэтых прадметаў, у вучылішчы выкладаліся яшчэ матэматыка, геаграфія, некалькі замежных моў (французская, нямецкая, лацінская, польская — да 1837 г.), чыстапісанне і маляванне. Значнае месца адводзілася і Закону Божаму. Паколькі Полацк быў горадам шматканфесійным, тут выкладалі асновы праваслаўя, каталіцтва і уніяцтва. Але пасля скасавання уніі ў 1839 г. заняткі па асновах уніяцкай царквы спыніліся.

Выкладчыкамі Полацкага дваранскага вучылішча былі даволі адукаваныя людзі, большасць з якіх атрымалі вышэйшую адукацыю ва універсітэтах і акадэміях Вільні, Масквы, Санкт-Пецярбурга, Полацка. Так, у 1834 г. з 8 выкладчыкаў такіх было 6[8]. Яны валодалі адразу некалькімі еўрапейскімі мовамі. Праўда, паводле загаду Міністэрства народнай асветы, галоўнае, каб настаўнікі любых навучальных устаноў абавязкова валодалі рускай мовай. З 1832 г. болей за 10 гадоў штатным наглядчыкам вучылішча быў тытулярны саветнік Аляксандар Плота. Законанастаўнікамі працавалі протаіерэй Іаакім Капаевіч, ксёнз Уладзіслаў Ражычка, былы ігумен Полацкага францысканскага кляштара Варфаламей Кутоўскі. Некаторыя настаўнікі адначасова выкладалі ў іншых навучальных установах Полацка. Напрыклад, выкладчыкамі кадэцкага корпуса былі Карл Тэйхман (настаўнік французскай мовы), Іван Цюрын (настаўнік рускай мовы), Арсеній Скварцоў (настаўнік гісторыі, рускай і лацінскай моў)[9], былы выпуснік санкт-пецярбургскай Акадэміі мастацтваў Рудольф Я[с]уноўскі (настаўнік чыстапісання і малявання).

Вучылішча мела даволі багатую бібліятэку. На паліцах, яшчэ ў першыя гады існавання вучылішча, поруч з поўным зборам М. Ламаносава, захоўваліся працы яго паслядоўнікаў — Д. Анічкава, Я. Казельскага, М. Галавіна, С. Кацельнікава. Перадавая руская мастацкая літаратура і журналістыка былі шырока

---

[7] Ступакевіч М.А. Жаночая адукацыя ў Беларусі. (другая палова XIX ст. — 1917). Гродна, ГДУ, 2006. С. 18.

[8] НГАБ, ф. 2507, воп. 1, с. 42, л. 26 — 30 ад.

[9] НГАБ, ф. 2507, воп. 1, с. 87, л. 20 ад — 22.

прадстаўлены творамі М. Новікава, М. Карамзіна, Д. Фанвізіна. Тут жа можна было ўбачыць працы Вальтэра, Русо, Мантэск'е, Мальера, Лока. Захаваліся і літаратурныя творы настаўніка Івана Сакольскага. Некаторыя з яго од былі пастаўлены вучнямі ў школе. Калі ў 1834 г. яна налічвала 249 назваў ў 760 тамах[10], то ў 1837–1838 гг. стала 425 назваў у 1035 тамах. Праз 5 гадоў кніжны фонд павялічыўся да 1496 тамоў, большасць з якіх былі на рускай мове. Вучылішча мела бібліятэку і фізічны кабінет, дзе знаходзіліся падшыўкі перыядычных выданняў, геаграфічныя карты, глобус, астралябія, эстампы, карціны, методыкі.

Вучні дадзенай навучальнай установы атрымлівалі прафесійнае медыцынскае абслугоўванне. Вядома, што ў 1837 годзе ў вучылішчы пасаду ўрача займаў выпускнік Віленскай медыцынскай хірургічнай акадэміі 24-гадовы Іван Скіба.

Навучальны год працягваўся з 1 жніўня і да канца чэрвеня наступнага года. У дзяцей былі калядныя, велікодныя і летнія вакацыі, перад якімі яны здавалі іспыты. Захавалася «Гістарычная запіска Полацкага дваранскага вучылішча» за 1834 год, якая ўтрымлівае звесткі аб публічных іспытах па ўсіх прадметах і святочных мерапрыемствах з гэтай нагоды[11]. Так, 29 чэрвеня падчас публічнага акта прысутнічала да 200 чалавек, сярод якіх былі Полацкі і Віленскі епіскап Смарагд, рэктар уніяцкай семінарыі Шалепін, прадстаўнікі Полацкага кадэцкага корпуса, гарадскі галава, высокапастаўленыя чыноўнікі, бацькі вучняў. Дзеці чыталі прывітальную прадмову на рускай, лацінскай, французскай мовах, вершы на нямецкай мове. Затым «За примерное прилежание и благонравие» вучняў узнагароджвалі кнігамі і пахвальнымі лістамі. Потым дзеці зноў спявалі гімны, чыталі вершы на розных мовах, распавядалі пра гісторыю ўстановы за мінулы год. Вучні, якія закончылі 4-ы клас, атрымлівалі пасведчанне і маглі працягнуць далейшую адукацыю ў Віцебскай гімназіі.

Ведаючы пра рэформы адукацыі, можна меркаваць, што дадзеная ўстанова пасля 1872 года атрымала назву Полацкага гарадского вучылішча, а пасля 1912 — Полацкага вышэйшага пачатковага 6-класнага вучылішча.

---

[10] Пасэ. У. Братнія сувязі. // «Сцяг камунізма», 13.04.1961. С. 3.

[11] НГАБ, ф. 2507, воп. 1, с. 45, л. 14 — 16 ад.

# Інфармацыйны агляд
# па выніках наведвання культавых установаў Полацкага раёна

*Мельянцава Т.А.*

## Праваслаўныя храмы

Полацкая епархія з'яўляецца найбольш старажытнай на тэрыторыі Беларусі. У 2007 годзе яна адзначыла сваё 1015-годдзе. Тэрыторыя епархіі ахоплівае 10 раёнаў Віцебскай вобласці, у тым ліку і Полацкі. На сённяшні дзень да Полацкага благачыння аднесены 19 храмаў: гэта і ацалелыя каменныя і драўляныя цэрквы, і нанава пабудаваныя храмы, а таксама тыя, што знаходзяцца ў прыстасаваных будынках.

### Ацалелыя, адноўленыя храмы

Вёска **Шпакоўшчына. Храм Праабражэння Гасподня.**

Царква пабудавана ў другой палове XIX ст. У 1956 годзе яна была закрыта мясцовымі ўладамі, у будынку месціўся склад зерня. Праз вокны былі працягнуты транспарцёрныя стужкі. Адраджэнне храма пачалося ў 1985 годзе з прыходам айца Міхаіла (Міхаіл Васільевіч Карандзей, памёр у 1987 годзе, але за 2 гады змог узнавіць работу царквы).

На сённяшні дзень унутранае ўбранне храма захоўваецца ў тым жа выглядзе, што і 20 год таму. Цікавая яго адметнасць — ручнікі і ручнічкі на кожнай іконе, калі іконы змешчаны групамі, то пакрываюцца агульным ручніком.

На паўднёвай сцяне, справа ад алтара, абраз святога пакутніка Панцялеймана (прыблізна датаваны к. XIX — пач. XX стст.).

Іканастас, алтарныя карціны, люстра — усё зроблена родным братам айца Міхаіла — айцом Антоніем (Антонам Васільевічам Карандзеем, мастаком, святаром, асоба якога патрабуе асобнага даследавання, як майстра, што ўнёс свой адметны ўклад у развіццё культавага мастацтва ў праваслаўных храмах нашага рэгіёна).

Да Спаса-Праабражэнскай царквы ў Шпакоўшчыне прыпісаны храм у вёсцы **Мышчына. Царква ў гонар Іверскага абраза Маці Божай.**

Могільнікавая царква была пабудавана ў 1910 годзе на тэрыторыі маёнтка, які належаў беларускаму роду Корсакаў, і з'яўлялася пахавальняй гаспадароў сядзібы. Храм — помнік архітэктуры XX ст. і знаходзіцца пад аховай дзяржавы. У 1990 годзе быў праведзены яго частковы рамонт.

У вёсцы Калектыўная аднаўляецца храм **Свяціцеля Мікалая Цудатворцы.** Пабудаваны Нікольскі скіт быў у 1750 годзе на зямлі, якая належала Богаяўленскаму манастыру. Штогод да яго ладзіліся хрэсныя хады з асабліва шанаваным абразом Іверскай Маці Божай. На могілках, побач з царквой, пахаваны манахі Богаяўленскага манастыра, выкладчыкі кадэцкага корпуса (інфармацыя ад а. Іаана (Гаўрыльчыка).

**Новапабудаваныя храмы**

У 2004–2005 гадах у гарадскім пасёлку Баравуха-1 пабудаваны і асвечаны храм у гонар **вялікамучаніка Георгія Пераможцы.**

Унутранае ўбранне храма цалкам сучаснае. Алтар царквы драўляеы, аздоблены ажурнай скразной разьбой. Зроблены ён майстрам разьбы па дрэве з Глыбокага Уладзімірам Івановым (адукацыю атрымаў у Бабруйскім мастацкім вучылішчы). Іконы для царквы напісаны жанчынай (імя яе невядома, вядома толькі, што жыве яна побач са Пскова-Пячорскім манастыром і вывучала візантыйскі і рускі іканапісныя стылі і імкнулася з'яднаць іх).

Злева і справа ад алтара месцяцца харугвы з выявамі Прасвятой Багародзіцы Адзігітрыі і Спаса Нерукатворнага, якія былі перададзены прыходу са Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра.

У царкве захоўваецца абраз Прападобнага Сергія Раданежскага, выразаны ў камені (мармур), які быў знойдзены раніцай на падмурку храма і ягонае паходжанне невядома. (Інфармацыя ад старасты храма Тамары Васільеўны Каранковай).

**Храм святога прарока Іаана Прадцечы ў Наваполацку.**

Пабудаваны ў 1992 годзе. Унутранае ўбранне храма

сучаснае. Алтар гэтага храма таксама зроблены Антонам Васільевічам Карандзеем ва ўшанаванне памяці святара, ён быў перанесены ў новы храм, а спачатку знаходзіўся ў часовым храме.

Распяцце Ісуса Хрыста ўяўляе сабой скульптурную кампазіцыю, што даволі рэдка сустракаецца ў праваслаўных храмах. Яна выканана з пап’е-машэ мясцовым мастаком па задумцы айца Уладзіміра (Кавальчука).

Найболей шануемы абраз царквы — Маці Божая «Презренное смирение». Спісак зроблены з абраза, які захоўваецца ў Кіеве. Калі той быў прывезены ў Наваполацк, святары прыклалі яго да нованапісанага абраза, перадаўшы цудатворную сілу. Зараз гэты абраз асабліва шануецца мясцовымі прыхаджанамі.

**Храмы ў прыстасаваных будынках.**

Абраз Маці Божай «Презренное смирение» ёсць і ў **храме ў гонар абраза Маці Божай «Нечаянная радость»** у Наваполацку. Царква месціцца ў прыстасаваным грамадзянскім будынку, які быў перададзены вернікам у 1996 годзе. Святаром у ёй служыць айцец Аляксандр (Аляксандр Антонавіч Карандзей, сын Антона Васільевіча Карандзея).

Цікавасць для вывучэння могуць прадстаўляць абразы Маці Божая «Нечаянная радость», Маці Божая «Скоропомощница», «Погребение Господа нашего Иисуса Христа», напісаныя на дошцы алеем. Больш поўных звестак аб іх няма.

Цікавыя прыклады навейшага культавага мастацтва захоўваюцца ў гэтым храме ў алтары за іканастасам. Гэта абразы Маці Божай, прывезеныя з Віфліема і Іерусаліма. Напісаны абразы на тканіне.

**Храм святога пакутніка і лекара Панцялеймана** ў гарадскім пасёлку Баравуха-1 знаходзіцца ў былым Палацы культуры афіцэраў. Будынак перададзены вернікам у 1993 годзе. Існуе праект яго перабудовы, зараз у ім праводзяцца ўнутраныя аднаўленчыя работы.

Абразы для ўнутранага ўбрання царквы былі перададзены прыходу са Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра.

**Храм Расства Прасвятой Маці Божай у** вёсцы Варонічы.

У Варонічах будуецца новы храм на месцы зруйнаванага. А зараз царква месціцца ў будынку былой крамы, у ёй захоўваюцца

абразы Міколы Цудатворцы і Прасвятой Багародзіцы, перададзеныя Полацкай епархіі з Полацкай таможні.

## Каталіцкія храмы

**Касцёл іконы «Найсвяцейшага сэрца Езуса Хрыста»** ў Наваполацку. Будаўніцтва храма распачата было ў 1991 годзе. Усе работы праводзяцца пад непасрэдным кіраўніцтвам ксяндза Аляксандра (Чайкоўскага). Тут ствараецца культавае мастацтва, якое з'яўляецца адначасова і ультрасучасным, і ў той жа час не губляе сваёй сакральнай сутнасці. Унутранае аздабленне касцёла толькі распачата, зроблены рэльеф «Святая троіца», пад ім плануецца размясціць рэльеф «Тайная вячэра». Выконвае работы мастак Валяр'ян Іосіфавіч Янушкевіч (1962 г.н.), член Саюза мастакоў Беларусі, які выканаў серыю рэльефаў «Крыжовая дарога» ў касцёле Св. Роха ў Мінску, касцёле Св. Дамініка ў Ракаве, вышэйшай духоўнай семінарыі ў Гожуве (Польшча). А таксама з'яўляецца аўтарам многіх твораў у манументальнай і станковай скульптуры.

Ветрына. **Касцёл блаславёнага Юрыя Матулевіча.**

Месціцца ў рэканструяваным будынку крамы.

У 2002 годзе пры адкрыцці касцёла праваслаўнымі вернікамі сюды быў перададзены Абраз Маці Божай, напісаны алеем на палатне. Паходжанне яе невядома, пасярэдзіне палатна след ад кулі. Вернікі лічаць, што гэты абраз падобны на абраз Маці Божай Будслаўскай, а датуюць яго XVIII стагоддзем.

Цікавасць для вывучэння мае «Крыжовы шлях». 14 абразоў напісаны алеем на палатне, маюць сляды рэстаўрацыі, датаваны яны прыблізна XIX стагоддзем. Абразы маюць цікавую гісторыю: у 50-я гады з Мосара, дзе быў закрыты касцёл, «Крыжовы шлях» быў перададзены касцёлу ў Відзах, у 1989 годзе зноў вернуты ў Мосар. У 2006 годзе ксёндз Валянцін (Валянцін Францавіч Нарадоўскі) прывёз абразы ў Ветрына.

Па выніках праведзенага даследавання можна зрабіць наступныя высновы:

- на Полацкай зямлі суіснуюць абразы, напісаныя мясцовымі майстрамі, і абразы, прывезеныя з розных куткоў свету; менавіта яны ствараюць сучаснае культавае мастацтва Полацкага рэгіёна;

- культавае мастацтва нашага рэгіёна мае свае адметныя імёны, такія як айцец Міхаіл і айцец Антоній (браты Міхаіл Васільевіч і Антон Васільевіч Карандзей);

- у праваслаўных і каталіцкіх храмах Полацкага рэгіёна зберагаюцца духоўныя святыні беларускага народа, якія могуць быць даследаваны з пункту гледжання культурнай і мастацкай каштоўнасці;

- на цяперашні час існуе і працягвае сваё развіццё культавае мастацтва, адметнае і характэрнае менавіта для Полацкага рэгіёна, якое становіцца даволі блізкім да мастацтва свецкага, але ў той жа час не губляе сваёй сакральнай сутнасці.



**Мал. 1.** Храм Праабражэння Гасподня.
Вёска Шпакоўшчына.



**Мал. 2.** Храм у гонар Іверскага абраза Маці Божай.
Вёска Мышчына.



**Мал. 3.** Алтарныя вароты.
Храм у гонар велікамучаніка Георгія Пераможцы.
г.п. Баравуха-1.



**Мал. 4.** Абраз Маці Божай «Презренное смирение». Храм у гонар абраза Маці Божай «Нечаянная радость».
г. Наваполацк.



**Мал. 5.** Абраз Маці Божай.
Касцёл блаславёнага Юрыя Матулевіча.
г.п. Ветрына.



**Мал. 6.** Рэльеф «Святая троіца». Аўтар Валерый Янушкевіч.
Касцёл іконы Найсвяцейшага сэрца Езуса Хрыста. г. Наваполацк.

# Историческая застройка квартала, ограниченного улицами Ленина, Нижне-Покровская, Свердлова

*Орлова Т.А.*

В 2008 г. в г. Полоцке были начаты работы на объекте «Офисное здание по ул. Ленина в районе жилого дома № 26», заказчиком которого выступает ИП «Миралекс». На участке, отведённом под строительство, во время обустройства котлована были выявлены фундаменты и фрагменты стен кирпичного дома. Археологический надзор за земляными работами осуществлял Д.В. Дук (Полоцкий государственный университет). По информации, содержащейся в отчёте Д.В. Дука, обнаруженные фрагменты конструкций датируются XIX в., основные размеры кирпича, из которого были сложены стены — 30x14x6,5 см, 29,2x14,5x7 см, 25x12,5x6,2 см, кирпич датируется к. XVIII — н. XIX вв. В ходе земляных работ были открыты три наружные стены — северная и южная на длину 9 м, западная на длину 12 м — и три внутренние стены, служившие перегородками. В плоскости северной стены были зафиксированы три ниши с полуциркульными завершениями. На западной стене были открыты две ниши, на одной из которых сохранились следы арочного перекрытия цокольной части здания. В южной стене, кроме ниш, находился дверной проём. Главный фасад здания располагался по линии застройки улицы.

Ввиду того, что археологические исследования ограничивались только территорией строительной площадки, а обнаруженные фундаменты уходили дальше за её пределы в сторону существующего дома № 26, у нас появился интерес в плане поиска какой-либо информации, касающейся обнаруженного археологического объекта, и изучения развития застройки всего квартала в целом, в границах которого ведётся строительство.

На основании имеющихся в фондах заповедника копий планов и картографических материалов была составлена схема очертаний исторических кварталов, располагавшихся на территории современного квартала, ограниченного с юга

Ад першапачатковай паўднёвай сцяны XVIII ст. на другім паверсе над памяшканнмі № 6–10 і калідорам захаваліся невялікія фрагменты на ўсю вышыню. Так, напрыклад, над памяшканнем № 6 прасочаны дзвярны праём з паўцыркульнай аркай, які быуперароблены ў дымаходы. Вялікі фрагмент першапачатковай сцяны XVIII ст. ацалеў над памяшканнямі № 8 і 7. Яна таксама мела высокія нішы з паўцыркульнай аркай, закладзеныя маламернай цэглай. Швы закладак былі з двухбаковай нарэзкай. Таксама там знойдзены і рэшткі счасанай першапачатковай папярочнай цаглянай перагародкі. Былі заўважаны і прамавугольныя нішы, падобныя на аконныя ці дзвярныя праёмы, але іх прыкмет на сцяне з боку калідора не выяўлена. Першапачаткова яны былі адной вышыні з вышэйпрыгаданымі нішамі, але крыху пазней, магчыма, яшчэ падчас будаўніцтва, некаторыя з іх былі павялічаны. Можна меркаваць, што ў перспектыве будаўнікі планавалі прабіць тут дзвярны праём. Пакоі першапачаткова маглі мець дзверы ў перагародках, якія былі таўшчынёй у цагліну, і амфіладную планіроўку.

Наступны фрагмент паўднёвай сцяны XVIII ст. даследаваны над памяшканнем № 10; гэты кавалак сцяны мае шматлікія пераробкі XIX–XX ст. Былі выяўлены рэшткі счасанай папярочнай тарцовай сцяны ў паўтары цагліны на мяжы памяшканняў № 9 і 10. Спачатку ён меў дымаходы і дзвярны праём з лучковай аркай шырынёй каля 1,0–1,2 м. Потым накірункі дымаходаў неаднаразова мяняліся **(Мал. 3)**.

Сцяна паміж памяшканнямі № 10–11 сабрана ў XX ст. з цэлай і бітай featureрознафарматнай цэглы і вельмі неахайная, таўшчынёй яна каля 1 ½ цагліны, перавязкі з астатнімі сценамі не мае.

Паўднёвая і ўсходняя сцены з'яўляюцца першапачатковымі. Ва ўсходняй сцяне XVIII ст. у XX ст. былі прабіты дзверы. На ёй прасочаны счасаны выступ, на месцы якога прымыкае паўночная сцяна. Паўднёва-ўсходні кут таксама мае вертыкальны разрыў. Назіранні паказалі, што ён утварыўся падчас выбухаў 1964–1967 гг., калі муроўка звязаных сцен трэснула. Яшчэ адна дыяганальная скразная трэшчына знаходзіцца на паўднёвай сцяне. Даследаванні гэтай сцяны слядоў першапачатковых папярочных перегародак на ёй не выявілі. Існуючыя зараз вокны з прамычкамі ў палову цагліны больш позняга паходжання. Іх размяшчэнне ўзгоднена з вокнамі паўночнай сцяны другога паверха, але з вокнамі і малюнкам паўднёвага фасада першага паверха іх размяшчэнне не ўзгоднена. Першапачатковая сцяна ў XVIII ст. мела двое вокнаў і нішу з боку памяшкання. Яны былі з перамычкамі ў цагліну. Перамычкі першапачатковых вокнаў з боку памяшкання былі лучковымі. Размяшчэнне праёмаў XVIII ст. узгоднена з вокнамі першага паверха.

## Засыпка скляпенняў над першым паверхам

Даследаванні засыпкі скляпення над памяшканнем № 1 дазволілі знайсці рэшткі каларыфераў. Шурфамі былі выяўлены паўночная частка і паўднёва-заходні кут ацяпляльных каналаў **(Мал. 1, 5)**. Яны праходзілі па перыметры ўздоўж паўночнай, заходняй і паўднёвай сцен над памяшканнямі № 1 і 2. Над памяшканнем № 3, дзе падлога была заліта, даследаванні не вяліся. Для іх уладкавання паверх засыпкі пазух скляпенняў першага паверха была зроблена заліўка вапнавай рошчынай. Яна знаходзілася на глыбіні каля 0,25 м ад сучаснай падлогі. Каля паўночнай сцяны быў выступ, які ўяўляў сабой рэшткі муроўкі з нагарам на бакавой паверхні. Шырыня яго каля 0,25 м. Гэта як бы адна з вонкавых сценак каларыфера. Другая вонкавая сценка, бліжэй да цэнтра памяшкання, была выканана ў палову цагліны-пальчаткі на гліне. Ад перагародак паміж каларыферамі захаваліся гліняныя валікі вышынёй каля 5 см. У сячэнні яны

былі трапецыяпадобнымі, бакавыя адхоны — ўвагнутымі, а верхняя пляцоўка — гарызантальнай, шырынёй каля 6,5–7,5 см (гэта адпавядала таўшчыні цагліны-пальчаткі, пастаўленай на рабро). На ёй знойдзены фрагмент вертыкальнага шва ад пастаўленай некалі на край цэглы. У запаўненні каналаў і абмазцы іх дна знойдзены рэшткі дахоўкі з нагарам, якая некалі пакрывала перагародкі каналаў. Гладкая паверхня пласцін дахоўкі паляпшала цягу і павялічвала трываласць калярыфераў. Паўночна-заходні кут калярыфераў знішчаны пры будаўніцтве печаў у XIX ст. Паўднёва-заходні кут захаваў паварот каналаў. У месцы паваротаў перагародкі былі скошаны пад кутом 45°. Тры каналы каля паўночнай сцяны будынка мелі шырокі разрыў і невялікі цагляны выступ. Можна меркаваць, што тут быў продух у выглядзе люка з жалезнай накрыўкай для выпуску гарачага паветра ў памяшканне пасля закачэння палення печы. Каля заходняй сцяны каналаў было два. Шырыня каналаў (паміж цаглінамі) была 13, 23, 25 і 26 см, што дазваляла перакрыць іх падлогавымі пліткамі і цэглай-пальчаткай. Кавалак тэракотавай пліткі, выяўленай каля паўночнай сцяны памяшкання № 1, меў шырыню каля 20 см, а даўжыня перавышала 25 см. У тым жа памяшканні знойдзены кавалак пліткі з белай эмаллю **(Мал. 6)**. Плітка больш тонкая у параўнанні з тэракотавымі; гэта дазваляе меркаваць, што «цёплая падлога» была двухслойнай. Ніжні, чарнавы слой быў з тэракотавых плітак. Ён перакрываў ацяплальныя каналы. Верхні — з больш тонкіх плітак, пакрытых белай эмаллю. Цэнтральная частка падлогі памяшкання была драўлянай. Топка для «цёплай падлогі» над памяшканнямі № 1–4 знаходзілася ў печы першага паверха ў памяшканні № 4.

Магчыма, што ацяпляльныя каналы мелі ўсе памяшканні другога паверха. Частка іх была знішчана пры зносе скляпенняў над памяшканнямі № 4–6 у пачатку XX ст. [**4**, с. 19]. Астатнія знесены ў 2003 г. падчас расчысткі скляпенняў над памяшканнямі № 7–10 **(Мал. 7)**. Так, напрыклад, былі сустрэты рэшткі каналаў з перагародкамі ў палову цагліны над паўднёвай часткай скляпення памяшкання № 10, але ў той час іх даследаваць і зафіксаваць не ўдалося. Там жа была знойдзена цагляная муроўка на паўднёвай частцы скляпення, якое мае

шмат пераробак **(Мал. 7)**. Сцяна памяшкання мела адтуліну на ўзроўні гэтай муроўкі, рэшткі папярочных перагародак у палову цагліны і сляды нагару. Засыпка са скляпенняў у 2003 г. была скінута ў двары. Яе даследаванне дазволіла знайсці шмат пячной абмазкі і кафлі XVI–XVIII стст. [**1** с. 58, **мал 12**: 2]. Найбольш ранняя кафля аздоблена арнаментам з матывамі «каванага металу» [**3**, с. 103], геральдычным і антрапаморфным арнаментам. Шмат з іх пашкоджана агнём. Пераважная большасць кафлі зялёнапаліваная, але ёсць і пакрытая белым ангобам. Сабраны і кавалкі карніза з белай эмаллю сярэдзіны XVIII ст. **(Мал. 6)** Таксама сустракаецца шмат абпаленай пячной гліны з адбіткамі румпаў кафлі. Знайсці і вывучыць падмуркі печаў XVIII ст. не ўдалося.

Добра захаваліся каналы над памяшканнямі № 11–13. Іх сячэнне каля 0,21х0,2–0,23 м. У скляпенні памяшкання № 13 з першага паверха быў прабіты шырокі калодзеж каля 0,5 х 0,65 м, складзены на гліне з пальчаткі 32х15–15,5х6,5–7 см (часам яна не мела барознаў) [**6**, с. 101; 2, с. 95]; яго сценкі мелі моцны нагар. Пры гэтым было часткова пашкоджана восевае рабро жорсткасці. Сценкі калодзежа складзены з цэглы на гліне, ёй жа ўмацаваны зломы скляпення. З усходняга боку пачыналіся два каналы ўздоўж паўночнай сцяны. Да заходняй сценкі таксама прымыкаў канал (?) сячэннем 0,25х0,25 м. Узровень яго падлогі на рад цэглы ніжэй, чым у каналаў ва ўсходняй сцяне. З калодзежам ён звязаны праз акенца 0,25х0,2 м. Побач з гэтай канструкцыяй быў яшчэ адзін калодзеж, верагодна, дымаход з першага паверха, які знаходзіўся за межамі сцяны і выходзіў у дымаходы ў лапатцы паўночнай сцяны. Цэгла, з якой складзены знойдзеныя збудаванні, часам не мае барознаў, яе памеры — 32х15,5х7 см. Шырыня каналаў каля 0,22–0,23 м, цэнтральная і паўднёвая знешняя сценка ў палову цагліны, складзена на гліне. З боку цэнтра памяшкання яна ўмацавана валікам з гліны. Другая вонкавая сценка канала — выступ сцяны памяшкання шырынёй ад паловы да адной цагліны. Ён захаваўся на вышыню да 0,2 м ад узроўню бетона, з боку паўночнай сцяны ён меў абкладку з цэглы, пастаўленай на рабро **(Мал. 8)**. З улікам таго, што ўзровень радоў муровак не супадае, можна меркаваць, што існаваў яшчэ адзін рад цаглін, пастаўлены

на рабро, толькі тады ўзровень усіх перагародак быў аднолькавым. Такім чынам, дасягалася неабходная вышыня сценак канала — каля 0,3–0,4 м. Каля калодзежа пад іх была зроблена адмостка цэглай-пальчаткай на вапнавай рошчыне. У склад яе ўваходзілі кавалкі падлогавых плітак 29–30х22–23х6 см. Потым яна была прадстаўлена вапнавай рошчынай з дадаткамі кавалкаў хвалістай дахоўкі. Рэшткі каналаў знойдзены таксама каля ўсходняй і паўднёвай сценкі памяшканняў № 11–13. Іх дно мае нязначны ўхіл у бок калодзежа, каб палепшыць цягу. Калі ля калодзежа яно было на глыбіні 0,35 м ад узроўню паверхні бетона (маецца на ўвазе бетон, якім была заліта падлога да 2006 г.; зараз узровень падлогі на 20 см вышэй ад узроўню старога бетона), то каля паўднёвай сцяны яна дасягае глыбіні каля 0,1–0,15 м. Вуглы паваротаў каналаў знішчаны. Паўночны — пры пракладцы трубы пачатку XX ст., паўднёвы — пры ўладкаванні лесвіцы ў канцы першай трэці XIX ст. З таго часу на ўсходняй сцяне захавалася пабеленая тынкоўка **(Мал. 9)**. Можна меркаваць, што каналы паварочвалі пад прамым вуглом. Зверху каналы перакрываліся цэглападобнымі пліткамі, якія прыгаданы вышэй. Яны маглі быць меншага фармату; галоўнае іх адрозненне ад цэглы-пальчаткі — гэта суадносіны бакоў як 2:3 ці 1:1 і крыху меншая таўшчыня. Такія ж пліткі перакрывалі і каларыферы пад падлогамі. Топка для «цёплай падлогі» над памяшканнямі № 10–13 знаходзілася ў печы першага паверха ў памяшканні № 13 і завяршалася жаравым калодзежам і люкам з металічнай накрыўкай. Такім чынам, у абодвух выпадках дасягалася неабходная моцная цяга ў каналах, бо аптымальныя для гэтага суадносіны даўжыні каналаў і вышыні трубы ад поду печы — 3:4 ці 3:5. Ад узроўню сцен першага паверха вышыня вертыкальнага дымахода дасягала 8–10 м. Гэтыя «цёплыя падлогі» сталі своеасаблівымі прататыпамі сучасных ацяплальных печак парнікоў і цяпліц, якія канструктыўна вельмі падобны да іх [**5**, с. 157].

Расчышчаны таксама рэшткі канала шырынёй каля 0,25 м ля паўночнай сцяны і над памяшканнямі № 11 і 12. Ён перакрываў дымаходы, якія вялі з першага паверха і былі пракладзены непасрэдна па скляпеннях. Канал выяўлены на працягу каля 2,0 м. Дзе пачынаўся канал, высветліць не ўдалося.

Дымаходы з першага паверха праходзілі ў цагляным выступе паўночнай сцяны. У канструкцыі гэтых дымаходаў была ўжыта падлогавая плітка.

Назіранні за папярочнымі перагародкамі паміж памяшканнямі № 11–13 першага паверха паказалі, што на другім паверсе яны не мелі слядоў разбурэння. Іх верх быў роўны і замазаны слоем вапны. Каналы ацяплення перакрывалі іх.

Цікавыя вынікі далі даследаванні засыпкі скляпенняў памяшканняў № 11–13 і на месцы разбураных каналаў. Яна (асабліва ў паўночнай частцы памяшканняў) утрымлівала шмат хвалістай дахоўкі [**1**, С. 95] з нагарам, кавалкі абгарэлага дрэва. Таксама сустракаюцца і кавалкі кафлі сярэдзіны — канца XVIII ст. з медальёнамі ў вянку і са змешчанай рамкай і гладкія зялёныя пласціны эмаллю [**2**, с. 87]. Там жа знойдзены адзінкавыя кавалкі шклянога і керамічнага посуду і нават скуранога абутку. Такім чынам, часам пабудовы гэтай «цёплай падлогі» з’яўляецца апошняя чвэрць XVIII ст. Знаходкі кавалкаў абгарэлай дахоўкі і драўніны, як і цэгла другаснага выкарыстання ў адрэзках паўночнай сцяны над памяшканнямі № 1–4 і 10–13 сведчаць, што, верагодна, у апошняй чвэрці XVIII ст. верх будынка моцна пацярпеў ад пажару. Пасля гэтага ён зазнаў першую значную перабудову.

Зыходзячы з пад’ёмнага матэрыялу, сярод якога найбольш позні датаваны канцом XVIII ст., можна меркаваць, што гэтай перабудовай кіраваў вядомы архітэктар-езуіт Габрыэль Грубэр [**7**, с. 212]. На той час, у 1784 г., ён прыехаў з Аўстрыі ў Полацк — апошні прытулак магутнага ордэна, — дзе зноў прыняў сан і абеты. З 1786 г. ён стаў прафесарам матэматыкі, механікі і архітэктуры, у 1800 г. ён пакідае Полацк [**7**, с. 212]. Магчыма, пры яго ўдзеле былі перакладзены паўночныя сцены над памяшканнямі № 1–4 і 10–13, перабудаваны і пашыраны другі паверх (узведзена яго цэнтральная частка над памяшканнямі № 6–9) і збудаваны «цёплыя падлогі» розных канструкцый. Яшчэ адным сведчаннем больш позняга паходжання «цёплых палогаў» з‘яўляецца тое, што яны перакрывалі рэшткі прастакунага праёма, зробленага ў скляпенні памяшкання № 12 падчас яго будаўніцтва. Першапачаткова гэта памяшканне выкарыстоўвалася як сені паміж памяшканнямі № 11 і 13 перша-

га паверха, і, магчыма, да перабудовы другога паверха ў апошняй чвэрці XVIII ст. тут была драўляная лесвіца на другі паверх.

Калідор другога паверха таксама больш позняга паходжання. Першапачаткова існавалі толькі дзве лесвічныя пляцоўкі на скляпеннях калідора першага паверха ва ўсходняй і заходняй частцы будынка. Ацалелі толькі фрагменты першапачатковай паўднёвай і паўночнай сцяны. У раёне памяшкання № 10 з боку калідора сцяна была пашкоджана пераробкамі XIX–XX стст. Акрамя прыгаданага вышэй дзвярнога праёма, удалося зафіксаваць рэшткі акенца з лучковай аркай каля 0,6х0,6 м. Падобнае акенца, толькі лепшай захаванасці, зафіксавана ў фрагменце над памяшканнем № 16. Там праходзілі дымаходы з былой пякарні. Такім чынам, гэтыя акенцы маглі прызначацца для прачысткі, каб пазбягаць выхаду на стромкі дах будынка. Ацалелыя рэшткі першапачатковай паўднёвай сцяны існуючага зараз калідора паказалі адсутнаць рэшткаў скляпенняў і праёмаў. Зыходзячы з плана 1828 г. можна меркаваць, што першапачаткова замест калідора другога паверха тут былі два пакоі ў заходняй і ўсходняй частцы будынка. Да іх вялі лесвіцы з першага паверха, і з гэтых памяшканняў можна было трапіць у памяшканні № 1–4 і 10–13. Памяшканні № 5–9 маглі мець амфіладную планіроўку і былі звязаны з лесвіцамі праз дзвярныя праёмы, якія знаходзіліся над памяшканнямі № 6 і 9. Больш дакладна першапачатковую планіроўку другога паверха высветліць немагчыма. У канцы XIX — пачатку XX стст. скляпенне калідора першага паверха было знесена і заменена бетоннай столлю. Пры гэтай перабудове і быў зроблены існуючы зараз калідор. У калідоры другога паверха была ўсталявана бетонная лесвіца для ўваходу ў гімнастычную залу з невялічкай пляцоўкай, выкладзенай каляровымі штампаванымі пліткамі. Прыкладна з таго ж часу з'явіліся печы, абкладзеныя гладкай белаэмалевай кафляй і бляхай.

Паэтапная перабудова і рэканструкцыя другога паверха на працягу сярэдзіны XVIII — пачатку XX стст. прыводзіла і да змен у форме і канструкцыі даху. Першапачаткова дах быў мансардыным, і, магчыма, меў ламаную форму. Дамінуючай была цэнтральная частка будынка. Менавіта там маглі знаходзіцца разабраныя ў 1831 г. цагляныя аркі. На той час яны, магчыма,

захоўваліся над паўднёвай часткай першага паверха будынка і на месцы калідора. Астатняя частка даху мела драўляныя канструкцыі. Пры гэтым вільчакі даху над памяшканнямі № 1–3 і 11–13, верагодна, былі ссунуты да паўднёвай сцяны прыкладна на 2/3 альбо 3/4 шырыні памяшканняў. Гэтыя памяшканні таксама былі мансарднымі. Праз іх праходзілі дымаходы і трубы першага паверха. Яны знаходзіліся на паўночнай сцяне над руставанымі пілястрамі. Гэтыя часткі даху былі больш нізкімі. Пазней у выніку пажару і некалькіх перабудоў дах страчвае ламаную форму, бо мансарда (яе паўночная частка) паступова перабудоўваецца ў другі паверх. Цэнтральная частка будынка захоўвала сваё дамінуючае становішча, у яе вышэйшых кропках узводзяцца больш высокія трубы для «цёплай падлогі». Над вільчаком даху іх вышыня магла дасягаць да 3,0–4,0 м. Магчыма, у той жа час форма даху набывае арыгінальныя рысы, зафіксаваныя на плане Полацка 1828 г. [**1** с. 17, рис. 6] Гэта адзіны план, які вельмі падрабязна і дакладна фіксуе размяшчэнне і форму дахаў будынкаў калегіума. На плане 1828 г. дах корпуса «В» мае два вільчакі і дзве самастойныя часткі. Паўночная, двухсхільная, цалкам перакрывае прастору над памяшканнямі № 1–13. Паўднёвая цэнтральная частка будынка мае чатырохсхільны дах, яго вільчак знаходзіўся прыкладна над паўднёвай сцяной існуючага зараз калідора другога паверха. У выніку дах атрымаў увагнутую форму ў цэнтры. Толькі пасля 1831 г. ён набыў сучасныя абрысы.

Такім чынам, на падставе выяўленых матэрыялаў па другому паверху корпуса «В» можна зрабіць наступныя высновы:

1. Другі паверх корпуса «В» часткова пачынае будавацца ў сярэдзіне XVIII ст. адначасова з карпусамі «А», «Б», «Г».

2. Паўночныя сцены памяшканняў № 1–4 і 10–13, верагодна, першапачаткова не планаваліся і былі ўзведзены пазней, праз некаторы час яны, магчыма, былі разабраны і перакладзены; сярэдняя частка спачатку ўвогуле не мела памяшканняў.

3. Другі паверх будынка на той час мог мець спачатку гаспадарчае прызначэнне і не ацяпляўся; пры гэтым ён выконваў ролю своеасаблівай мансарды звернутай двума фасадамі ва ўнутраны дворык калегіума, які на той час не

быў падзелены на дзве паловы корпусам «Б». Гэтыя мансарды былі над памяшканнямі № 1–4 і 10–13 і прадстаўлялі сабой вялікія залы. Праз сені і вінтавую драўляную лествіцу ў скляпенні ўсходняя зала была злучана з памяшканнямі № 11 і 13 першага паверха. Форма даху у цэнтральнай частцы, верагодна, была ламанай і чатырохсхільнай. Нязначная таўшчыня сцен зальных памяшканняў другога паверха над памяшканнямі № 1–4 і 10–13 першага паверха сведчыць, што пераважная большасць канструкцый паддашша была драўляная. Прыгаданыя аркі, разабраныя ў 1831 г., маглі знаходзіцца на цэнтральнай частцы паддашша, дзе сцены паверха былі больш тоўстыя.

4. Першая рэканструкцыя, магчыма, адбылася пасля пажару, які здарыўся ў апошняй трэці XVIII ст. і прыкметы якога прадстаўлены кавалкамі вугалю і абгарэлай дахоўкі ў засыпцы скляпення над памяшканнем № 13. З гэтага часу ў памяшканнях уладкоўваецца «цёплая падлога» (намі выяўлены дымавыя каналы, якія награваліся праз печы першага паверха), насцілаецца драўляная і пліткавая падлога. Для паляпшэння цягі ў каналах «цёплай падлогі» над памяшканнямі № 4 і 10, дзе была максімальная вышыня даху, узводзяцца новыя, больш высокія трубы і перарабляюцца існуючыя дымаходы першага паверха. Гэтыя трубы знаходзіліся на мяжы памяшканняў № 4 і 5 і № 9 і 10. Вышыня падобнай трубы ад узроўню сцен першага паверха была каля 12–13 м. Пасля гэтага форма даху робіцца трохкутнай, ламаная лінія адсутнічае. Магчыма, што рамонтам і перабудовай корпуса «В» кіраваў вядомы архітэктар-езуіт Габрыель Грубэр.

5. Верагодна, крыху пазней альбо адразу пасля пажару ў апошнюю чвэрць XVIII ст. узводзіцца паўночная і паўднёвая сцяна над памяшканнямі № 5–9. Гэтыя памяшканні адразу плануюцца ў якасці жылых ці вучэбных. Памяшканні маюць нішы і капітальныя перагародкі ў адну цагліну. Магчыма, яны таксама мелі «цёплую падлогу». Спачатку пакоі, верагодна, мелі амфіладную планіроўку, але ў перспектыве іх злучылі калідорам, і для гэтага яшчэ на пачатку будаўніцтва для дзвярных праёмаў былі прадугледжаны прастакутныя нішы ў паўднёвай сцяне.

6. Зыходзячы з рэшткаў аздаблення (рэшткі эмалевых плітак падлогі, гатычная арка ўваходу з боку трохпавярховага будынка), зала над памяшканнямі № 1–4 мела ў канцы XVIII — другім дзесяцігоддзі XIX стст. найбольш прэзентабельны выгляд і магла з'яўляцца невялічкай музычнай капэлай. Зала над памяшканнямі № 10–13 магла выкарыстоўвацца для рэпетыцый і была больш сціплай. Залы мелі пабеленыя атынкаваныя сцены і, магчыма, пафарбаваныя драўляныя столі. У капэле было трое прастакутных высокіх вакнаў, у зале для рэпетыцый — два больш шырокіх, блізкіх да квадратаў вокнаў і ніша паміж імі. Цэнтральная частка падлогаў была драўлянай, каля сцен — пліткавай. У капэле пліткі былі эмаліраваныя і маглі ўтвараць нескладаны двухколеравы арнамент. У зале для рэпетыцый яны былі простыя тэракотавыя.

7. У XIX ст. на паверсе адбыліся значныя пераробкі. Да 1828 г. (магчыма, пры піярах) перастаюць працаваць «цёплыя падлогі», іх каналы часткова знішчаюцца пры ўзвядзенні новых лесвіц з памяшканняў першага паверха № 3 і 13. Пасля гэтага пачынаюць узводзіцца печы і ўносяцца змены ў планіроўку.

8. Падчас рамонту 1831–1833 гг. цалкам знішчаюцца першапачатковыя падлогі, столі і дах. Капэла цалкам перарабляецца, узводзіцца перагародка і разам з нішамі закладваецца гатычная арка. На працягу XIX — пач. XX стст. пастаянна перарабляецца калідор і паўднёвая сцяна над памяшканнямі № 5–10, прабіваюцца новыя дымаходы і дзвярныя праёмы, зносяцца значныя яе часткі, закладваюцца нішы. Узводзяцца новыя перагародкі і печы. Такім чынам, паверх поўнасцю страціў першапачатковую планіроўку.

9. У пачатку XX ст. пры будаўніцтве кацельні зносіцца амаль уся паўднёвая сцяна калідора. Тады ж, магчыма, падлогі пачынаюць залівааць бетонам і аздабляць каляровай пліткай. На фасадах былі прабіты новыя вокны з перамычкамі ў палову цагліны на паўночнай сцяне над памяшканнямі № 1–4, 6, 11–13. Таксама быў знесены паўднёвы фасад усходняй залы — замураваны першапачатковыя вокны і счасаны іх ліштвы.

## Спіс літаратуры

**1.** Глинник, В.В. Лицензия № П-920/1 Благоустройство территории комплекса иезуитского коллегиума в г. Полоцке. Комплексные научные изыскания. — Мн., 2004 г.

**2.** Дук, Д.У. Полацк XVI–XVIII стагоддзяў: нарысы тапаграфіі, гісторыі, матэрыяльнай культуры і арганізацыі жыццёвай прасторы насельніцтва беларускага горада / Д.У. Дук., — Наваполацк: ПДУ, 2007. — 268 с.: іл.

**3.** Здановіч, Н.І. Полацкая кафля XVI–XVII стст. // Гістарычна — археалагічны зборнік. — 2001. — № 12. — С. 103–125.

**4.** Кукуня, О., Соболь, В. Объект: историко-культурная ценность иезуитского коллегиума в г. Полоцке (Корп. «Б» и «В»).: Историко-архивные и библиографические исследования. — Мн., 2001. — С. 1.

**5.** Литавар, В.В., Койданов Г.Л. Как построить печь, камин, баню. — М., 1999.

**6.** Трусов, О.А. Памятники монументального зодчества Белоруссии XI–XVII вв.: Архитект. — археологический анализ. — Мн.: Наука и техника, 1988. — 160 с. ил.

**7.** Шалькевіч, В.Ф. Грубэр Габрыель // Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Полацка / Рэд. кал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) і інш. — Мн.: БелЭн, 2002. — 912 с.: іл.




**Мал.1.** План II паверха корпуса «В» і ўмоўныя знакі.




**Мал. 2.** Разгортка паўночнай сцяны корпуса «В» з боку памяшканняў № 2–13.




**Мал 3.** Разгортка паўднёвай прадольнай сцяны другога паверха над памяшканнямі № 6–13.



**Мал. 4.** Сцяна паміж памяшканнямі № 3 і 4, ніша з вентыляцыяй.



**Мал. 5.** Ацяпляльныя каналы каля заходняй сцяны
над памяшканнем № 1.



**Мал. 6.** Кафля з засыпкі скляпенняў над памяшканнямі № 8–10, фрагменты абгарэлай дахоўкі, глінянай абмазкі з яе адбіткамі і эмалевай падлогавай пліткі ад каналаў «цёплай падлогі» над памяшканнем № 1.



**Мал 7.** Расчышчанае ў 2003 г. скляпенне з рэшткамі ацяпляльных каналаў каля паўднёвай сцяны.



**Мал. 8.** Ацяпляльныя каналы над памяшканнем № 13
каля паўночнай сцяны.



**Мал. 9.** Рэшткі тынкоўкі на месцы былой лесвіцы (да 1831 г.).

# Агульныя тэндэнцыі развіцця гандлю ў Полацку ў XIX ст.

*Студзенікіна Ю.У.*

На працягу стагоддзяў гандаль з'яўляўся адным з прыярытэтных заняткаў гараджан. Адной з формаў арганізацыі гандлю з даўніх часоў былі кірмашы (ад нямецкага «штогадовы рынак») — рэгулярны гандаль, які адбываецца падчас прыезду гандляроў у пэўным месцы і на працягу пэўнага тэрміну або некалькі разоў на год.

Кірмашы з'явіліся ў Еўропе ў перыяд ранняга Сярэднявечча. Дазвол на іх адкрыццё давалі Магдэбургскае права, прывілеі вялікіх князёў літоўскіх і каралёў польскіх, пастановы і ўказы царскай улады. Наш горад развіваўся ў рэчышчы еўрапейскіх дзяржаў. Кірмаш у Полацку быў зарэгістраваны адным з першых на Беларусі — у 1498 г. (год атрымання прывілея на Магдэбургскае права).

Звычайна кірмашы адбываліся або пачыналіся ў дні рэлігійных святаў. Традыцыйна афіцыйнае свята адбывалася да абедні, а пасля пачынаўся кірмаш. З XVI ст. гэта стала нормай звычаёвага права. Свята пачыналася разам з гандлем на рынкавай плошчы [**1**, с. 181]. Існаваў рытуал адкрыцця і закрыцця кірмашоў.

Вядома, што ў XVIII–XIX стст. кірмашы («ярмонки», базары, таржкі) праходзілі ва ўсіх гарадах і мястэчках Беларусі. Па Віцебскай губерні ў 1832 г. прайшло 27 кірмашоў, у 1863 г. — 42, у 1894 г. — 379.

Унутраны распарадак на кірмашах вызначаўся мясцовымі пастановамі і статутамі гандлю, кантраляваўся атрадамі паліцыі або спецыяльна створанымі кірмашовымі камітэтамі. Так, у Рапарце Полацкай гарадской паліцыі 1838 г. адзначана: «…проишествий никаких не случилось… жалоб на торгующих не было»[**4**, л. 13 адв.].

Актуальныя ў сярэднявеччы, кірмашы не згубілі сваёй папулярнасці і ў наступныя стагоддзі. У разглядаемы перыяд (XIX ст.) у Полацку таксама дзейнічаў кірмаш.

У 1810 г. Полацкая гарадская дума і магістрат падалі рапарт на імя губернатара з просьбай мець кірмаш у Полацку,

а таксама публікаваць у газетах сталіцы і суседніх губерняў апавяшчэнні аб бесперашкодным гандлі і ўездзе жадаючых.

У справе аб заснаванні кірмашу ў горадзе Полацку ад 22.10.1810 г. было пастаноўлена: «…в день святого Игнатия, основателя Полоцкого езуитского ордена и в нём издревле заведённого училища, позволить завести в городе Полоцке ярмонку… начиная 31 июля по 20 августа» [**3**, л. 1, 3, 6, 29].

Ужо ў 1838 г. у Полацку «…существуют 2 малочисленные ярмарки…» [**5**, л. 13].

Асартымент тавараў кірмашу ў Полацку быў тыповым для беларускага рынку таго часу. Першае месца па папулярнасці тавараў займалі прадукты жывёлагадоўлі, рыбалоўства і палявання (жывёла, мясамалочныя прадукты, рыба, скуры, футра, тлушч, воск, мёд і інш.). Найбольшым попытам з іх ліку карысталіся буйная рагатая жывёла і коні, якія прадаваліся на ўсіх кірмашах, незалежна ад іх профілю.

Другое месца занялі дзве групы тавараў, якія адносяцца да сельскай гаспадаркі — асноўнага занятку насельніцтва: прадукты земляробча-раслінныя (зерневыя, крупы, кармы (трава, сена, салома), насенне, прадукты агародніцтва і садоўніцтва, лён, пянька, пакулле, тытунь, цукар, хлебабулачныя вырабы і інш.) і мінеральна-металічныя (мінеральныя выкапні і будаўнічыя матэрыялы (мел, гліна, цэгла і г.д.), соль, посуд, сельскагаспадарчыя прылады, інструменты, ганчарныя і шкляныя вырабы, шкло, чыгун, жалеза, сталь, зброя).

Далей ідуць мануфактурныя («чырвоныя») і галантарэйныя («іголкавыя», «дробязныя») прадметы, вопратка, абутак, галаўныя ўборы, пакавальныя матэрыялы (мяшкі, вяроўкі, ліны), баваўняная, ваўняная, шаўковая, паўшаўковая і льняная тканіна. У апошнюю групу аб'яднаныя сялянскія («чорныя») тавары: прадукты харчавання, вырабы сялянскіх промыслаў і саматужнай прамысловасці (палатно) [**18**, с. 7–8].

У другой палове XIX ст. з пачаткам будаўніцтва чыгунак значэнне кірмашовага гандлю на беларускіх землях, як і ў цэлым па Расійскай імперыі, стала хутка зніжацца.

Па дакументах 1866, 1868, 1876 гг. у Полацку «…были учреждены 2 ярмарки. Летняя с 15 по 25 мая, зимняя с 1 по 10 декабря. Однако торговцы на них не съезжались. Более

значительный торг бывает в последнее воскресенье перед Рождеством Христовым…, где сбывается продукции на сумму не более 2500 руб.» [**10**, л. 111 адв; 12, л. 31; 7, л. 90]. Гандаль праходзіў на 2-х гандлёвых плошчах, у горадзе дзейнічала 10 аптовых складоў [**10**, л. 112]. Летняя «ярмарка» называлася «Евфросиньевская», яна прыпадала на дзень памяці Еўфрасінні Полацкай па старым стылі: «ярмарка назначена 23 мая, в день Евфросиньи, княжны Полотской…» [**11**, л. 15 адв].

15 верасня 1892 г. віцебскаму губернатару ад праваслаўных і стараабрадцаў, жыхароў г. Полацка, было прадстаўлена незвычайнае прашэнне. Яно было падпісана Антанінам, епіскапам Полацкім і Віцебскім. Аўтары прашэння прапануюць перанесці дні гандлю з нядзелі і дзён двунадзесятых святаў: «Город наш, числясь старинным русским городом, не оправдывает своего названия, т.к. в дни еврейских праздников здесь полнейшее благочиние и тишина, а в дни праздников православных разные безчинства и безобразия» [**8**, л. 1 адв.] «…преймущественно же крестьяне, сбыв привезенное в городе, напиваются и производят разные бесчинства…» [**8**, л.1] «…тогда как, например, в городах Витебск, Динабург и Режиц воскрестные и праздничные дни свято чтутся и никакой торговли в эти дни там не производится, а вместо этих дней назначены другие дни недели …» [**8**, л. 1 адв.].

Скарга дала свае вынікі. Ужо 16 кастрычніка 1892 г. полацкі паліцмайстар атрымаў уведамленне Полацкага і Віцебскага архірэя: «принять меры по закрытию базаров по воскресным и праздничным дням и перенести на другие дни соответствующим распоряжением» [**8**, л. 3].

Надалей кірмашовы гандаль ідзе на спад.

У 1900 г. полацкі павятовы спраўнік паведамляў: «… в городе ярмарок не бывает, только в уезде бывают незначительные торжки по местному называемые «кирмашами». Таржкі з'яўляліся месцам збыту рамесніцкіх вырабаў з дапамогай пасрэднікаў і аптовых закупак сельскагаспадарчых прадуктаў і сыравіны. Аднак сума тавараздвароту на таржках была нязначнай і ў сярэднім складала 150–200 руб. [**17**, с. 236]. Такім чынам, у Віцебскай губерні ў вывучаемы час кірмашы існавалі толькі ў мястэчках. У Полацкім павеце кірмашы праводзіліся ў мястэчку

Сіроціна. Галоўным прадметам гандлю на сіроцінскіх кірмашах былі сельскагаспадарчы інвентар і іншыя вырабы сельскай гаспадаркі, што прывозіліся жыхарамі Полацка і павета; таваразварот складаў 80–100 руб. [**6**, л. 136].

Рост гарадоў і колькасці іх жыхароў спрыялі павышэнню попыту на сельгаспрадукты і тавары прамысловасці, што дало штуршок развіццю новым формам гандлю — кірмашовай, развозна-разноснай і стацыянарнай.

На змену рынкам прыходзяць базары. Базары розных выглядаў меліся ва ўсіх гарадах і мястэчках Беларусі і нават у вялікіх сёлах. У функцыі базараў уваходзіла забеспячэнне гараджан прадуктамі харчавання. Напрыклад, у кожны кірмашовы дзень у Полацк прывозілі прадуктаў і сельскіх прамысловых і рамесных вырабаў на суму 500 руб.

У 1839 г. Віцебская губернская будаўнічая камісія разглядае Праект на пабудову ў Полацку гасціных радоў. Гораду была дадзена пазыка, вызначаны крайні тэрмін пабудовы — 1.09.1841 г. [**2**, л. 229 адв.]. Планавалася «…провести постройку гостиных лавок не по углам Торговой площади, а по 1 линии через всю площадь, дабы этим избежать безобразия и соблюсти квадратное положение площади… от Ильинской ул. к Плиговской, по которой совершается Главный проезд, находится большой скат к Ильинской ул., т.о. необходимо… уравнять и произвести земляную насыпь…» [**2**, л. 229 адв, л. 230].

Будаўніцтва вялося вельмі цяжка. Праца спынялася «по случаю наступившей холодной ненастной погоды». Пазней аказалася, што частка збудаванай пабудовы — з рознай цэглы, унутраны мур — з матэрыялу дрэннай якасці. Затым скончыліся грошы: «50 000 р. недостаточно, застройку можно будет отнести на счёт общих городских доходов…» [**2**, л. 231 адв., л. 232, л. 299]. Будаўніцтва каменных радоў зацягвалася.

Нарэшце крамы былі пабудаваны двюма лініямі, месца вакол сцен гасціных лавак было выраўнена, нізкія месцы засыпаны і вымашчаны камнем, маставая ўтрамбавана цагляным друзам [**2**, л. 314 адв.]. Да гандлёвых радоў былі прымацаваны каравульныя і пажарная каманда, якая ў 1845 г. закупіла коней [**2**, л. 315]. Аднак нават пасля ўводу лавак у эксплуатацыю слухаліся рапарты аб «сырости выстроенных в городе Полоцке

торговых лавок», узнімаліся пытанні «о скате воды в случае дождей, устройстве канавок вокруг Лавочного здания…» [**2**, л. 337, л. 338].

Адбудаваныя каменныя рады сталі сэрцам гарадскога гандлю. Тут размяшчалася крама з бакалейным таварам Сіманава [**16**, л.67], крамы з гатовай вопраткай купца Будневіча [**16**, л. 68], Арансона [**16**, л. 71]. Найболей папулярнымі былі крамы мануфактурным таварам. Іх утрымлівалі Б. Мінц, Сіманаў, Іофе [**16**, л. 69, 72, 79], Будневіч, Кацэйлін [**16**, л.74], Грабкін [**16**, л.73, 74, 88], Рымзінц [**16**, л. 77], Ш. Берковіч, Вітэнберг [**16**, л. 82], Х. Эмануэль [**16**, л. 83], Мойша Левін [**16**, л. 87, 88], М. Рэльтман [**16**, л. 84, 89], Ліберман [**16**, л. 91], Левіт [**16**, л. 110], Кацэнельсон [**16**, л. 76], Баркан [**16**, л. 85], Іофін [**16**, л. 90]. Тут жа знаходзіўся склад мукі Я. Рыўліна [**16**, л.75]. На каменных радах размяшчалася крама аптэкарскіх тавараў Аркуля [**16**, л. 77]. Вялі гандаль жалезным, рымарным і скабяным таварам у сваіх крамах Бейнуль, Берковіч, Вітэнберг [**16**, л. 78], Шпакаў [**16**, л.80]. Працавалі крама з абуткам Галеркіна [**16**, л. 82], крама з посудам Рымшыца ў доме Гофеншэфаў [**16**, л. 86], крама фаянсавых і крыштальных вырабаў Грынзайда [**16**, л. 94].

Кошты на асноўную харчовую прадукцыю і для параўнання памеры заработнай платы за 1895 г. змешчаны ніжэй ў табліцах 1 і 2.

А ўжо ў канцы XIX — пач. XX ст., паводле пісьмовых крыніц, у горадзе налічвалася 5 базараў: Верхні, Ніжні, Сянны, Дрывяны, Жывёльны.

Развіццё прамысловасці, рост гарадоў і гарадскога насельніцтва стваралі ўмовы для пашырэння тут сеткі стацыянарнага гандлю.

Лепш за ўсё стацыянарны гандаль быў развіты ў губернскіх гарадах. Высокі ўзровень стацыянарнага гандлю быў таксама ў Брэсце, Бабруйску, некалькі ніжэй у Слоніме, Менску, Мсціславе, Полацку, Слуцку. Але ўсё ж Полацк лічыўся горадам базарна-стацыянарнага гандлю.

Перарастанне перыядычнага гандлю ў стацыянарны адбывалася ў Беларусі гэтак жа, як і ў цэлым у Расійскай імперыі: павольна і паступова, ад кірмашовага да базарнага і ад яго да лавачна-крамнага.

Гандлёвыя ўстановы былі разнастайнымі. У першую чаргу неабходна адзначыць вялікую колькасць піцейных дамоў, корчмаў, «ренских» скляпоў, дзе прадаваліся спіртныя напоі і закускі.

Весці гандлёвую дзейнасць, утрымліваць краму, фатаграфію або карчму дазвалялася асобам, якія ўваходзілі ў гільдыю і мелі адпаведныя дакументы, няхай гэта будзе мешчанін, дваранін або купец. Выдачай дакументаў займалася Полацкая гарадская ўправа. Яна выдавала пасведчанні 2-й гільдыі, білеты 2-й гільдыі, акцызныя і тытунёвыя патэнты. Выдаваліся павседчанні на дробязны гандаль па мясцовасцях, на развазны і разносны гандаль, на мяшчанскія промыслы. Па Ведамасці Віцебскай казённай палаты можна прасачыць колькасць выдадзеных у 1880 г. пасведчанняў і квіткоў на права гандлю і промыслаў па Віцебскай губерні. Усяго па Полацку — 897. Пераважаюць пасведчанні на дробязны гандаль. Першае месца па выдадзеных дакументах займаў Віцебск (2565), другое — Дынабург (2465), затым — Рэжыца (937), чацвёртае месца — Полацк. [**13**, л. 229, 230].

У 1840-я гг. на Беларусі сталі з'яўляцца крамы. У Полацку ў 1869 г. дзейнічала 431 крама, у 1899 г. — 492. Такая форма гандлю садзейнічала развіццю таварна-грашовых адносін [**18**, с. 236]. Крамы трымалі купцы і рамеснікі. Калі апошнія прадавалі ў крамах свае вырабы, то купцы выконвалі ролю пасрэднікаў. Асноўная маса гандлёвых устаноў належала мяшчанам. Калі аналізаваць па нацыянальна-рэлігійным складзе, то на 1895 г. па Полацку і павеце колькасць гандлёвых устаноў, якія належалі асобам хрысціянскага веравызнання, складала 77, іудзейскага — 566 [**14**, л. 5].

У Ведамасці аб гільдыйскіх гандлёвых і прамысловых прадпрыемствах за 1895 г. па Полацкім павеце (або горадзе) Віцебскай губерні [**15**, л. 23] тлустым шрыфтам выдзелены гандаль, які прыносіў найбольшы прыбытак (табліца 1).

Па Ніжне-Пакроўскай вуліцы размяшчалася «заведение» Гінды Капейкінай. Тут вёўся гандаль ільном, рыззём, скурамі [**16**, л. 12].

На Верхне-Пакроўскай вуліцы знаходзілася крама з мануфактурным таварам [**16**, л. 16], оптавы склад віна і спірту ва ўласным доме купчыхі Ханы Гельзітэйн [**16**, л. 19], крама з бакалейным таварам і склеп ва ўласнай хаце купца Яна

Купрыянавіча Шпакава. Ён жа меў акцызны і тытунёвы патэнты [16, л. 22, 23]. На Верхне-Пакроўскай вуліцы ў хаце Файнбергаў працавала гасцініца «Віленская». Утрымліваў яе купец Кастусь Якаўлевіч Рамуйла [**16**, л. 24].

На Віцебскай вуліцы працавала крама гадзіннікаў, залатых і срэбных рэчаў купца Лейбы Левіта [**16**, л. 52]. Тут жа гандляваў залатымі і срэбнымі вырабамі купец Мойша Трыфін [**16**, л. 59], была крама залатых і срэбных вырабаў купца Льва Кузьменкі [**16**, л. 63]. Па вуліцы Віцебскай размяшчаліся крама рэчаў і абутку купца Еханона Гордзіна [**16**, л. 58], крама абутку, канцылярскіх прылад, крама са шпалерамі, аптэка, гасцініца [16, л. 60].

Як бачым, у сярэдзіне XIX ст. на Беларусі адбывалася пашырэнне сеткі стацыянарнага гандлю. Пераход ад перыядычнага гандлю да стацыянарнага здзяйсняўся павольна і паступова.

Пры гэтым ажыццяўляўся гандаль у разнос. Па кватэрах насілі малако, булачныя вырабы, улетку — марожанае.

Такім чынам, унутраны гандаль у XIX ст. развіваўся ў трох формах: перыядычнай (кірмашовай і базарнай), развозна-разноснай і стацыянарнай (лавачнай, крамнай). Усе тры формы ўнутранага гандлю развіваліся паралельна, паміж імі існавала ўзаемасувязь і ўзаемадапаўняльнасць.

У сярэдзіне XIX ст. праявілася вызначаная тэндэнцыя: скарачаўся гандаль на кірмашах, яны перараджаліся ў пашыраныя базары, а ад іх паступова здзяйсняўся пераход да сталага гандлю праз лаўкі і крамы. Асноўная роля яшчэ працягвала захоўвацца за перыядычнай і развозна-разноснай формамі гандлю. Аднак будучыня належала менавіта стацыянарнаму гандлю — неад’емнай часткі капіталістычнай вытворчасці.

Выгоднае размяшчэнне горада на Заходняй Дзвіне і будаўніцтва Рыга-Арлоўскай чыгункі паступова ператварылі Полацк у месца транзітнага гандлю. Але нягледзячы на пазітыўныя зрухі ў развіцці гандлю, яго ўзровень заставаўся параўнальна нізкім, пераважаў дробны гандаль.

**Спіс літаратуры**

**1.** Катлярчук, А. Кірмашовае свята // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Т. 4 / Беларус. Энцыкл. — Мн.: БелЭн, 1997. — С. 181.

**2.** Установа Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). Ф. 1297, Воп. 1, С. 11298.

**3.** Там жа. Ф. 1416, Воп. 2, С. 3471.

**4.** Там жа. Ф. 1430, Воп. 1, С. 6637.

**5.** Там жа. Ф. 1430, Воп. 1, С. 6673.

**6.** Там жа. Ф. 1430, Воп. 1, С. 25102.

**7.** Там жа. Ф. 1430, Воп. 1, С. 34084, ч.1.

**8.** Там жа. Ф. 1430, Воп. 1, С. 41267.

**9.** Там жа. Ф. 2502, Воп. 1, С. 15.

**10.** Там жа. Ф. 2502, Воп. 1, С. 117.

**11.** Там жа. Ф. 2502, Воп. 1, С. 139.

**12.** Там жа. Ф. 2502, Воп. 1, С. 267.

**13.** Там жа. Ф. 2502, Воп. 1, С. 338.

**14.** Там жа. Ф. 2502, Воп. 1, С. 420.

**15.** Там жа. Ф. 2520, Воп. 1, С. 15.

**16.** Там жа. Ф. 2523, Воп. 1, С. 6.

**17.** Філатава, А. М., Глазырын, Я. У., Савіцкі, Э. М. У складзе Расійскай імперыі // Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Полацка. — Мн.: БелЭн, 2002. — С. 225–239.

**18.** Швед, В. В. Торговля в Беларуси в период кризиса феодализма (1830–1850-е годы). — Гродно: ПКФ «Орбикс» 1995. — 195с.

**Табліца 1.**

Ведамасць аб сярэдніх коштах на галоўныя харчовыя прадукты па гарадах Віцебскай губерні за 1895 г. [**14** , л. 165, 165 а].

| | Віцебск | Полацк |
|---|---|---|
| Мука аржаная (куль у 9 пудоў) | 6,4 руб. | 5,5 руб. |
| Мука жытнёвая (пуд) | 1 руб. | 1 руб. |
| Крупы грэчневыя (чвэрць у 8 пудоў) | 11,25 руб. | 10,6 руб |
| Гарох (чвэрць у 9 пудоў) | 9,7 руб. | 5,2 руб. |
| Авёс (чвэрць у 5 пудоў 20 фунтаў) | 2 руб. | 2 руб. |

**Табліца 2.**

Ведамасць аб сярэдніх коштах на рабочыя рукі па Віцебскай губерні за 1895 г. [**14**, л. 166, 166 а].

| | Працоўны конны | | Працоўны пешы | | Працоўная | | Памесячна | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | Працоўнаму | | Працоўнай | |
| | На ўтры-манні наймаль-ніка | На утры-манні нанятага | На утры-манні наймаль-ніка | На утрым-тага | На утры-манні наймаль-ніка | На утры-манні нанятага | На утры-манні наймаль-ніка | На утры-манні нанятага | На утры-манні наймаль-ніка | На утры-манні нанятага |
| Віцеб-скі павет | 94 кап. | 1 руб 25 кап. | 38 кап. | 56 кап. | 23 кап. | 36 кап. | 5 руб. 71 кап. | 8 руб. 72 кап. | 3 руб. 16 кап. | 5 руб. 90 кап. |
| Полацкі павет | 86 кап. | 1 руб. 50 кап. | 37 кап. | 47 кап. | 20 кап. | 30 кап. | 4 руб. 30 кап. | 7 руб. 40 кап. | 2 руб. 10 кап. | 4 руб. 90 кап. |

**Табліца 3.**

Ведамасць аб гільдыйскіх гандлёвых і прамысловых прадпрыемствах за 1895 г. па Полацкім павеце (або горадзе) Віцебскай губерні.

| Гандаль таварамі | Колькасць прад прыем-стваў | Сума гадавых абарачэн-няў у сот-нях руб. | Сума пры-бытку ў руб. | Сярэдні % прыбытко-васці |
|---|---|---|---|---|
| Мануфактурнымі, суроўскімі, галантарэйнымі, парчовымі, дыванамі і інш. | 15 | 57500 | 5750 | **10** |
| Гатовым адзен-нем, бялізнай, капелюшамі, пальчаткамі, парасонамі, афіцэрскімі рэчамі і інш. | 42 | 232000 | 16240 | 7 |
| Футравым, кушнерскім і шубным таварам. | 1 | 10000 | 500 | 5 |
| Скурамі, скуран. і кушнерскімі вырабамі, шавецкія і чаравіковыя крамы. | 3 | 16000 | 1400 | **8,7** |
| Ільном, пянь-кою, лінамі, вяроўкамі, рагожамі, дёг-цем, анучаю, косцю. | 10 | 184000 | 5350 | 2,9 |
| Хлебам, зернем, млынавымі прадуктамі, се-нам, саломаю. | 7 | 134000 | 4660 | 3,4 |
| Соллю. | 1 | 12500 | 500 | 4 |

| Гандаль таварамі | Колькасць прад прыем-стваў | Сума гадавых абарачэн-няў у сот-нях руб. | Сума пры-бытку ў руб. | Сярэдні % прыбытко-васці |
|---|---|---|---|---|
| Бакалейным, каланіяльным, гастранамічн. і каўбасн. таварамі, гар-батай, цукрам, кавай. | 13 | 162000 | 10050 | 6,2 |
| Оптавыя склады віна, спірту, піва, рэйнскія склепы. | 16 | 415500 | 8780 | 2,1 |
| Мылам, рознымі асвятляльнымі матэрыяламі, мінеральнымі і раслiннымі алеямі, запалкамі. | 2 | 70000 | 3500 | 5 |
| Касметычнымі, хімічнымі, аптэкарскімі таварамі, аптэкі. | 7 | 25800 | 4520 | **17,5** |
| Невысакароднымі металамі, жа-лезн., скабя-ным таварам, дамавымі прыборамі, метал. посу-дам, меднымі, латуннымі, брон-зав. вырабамі. | 3 | 74000 | 3700 | 5 |
| Вырабамі з золата, срэбра, кашт. камянёў, мельхіёр., брон-зав. сплаваў, гадзіннікавыя крамы. | 5 | 12000 | 1200 | **10** |

| Гандаль таварамі | Колькасць прад прыем-стваў | Сума гадавых абарачэн-няў у сот-нях руб. | Сума пры-бытку ў руб. | Сярэдні % прыбытко-васці |
|---|---|---|---|---|
| Парцалян, фаян-сав., крыштальн., ганчарнымі вырабамі, люстэркамі, шклом, лямпамі. | 3 | 28000 | 1680 | 6 |
| Будаўнічым і прамысловым лесам, дрывамі, камен. вуга-лем і коксам, цэглай, глінай, вапнай і інш. будматэрыяламі. | 1 | 35000 | 1050 | 3 |
| Паперай друкар-скай, пісчай, аб-гортачнай, кардо-нам, шпалерамі, канцылярскімі прыладамі. | 2 | 6500 | 520 | 8 |
| Падрады на пастаўку рознага роду прадметаў. | 6 | 27400 | 1370 | 5 |
| Рознага роду гандаль, не пака-заны. | - | - | - | - |




**Мал. 1.** Гандлёвыя рады ў Полацку. З фондаў НПГКМЗ.



**Мал. 2.** Мясны рынак у Полацку. З кнігі Mary Antin (1881–1919).
The promised land, USA, 1997.



**Мал. 3.** Хлебны рынак. З кнігі Mary Antin (1881–1919).
The promised land, USA, 1997.



**Мал. 4.** Рынак па продажы дроў. З кнігі Mary Antin (1881–1919).
The promised land, USA, 1997.

## «И вспомнить страшно, и забыть нельзя…»

***Сыревич И.В.***

### 1. Вступление

В истории есть события и даты, которые забыть нельзя. Такой мрачной датой стало 22 июня 1941 года. Великая Отечественная война унесла жизни 4 миллионов белорусов, оставила свой кровавый след на людских судьбах. Частью горькой жизни могут назвать войну и тысячи детей, переживших это время. Они встретили её в разном возрасте. Кто-то — совсем крохой, кто-то — подростком или на пороге юности. Это были дети белорусских партизан, воинов, еврейские дети.

*Ушло моё детство,*
*Исчезло, пропало.*
*Давно это было, давно,*
*А может, и вовсе его не бывало,*
*А только приснилось оно.*

Дети и война, дети и смерть — это несовместимые понятия. У современных девчонок и мальчишек детство — самое счастливое время жизни. Но миллионы детей Советского Союза во время войны были лишены этих счастливых лет. Они испытали на себе ужас оккупации, издевательства, голод и холод. Это живые свидетели истории, которых, к сожалению, осталось очень мало. На их глазах убивали родителей, заживо жгли и вешали. Детей отправляли в детские дома, в концлагеря, насильно вывозили за пределы страны. Им приходилось плечом к плечу со взрослыми воевать в партизанских отрядах, чтобы приблизить долгожданную Победу. Каждая деталь их военных воспоминаний важна для нас. Работа «И вспомнить страшно, и забыть нельзя…» должна стать ещё одним памятником всем детям, которым пришлось пережить то страшное время. Они должны знать: они нужны нам, нам нужна их память — память нашей истории, чтобы вновь не повторилась та страшная война.

## 2. Эвтаназия. Геноцид. Концлагеря

Кажется, так давно это было. Но только не для тех, кто прошёл сквозь ужасы фашистских застенков во время ВОВ. Биографии этих людей — это настоящие уроки мужества для молодого поколения. Война ворвалась в каждый дом, в каждую семью.

Концентрационные лагеря (далее — КЛ) III Рейха существовали до начала и во время Второй мировой войны на всей захваченной фашистами территории. Ещё до 1939 года нацисты создали в самой Германии 6 концлагерей: Дахау, Заксенхаузен, Бухенвальд, Флоссенбюрг, Нойенгамме, Равенсбрюк. Первые лагеря были исправительно-трудовыми. Нацистами во главе с Гитлером была подготовлена и осуществлена изуверская программа «эвтаназии» (лёгкой смерти). Эта программа предусматривала избавление от «бесполезных едоков» — стариков, хронически больных, умалишённых.

Первыми жертвами массовых нацистских преступлений стали дети. Именно с них началось уничтожение людей в огромных масштабах «индустриальным способом». 23 мая 1939 года некие Кнауеры из Лейпцига обратились к Гитлеру с просьбой решить судьбу их ребёнка, от рождения глухонемого, слепого и не владеющего конечностями. В то время в Германии не допускалось умерщвления людей под предлогом избавления от лишних страданий, это каралось как уголовное преступление. Однако Гитлер, получив информацию, послал в Лейпциг Брандта, комиссара по санитарной службе и здравоохранению, для проверки факта о ребёнке. После этого 1 сентября 1939 года издал приказ, в котором разрешалось «из гуманных соображений» неизлечимо больным, в случае критической оценки их здоровья, обеспечить лёгкую смерть. Именно с этого момента началась акция под названием «эвтаназия», в результате которой было уничтожено 80 000 человек, признанных психически неполноценными. Жертвами акции стали и узники фашистских застенков, которые не имели сил работать и стали бесполезными для германской военной машины.

В годы войны КЛ значительно расширились, число заключённых в них увеличилось в 2–4 раза. Начиная с 1941 года, в соответствии с расовой теорией, появляются «лагеря

и фабрики смерти», целью которых было уничтожение «неполноценных народов». Сеть КЛ, тюрем и гетто покрыла Восточную Европу, как паутина. Сюда же входили страны Балтии и Белоруссия. Освенцим, Маутхаузен, Гросс-Розен, Майданек, Саласпилс, Алитус, Озаричи, Тростенец…Существовали также «особые лагеря», спецшколы, лагеря для малолетних. Через всё это прошло 18 миллионов человек. 12 миллионов из них погибли, в том числе 7 млн. из Советского Союза. Были КЛ и в нашем городе Полоцке. Самые большие из них — в Баравухе I и в Спасском городке. Были также тюрьма и еврейское гетто, в котором погибло 7 000 человек. Всего уничтожено около 200 000 человек.

### 3. Депортация. Вывоз людей в Германию в 1943–1944 году

В начале 1943 года в Германии была объявлена тотальная мобилизация всех людских резервов для пополнения армии и расширения военного производства. В марте появилось распоряжение нацистских главарей о необходимости увеличения вывоза в рейх рабочей силы из захваченных районов Советского Союза. За апрель — декабрь 1942 года уже было вывезено в Германию 1 375 567 человек.

Согласно новому распоряжению, в течение ближайших четырёх месяцев следовало отправить из оккупированных восточных областей ещё 1 млн. мужчин и женщин. Если брать Беларусь, то основное количество людей было вывезено из Витебской области. В течении 1943–1944 годов, от зимы до зимы, из Витебска, Полоцка, Орши и других городов придвинского края в КЛ уходили и уходили поезда с членами партизанских семей и семей подпольщиков, схваченных гитлеровцами во время карательных операций. Части вермахта и карательные отряды внезапно окружали населённые пункты, хватали трудоспособных мужчин, женщин и подростков. Вывозили семьями и по одиночке. Этих людей помещали в пересыльные лагеря. В июле 1943 года такие лагеря были созданы во многих городах Беларуси, в том числе и в Полоцке на ст. Громы. Людей держали в грязи, голоде и холоде. Затем в товарных вагонах, «телятниках», вывозили в Германию и другие страны, где их ждал

подневольный труд в промышленности, помещичьих имениях, на фермах. Тех, кто был замечен в связи с партизанами, сразу отправляли в КЛ. Среди них были и дети.

Из справки Государственного музея ПНР в Освенциме: «Основываясь на ряде документальных источников, в том числе гитлеровского происхождения, а также из записок узников, можно утверждать, что в Освенцим прибыли транспорты:

- 9 сентября 1943 года — 753 женщины и 459 мужчин (среди них 180 девочек и 225 мальчиков) из Витебской области. № у женщин с 61417 по 62169, у мужчин — с 149467 по 149925;

- 10 октября 1943 года — 270 мужчин и подростков из Витебской обл. Их убили всех в тот же день в газовой камере;

- 11 октября 1943 года — 32 женщины и девочки из Витебска. Получили № 64884 — 64915;

- 22 октября 1943 года — 441 женщина и 298 мужчин (среди них 77 девочек и около 210 мальчиков). Узницы получили № 65687 — 66127, а узники — с 158666 по 158963.

- … - …. - …. - … - … - … - … - … - … - … - … - …

- … - … - … - … - … - … - … - … - … - … - … - …

- 4 декабря 1943 года — 543 женщины и 211 мужчин из Витебской области (среди них 20 девочек и около 30 мальчиков). Женщины получили № 69609 — 70151, мужчины № 165527 — 166039». 22 октября была вывезена Л.Е. Луговская, а 4 декабря увозили Котлярову, Литвинову, Зуеву, Шнипову, Медникову и Шевнёву.

Сколько их было, таких поездов? Сколько человек насчитывалось в каждом поезде? Общее количество похищенных детей точно не известно до сих пор.

Для чего нужны были гитлеровцам советские дети? Не только для того, чтобы бросать их в печи крематориев, проверять точность боя автоматов и остроту штыков. Завтрашний день партизанских детей предопределялся наперёд. В материалах состоявшегося в Польше судебного процесса по делу начальника управления СС Освальда Поля имеется приказ Генриха Гимлера от 6 января 1943 года. Он гласит: «В лагере дети подлежат расовому и политическому освидетельствованию.

# Агляд калекцыі шклянога посуду з фондаў НПГКМЗ

*Даражкоўскі С.Л.*

Калекцыя шкляных вырабаў НПГКМЗ налічвае ўсяго 1403 адзінкі (1196 — асноўны фонд, 207 — навукова-дапаможны).

Мэтай дадзенай работы з’яўляецца агляд калекцыі шклянога посуду ў фондах НПГКМЗ. Усяго яго ў фондах запаведніка 417 адзінак. Вырабы са шкла XII–XIII стст. прадстаўлены бранзалетамі, пацеркамі, пярсцёнкамі, рэшткамі шклянога посуду. Нават самае павярхоўнае знаёмства са старажытнарускім шклом паказвае, што посуд складал невялікую яго частку, саступаючы па колькасці і пацеркам і бранзалетам, і пярсцёнкам. І тым не менш, пачынаць вывучэнне старажытнарускага шкла больш зручна менавіта з посуду. Невялікая колькасць посуду з недахопу пераўтвараецца ў перавагу: невялікую колькасць знаходак можна вывучыць больш грунтоўна і маштабна.

Танкасценны шкляны посуд дайшоў да нас толькі ў выглядзе невялікіх фрагментаў. Усяго знойдзены 41 фрагмент (некаторыя адносяцца да аднаго і таго ж сасуда). Фрагменты належаць посуду, вырабленаму з распаўсюджанага празрыстага шкла з жоўтым альбо зялёным адценнем рознай інтэнсіўнасці. Як вынікае з рэканструкцыі, зробленай Ю.Л. Шчапавай, старажытнарускі посуд уяўляў сабою конусападобныя адкрытыя сасуды з маленькім цяжкім дном. Па спосабу выкарыстання мае аналогіі з сасудамі тыпу рога альбо рытона.

Адноўленыя формы адкрываюць магчымасць вывучаць шкляны посуд не толькі як археалагічную катэгорыю, але і як твор выяўленча-прыкладнога мастацтва. У сувязі з гэтым можна ўявіць, што прадвызначала мастацкія якасці старажытнарускіх сасудаў, іх адрозненні і асаблівасці.

Росквіт шкляной вытворчасці прыходзіцца на XII–XVIII стст. Большасць знойдзеных шкляных фрагментаў — гэта посуд, які прадстаўлены разнастайнымі вырабамі: бутэлькамі, бутлікамі, квартамі і інш. Асноўная частка шклянога посуду датуецца XVII–XIX стст., сустракаюцца фрагменты XII ст. Шкляны

посуд падзяляецца на тарны і сталовы. Самая распаўсюджаная катэгорыя тарнага шклянога посуду ў пластах другой паловы XVII–XVIII стст. — гэта бутэлькі.

Рыльцы бутэлек сустракаюцца паўсюдна ў пластах XVII–XVIII і больш позніх. Бутэлькі служылі для захоўвання він, напояў, гарэлкі, піва, а таксама мінеральных водаў і лекаў. Звычайнай формай былі цыліндрычныя бутэлькі з рознымі варыянтамі афармлення рыльца, пры гэтым усе бутэлькі мелі пукатае дно, якое прызначалася для асядання асадку на спод.

У XVII ст. выраблялі пераважна прысадзістыя слоікападобныя бутэлькі (бутлікі); у XVIII ст. выцягнутыя ў плане цыліндрычныя бутэлькі значна пераважаюць, назіраецца тэндэнцыя да павелічэння вышыні вырабаў. У першай палове XVIII ст. пад краямі венцаў бутэлек змяшчаліся нікляныя валікі няправільнай формы, якія прызначаліся для мацавання корка. З другой паловы XVIII ст. бутэлькі маюць шыйку з шырокім рыльцам.

Разнастайныя бутлікі — другая па колькасці распаўсюджвання катэгорыя тарнага шклянога посуду. Рыльцы бутлікаў аформлены як у бутэлек, у канцы XVII ст. звычайным становіцца шматрадавы жгут па краю рыльца.

Кварты — род бутэлек з чатырохвугольнай формай тулава — сталі шырока вядомы з канца XVII ст., а з другой паловы XVIII ст. яны набываюць больш правільныя квадратныя формы і пачынаюць выкарыстоўвацца як аптэкарскі посуд.

Форма бутляў развіваецца па двух напрамках: першы — гэта шлях захавання традыцыйнай формы бутэлькі нестандартна вялікіх памераў, другі — паступовая трансфармацыя бутлікаў у мініяцюрнае аптэчнае начынне. Памеры венцаў апошніх вагаюцца ад 2,3 да 4 см, вышыня не перавышае 10–12 см.

Пашырэнне ў XVIII ст. асартыменту аптэчнага посуду звязана з развіццём лекарства. Аптэкарская справа актыўна развіваецца ў Полацку пры царкоўных шпіталях.

У сярэдзіне XVI ст. у Полацку існавала тры шпіталі. Адзін з іх знаходзіўся «пад валам», другі — каля манастыра Уваскрэсення Хрыстова (на Верхнім замку), трэці — паблізу царквы Узнясення Хрыстова (на Вялікім пасадзе). Шпіталь «пад валам» знаходзіўся, верагодна, насупраць умацаванняў

Верхняга замка на левым беразе Чорнага ручая (тэрыторыя Вялікага пасада).

З сярэдзіны XVII ст. таксама існавала аптэка на езуіцкім двары. У XVII–XVIII стст. шпіталі ў Полацку трымала полацкае брацтва пры Богаяўленскім саборы і базыліяне. Хірургі-цырульнікі карысталіся розным інструментам, у тым ліку выкарыстоўвалі шкляныя слоікі для захоўвання лекаў.

Тыповай формай аптэчнага слоіка ў XVIII ст. становіцца начынне з тонкімі сценкамі і адагнутым вонкі венцам аднолькавай са сценкамі таўшчыні. Для лекарскіх, аптэкарскіх і алхімічных мэтаў выраблялі малыя цыліндрычныя бутэлькі з краямі, прыстасаванымі для закрывання слоікаў мяккімі завязкамі.

Шклянніцы — род сталовага посуду для спажывання напояў; падзяляюцца на два віды: гладкія і аздобленыя. Гладкія былі найбольш папулярнымі ў XVIII ст., што адпавядае цэнтральнаеўрапейскім тэндэнцыям. Шклянніцы маюць вышыню ў сярэднім 8–9 см і зробленыя з бясколернага шкла ці шкла з зеленаватым адценнем.

З раскопу 1990 года Н.І. Здановіч паходзіць некалькі фрагментаў размаляваных шклянніц з раслінным, геаметрычным і геральдычным арнаментам, на адной з якіх чытаецца літара «В». Дробныя кавалкі размаляванага шкла былі знойдзены на тэрыторыі Вялікага пасада падчас археалагічных даследаванняў пад кіраўніцтвам Д.У. Дука. Полацкія размаляваныя шклянніцы выраблялiся дзеля задавальнення густу вышэйшых асоб, напрыклад, вядомы полацкія шклянніцы, падараваныя цару Аляксею Міхайлавічу, што сведчыць аб высокім майстэрстве мясцовых шкларобаў.

Відавочна, што да канца XVIII ст. шкляная прадукцыя пачынае паступова выцясняць з побыту тарныя керамічныя вырабы і асобныя віды сталовага посуду. Ужо у XVII ст. большая частка шкляных вырабаў была мясцовай вытворчасці, што пацвярджаецца дадзенымі фізіка-хімічнага даследавання полацкай кафлі са шкляным пакрыццём (палівай) і пісьмовымі крыніцамі. Пра ўзрастанне попыту на шкляныя вырабы ў XVIII ст. сведчыць той факт, што першыя мануфактуры на тэрыторыі Беларусі былі менавіта шкловытворнымі (Налібоцкая ману-

фактура 20-х гадоў XVIII ст. і Урэчская мануфактура канца 30-х гадоў XVIII ст.). Вытворчасць шкляной прадукцыі арыентавалася на патрэбы розных сацыяльных пластоў гарадскога насельніцтва. Больш дарагое размаляванае шкло знойдзена на месцы пасялення заможных гараджан, яно цанілася вельмі высока. У напластаваннях XVII–XVIII стст. размаляванае шкло прадстаўлена адзінкавымі артэфактамі, што сведчыць пра яго адносна рэдкае выкарыстанне, затое рознага роду бутэлькі, шклянніцы, келіхі і іншыя вырабы са шкла становяцца атрыбутам сталовага посуду ў доме кожнага мешчаніна.

Фарміраванне калекцыі шклянога посуду з Полацка пачалося з другой паловы 1970-ых гг., калі ў горадзе праводзіліся даследаванні помнікаў старажытнарускага дойлідства. Два фрагменты шкляных сасудаў, знойдзеных падчас археалагічных раскопак 1979 г. на Верхнім замку, былі перададзены Булкіным, фрагменты шклянага посуду перададзены Г.В. Штыхавым.

Папоўнілася калекцыя шклянога посуду падчас раскопак, якія праводзіліся С.В. Тарасавым на тэрыторыі Полацка. У фонды НПГКМЗ перададзена у тым ліку і 6 прадметаў, знойдзеных на паўднёвай частцы Вострава ў Задзвінні.

На Вялікім пасадзе ў 1990 г., падчас археалагічных даследванняў пад кіраўніцтвам П.А. Русава на месцы помніка архітэктуры XVII ст., дома генерал-губернатара, знойдзена 3 фрагменты шклянога посуду. Геаграфія шкляных вырабаў прадстаўлена ў асноўным межамі гістарычнага цэнтра — посуд знаходзілі на Верхнім замку (у раёне Сафійскага Сабора), Ніжнім замку, Гарадзішчы, Задзвінні, невялікая колькасць шклянога посуду сустракаецца ў Запалоцці, што звязана з яго недастатковай вывучанасцю ў археалагічным плане.

З 1989 па 1992 г. у Полацку працавала археалагічная экспедыцыя на чале са Н.І. Здановіч, супрацоўніцай Беларускага рэстаўрацыйнага праектнага інстытута. Яна праводзіла археалагічныя даследаванні на розных участках Вялікага пасада і на тэрыторыі Спаса-Ефрасіннеўскага манастыра. Сярод археалагічных матэрыялаў з яе раскопак, у фонды запаведніка трапілі і вырабы са шкла (44 вырабы асноўнага фонду, 17 — навукова-дапаможнага). Больш за 200 адзінак шклянога посуду паступілі ў фонд НПГКМЗ у якасці асобных знаходак.

Яны сабраны супрацоўнікамі НПГКМЗ у розныя гады падчас назіранняў за землянымі работамі на тэрыторыі Верхняга замка і былога Вялікага пасада. Калекцыя шкляных бутэлак для захавання вадкасцей другой паловы XIX — першай паловы XX ст. была перададзена ў запаведнік яго супрацоўнікам А.А. Салаўёвым. Увесь шкляны посуд у сваёй асноўнай масе прадстаўлены фрагментамі, мае здавальняючую захаванасць, даступны для навуковага апісання. Асноўнымі дэфектамі з’яўляюцца страта фрагментаў, дэфармацыя, агульнае забруджванне.

Такім чынам, увесь шкляны посуд паводле спосабу паступлення можна падзяліць на 2 групы:

1. Посуд, які паступіў з запланаваных археалагічных раскопак ў горадзе — 201 адз.

2. Посуд, які трапіў ў фонды ў якасьці асобных знаходак — 216 адз.

Храналагічныя межы большай часткі калекцыі — XVII — пач. XX ст.; XII–XIII стст. прадстаўлены толькі некалькімі фрагментамі донцаў сасудаў.

За аснову дзялення шклянога посуду можна прыняць дзяленне паводле функцыянальнага прызначэння (сасуды для захавання вадкасцей і сасуды для піцця). Кожны з гэтых тыпаў дзеліцца ў сваю чаргу на падтыпы.

Сасуды для захавання вадкасцей падзяляюцца на чатыры тыпы:

1). Кварты — вырабы чатырохграннай формы з нахіленымі плечукамі, якія плаўна пераходзяць у горла, і значна ўвагнутым горлам.

2). Штофы — па форме вельмі блізкія да квартаў, адрозніваюцца прамымі плечукамі і амаль пляскатым донцам.

3). Бутэлькі — самыя масавыя вырабы са шкла. Пераважаюць цёмна-зялёнага колеру, часам бываюць светлыя, непразрыстыя.

4). Аптэчныя сасудзікі ў выглядзе бутэлечак і слоікаў. Адрозніваюцца невялікімі памерамі.

Сасуды для піцця падзяляюцца на наступныя тыпы:

1). Шклянкі — выкананыя ў форме цыліндра з патоўшчаным донцам.

2). Келіхі — маюць канічную форму, якая заканчваецца

масіўным, часам акруглым донцам.

3. Шклянніцы — з наляпным хвалепадобным валікам уздоўж донца.

Далей гэтыя драбнейшыя комплексы неабходна разглед- зець паводле храналагічнага комплексу, па форме, наяўнасці клеймаў ці надпісаў і г.д.

Такім чынам, падчас археалагічных даследаванняў у Полацку фрагменты шклянога посуду трапляюцца даволі часта. Гэты пад'ёмны матэрыял утрымліваецца ў асноўным у познесярэднявечным культурным слаі. Вывучэнне калекцыі шклянога посуду ў НПГКМЗ дагэтуль практычна не вялося. Неабходна прасачыць развіцце формаў, эвалюцыю шклароб- ства. На падставе вывучэння калекцыі посуду можна пісаць навуковыя працы, выкарыстоўваць у экспазіцыйна-выставачнай дзейнасці, абапірацца як на наглядны матэрыял пры правядзенні музейна-педагагічных заняткаў.

**Спіс літаратуры**

**1.** Археалогія Беларусі: У 4 т. Т. 4. Помнікі XIV–XVIII стст. / В.М. Ляўко, М.Ф. Гурын, Ю.А. Заяц і інш.; Пад рэд. В.М. Ляўко і інш. — Мн.: Беларуская навука, 2001. — 597 с.

**2.** Дук, Д.У. Полацк XVI–XVIII стагоддзяў: нарысы тапаграфіі, гісторыі матэрыяльнай культуры і арганізацыі жыццёвай прасторы насельніцтва беларускага горада. — Наваполацк: ПДУ, 2007. — 268 с.

**3.** Штыхов, Г.В. Древний Полоцк IX–XIII вв. — Мн.: Наука и техника, 1975. — 136 с.

**4.** Щапова, Ю.Л. Стекло Киевской Руси // Очерки истории древнего стеклоделия. — М., 1983. — 198 с.

**5.** Яніцкая, М.М. Беларускае мастацкае шкло (XVI–XVII стст.). — Мн.: Навука і тэхніка, 1977. — 120 с.

# Сякеры X–XVIII стст. з фондаў Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка

*Магалінскі І.У.*

Сякера — гэта прыстасаванне ў выглядзе масіўнай, клінападобнай у вертыкальным сячэнні металічнай пласціны, асаджанай на драўляную рукаяць для нанясення ўрону чалавеку ці прадмету.

Сякеры атрымалі вельмі шырокае распаўсюджанне на беларускіх землях. Іх выкарыстоўвалі не толькі прафесіянальныя рамеснікі і будаўнікі, але і простыя жыхары гарадоў і сельскіх паселішчаў у паўсядзённай практыцы. Немалаважнай была роля сякеры і ў якасці зброі.

На тэрыторыі старажытнай Русі, у тым ліку і на беларускіх землях, жалезныя баявыя сякеры з'явіліся ў IX–X стст. у час бурлівага развіцця матэрыяльнай культуры. Пачынаючы з X ст. ідавы і колькасны склад сякер пастаянна павялічваўся, развіваліся іх новыя формы, максімальна прыстасоўваючыся да функцыянальных задач, якія перад імі ставіліся [**1**, с. 28].

У Заходняй Еўропе баявыя сякеры таксама даволі шырока выкарыстоўваліся ў XI–XIII стст. Між тым, у XI ст. кантынентальныя ваяры разглядалі гэты від зброі як не варты высакароднага чалавека; толькі саксы і скандынавы лічылі, што ён падыходзіць для ўсяго, акрамя ганебных спраў. Аднак у пачатку XII ст. сякеры ператварыліся ў дастаткова рэспектабельны від рыцарскай зброі [**2**, с. 293].

Удасканаленне даспехаў у XIV–XVI стст. абумовіла вялікую папулярнасць сякеры як вельмі дзейснага сродку іх прабівання [**3**, с. 22]. У больш позні час сфера ўжывання дадзенай прылады значна звужаецца і абмяжоўваецца пераважна гаспадарча-універсальнымі і рамеснымі функцыямі.

Мэтай дадзенага даследавання з'яўляецца сістэматызацыя матэрыялаў па сякерах, якія захоўваюцца ў фондах НПГКМЗ. Для дасягнення пастаўленай мэты ставяцца наступныя задачы:

1). ахарактарызаваць сякеры паводле ступені захаванасці, марфалагічных і функцыянальных прыкмет;

2). правесці тыпалагічны аналіз сякер;

3). разгледзець магчымасць стварэння самастойнай тыпалогіі дадзенай катэгорыі вырабаў на полацкім матэрыяле.

У старабеларускай мове існавалі два словы для абазначэння дадзенага прадмета: тапор і сякера. Па назіранні Ю.М. Бохана, першы тэрмін абазначаў прыстасаванне, якое мела гаспадарча-універсальнае прызначэнне; а другі — від наступальнага ўзбраення. У польскай моўнай традыцыі назіраецца адваротая тэндэнцыя: тэрмін тапор (topór) мае шырокае значэнне, але найбольш часта ўжываецца ў якасці абазначэння баявога прыстасавання, у той час як сякера (sekera) — рабочага [**4**, с. 198]. У нашым даследаванні для абазначэння дадзенага прадмета будзем карыстацца тэрмінам, які прыняты ў сучаснай беларускай мове — сякера.

Матэрыялам для напісання артыкула паслужылі сякеры, якія захоўваюцца ў фондах Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка (далей — НПГКМЗ). Гэтыя розначасовыя знаходкі адрозніваюцца паводле ступені захаванасці, функцыянальных і марфалагічных прыкмет. Большая частка артэфактаў гэтага віду не паходзіць з дакладна датаваных культурных напластаванняў. Таму найбольш прыдатным спосабам датавання такіх экзэмпляраў уяўляецца іх тыпалагічны аналіз, а таксама пошук аналогій у апублікаваных матэрыялах, прысвечаных дадзенай праблеме.

Нягледзячы на існаванне ў старабеларускай мове двух тэрмінаў для абазначэння гэтага прыстасавання, мяжа паміж баявымі і рабочымі сякерамі вельмі няпэўная. Яшчэ М.Г. Рабіновіч адзначаў, што «напэўна не трэба рабіць асаблівага адрознення паміж баявымі і рабочымі сякерамі» [**5**]. У выпадку неабходнасці кожная рабочая прылада магла ператварацца ў вельмі небяспечную і грозную зброю.

Да спецыялізаваных баявых відаў сякер даследчыкі адносяць хіба толькі чаканы — прыстасаванні ў выглядзе клінападобнай у вертыкальным сячэнні металічнай пласціны з абухом ў выглядзе малаточка. Прызначэнне малаткоў — нанясенне дадатковых ўдараў па праціўніку, прабіванне яго даспехаў. Молатападобныя абухі чаканоў, акрамя баявога прызначэння, служылі своеасаблівай супрацьвагай у адносінах да

ляза і дапамагалі больш дакладнаму і разлічанаму ўдару. Між тым нельга поўнасцю адмаўляць і магчымасць выкарыстання дадзенай разнавіднасці сякер для гаспадарчых патрэб падчас ваенных паходаў [**1**, с. 33].

У археалагічнай навуцы вядомы спробы вылучэння універсальных прыкмет, паводле якіх можна было б адназначна аддзяліць баявыя сякеры ад рабочых экзэмпляраў. Найбольш удалую спробу вылучэння такіх крытэрыяў зрабіў А.Н. Кірпічнікаў, які прапанаваў падзяляць сякеры на баявыя і рабочыя паводле іх вагі і памераў. Так, па назіранні даследчыка, сярэдняя вага баявой сякеры — 200–300 г, у той час як рабочай — 600–800 г. У той жа час, па падліках А. Надольскага, сярэдняя вага раннесярэднявечнай баявой сякеры — 720 г. [**1**, с. 28; **6**]. Такім чынам, выкарыстанне нават дадзеных крытэрыяў не дазволіць адназначна падзяліць сякеры на групы паводле іх функцыянальнага прызначэння.

У сувязі з усім вышэйсказаным, у нашым даследаванні не будзе праводзіцца выразная мяжа паміж баявымі і рабочымі прыстасаваннямі, а казаць пра іх функцыянальнае прызначэнне будзем толькі на ўзроўні гіпотэзы.

У навуковай літаратуры няма таксама і адназначнага погляду на тыпалогію сякер. Для старажытнарускага часу найбольш папулярнымі з'яўляюцца схемы, распрацаваныя А.М. Кірпічнікавым (баявыя сякеры) [**1**], Б.А. Колчыным (рабочыя сякеры) [**7**; **8**; **9**] і А. Надольскім (баявыя сякеры) [**6**]. Для пазнейшага перыяду найбольш распаўсюджанай з'яўляецца схема М. Глосэка [**10**], створаная на польскім матэрыяле для баявых сякер, а таксама тыпалогія Г.М. Сагановіча [**11**], што засноўваецца на аналізе артэфактаў з беларускіх зямель.

Натуральна, што схемы, прапанаваныя дадзенымі аўтарамі, не статычныя. Найбольш удалыя з іх ствараюць падставы для ўдасканалення, удакладнення і пашырэння за кошт матэрыялаў, атрыманых падчас найноўшых археалагічных даследаванняў. У сувязі з гэтым узнікае неабходнасць павелічэння аб'ёму публікацый і ўвядзення ў навуковы зварот тых артэфактаў, якія застаюцца незапатрабаванымі айчыннымі навукоўцамі ў фондах і сховішчах розных устаноў і арганізацый. Толькі такім шляхам можна стварыць дастаткова надзейную схему эвалюцыі гэтага віду вырабаў на беларускіх землях.

Для таго, каб пазбегнуць блытаніны і неадназначнасці ў тэрміналогіі, звязанай з характарыстыкамі сякеры, прапануем выкарыстоўваць наступныя тэрміны для абазначэння яе структурных элементаў: шыйка, вусы, каптурок, абух, правушная адтуліна, барада, асада, вастрыё (**Мал. 1**).

Цяпер непасрэдна пяройдзем да апісання сякер з фондаў НПГКМЗ.

1. Вузкалязовы чакан з ледзьве зазначанай барадой, чатырохкутным малатком і выразнымі доўгімі вусамі на асадзе (НПГКМЗ КДФ2-631). Захаванасць прылады дрэнная: страчаны фрагменты вусоў, па ўсёй плошчы прадмета назіраюцца сляды глыбокай карозіі (**Мал. 3,** *4*).

Паводле сваіх марфалагічных прыкмет дадзены экзэмпляр вельмі блізкі да тыпу Id па тыпалогіі раннесярэднявечных баявых сякер А. Надольскага. Аўтар зазначае, што дадзены тып уяўляе сабой «чакан з дастаткова вузкім вастрыём, магчыма з барадой, з тупа абрэзаным чатырохкутным малатком і выразнымі вялікімі вусамі на асадзе». А. Надольскі абмяжоўвае час бытавання сякер дадзенага тыпу Х ст. [**6**].

Такія сякеры большасць даследчыкаў лічыць выключна баявымі прыстасаваннямі, на карысць чаго гавораць функцыянальныя асаблівасці (наяўнасць малаточка на абуху), а таксама іх адносна малая вага. Жалезныя чаканы з’явіліся на тэрыторыі Усходняй Еўропы ў складзе скіфскага ўзбраення ў VI ст. да н. э. А ў VIII–IX стст. чаканы ўжо былі распаўсюджаны на вялікай тэрыторыі ад Прыкам’я да Венгрыі, Чэхіі і Румыніі. Большасць навукоўцаў лічыць чакан зброяй усходняга паходжання. [**1**, с. 33].

2. Шырокалязовая сякера з дзвюма парамі вусоў і каптурком (НПГКМЗ КДФ2-624) (**Мал. 3,** *3*). Дадзенае прыстасаванне паходзіць з курганнага пахавання XI ст. каля Лукомля [**12**]. Захаванасць прадмета здавальняючая. У правушнай адтуліне прылады захаваліся рэшткі драўлянага тапарышча і металічнага кліна, які забяспечваў больш шчыльны кантакт тапарышча і сякеры. Такім чынам, гэты спосаб фіксацыі жалезнага аснавання сякеры быў вядомы на старажытнабеларускіх землях ужо як мінімум з XI ст., а не з XIII–XIV стст., як меркавалася раней [**13**].

Сякера можа быць аднесена да тыпу «М», паводле тыпалогіі, створанай знаўцам скандынаўскіх старажытнасцяў Я. Петэрсанам. Шырокалязовыя прылады дадзенага тыпу ў X–XI стст. становяцца адным з атрыбутаў нарманаў [**14**, с. 46–47]. Між тым сучасныя даследчыкі адзначаюць, што экзэмпляр, які захоўваецца ў фондах НПГКМЗ, непасрэдна не адносіцца да скандынаўскага імпарту з-за падоўжанай і вузкай шыйкі. На суседніх тэрыторыях сякеры дадзенага тыпу, якія адлюстроўваюць непасрэдны ўплыў паўночнаеўрапейскіх культурных традыцый, знойдзены толькі на помніках Смаленскай вобласці і Усходняй Латвіі [**15**, с. 26].

3. Бародападобная сякера з вусамі і каптурком. Прылада ў 1987 годзе была перададзена ў фонды НПГКМЗ з Гродзенскага гісторыка-археалагічнага музея, дзе была датавана XI–XIII стст. Сякера знаходзіцца ў дрэнным стане, страчана частка вусоў, выраб пашкоджаны моцнай карозіяй. У правушнай адтуліне захаваліся рэшткі драўлянага тапарышча (НПГКМЗ КП6-2870) (**Мал. 2**, *2*).

Дадзены экзэмпляр па сваіх марфалагічных характарыстыках найбольш блізкі да сякер тыпу IV паводле тыпалогіі А.М. Кірпічнікава, які датуе такія вырабы X–XII стст. [**1**, с. 36].

Згодна з меркаваннем А.М. Кірпічнікава, дадзены тып сякер мае старажытнарускае паходжанне, і менавіта з тэрыторыі Русі ён пачаў распаўсюджвацца на суседнія балцкія, скандынаўскія і польскія землі. Гэты тэзіс засноўваецца на тым, што найбольш раннія экзэмпляры артэфактаў дадзенага тыпу, якія былі выяўлены на старажытнарускай тэрыторыі, датуюцца X стагоддзем, у той час як у іншых рэгіёнах вырабы такога кшталту з’яўляюцца не раней за XI стагоддзе. Такім чынам, меркаванне пра старажытнарускае паходжанне гэтага тыпу сякер варта прызнаць дастаткова пераканаўчым.

Вельмі важнай прыкметай для вызначэння функцыянальнага прызначэння дадзенай сякеры з’яўляецца адтуліна на лязе. У большасці выпадкаў яна характарызавала прыстасаванне, якое выконвала баявыя функцыі. Адтуліна на лязе магла выкарыстоўвацца для падвешвання сякеры да сядла ці на сцяну, а таксама для прышпільвання да ляза спецыяльнага чахла [**1**, с. 29]. Усе гэтыя прыкметы характарызуюць сякеру як

паходную, у сувязі з чым з пэўнай доляй верагоднасці можна меркаваць аб яе баявым прызначэнні.

4. Бародападобная сякера з дзвюма парамі невялікіх вусоў і каптурком (НПГКМЗ КДФ5-6014). Дадзеная сякера была канфіскавана ў так званых «чорных» археолагаў, якія разбуралі курганы ў Верхнядзвінскім раёне Віцебскай вобласці, пасля чаго выраб быў перададзены ў фонды НПГКМЗ (**Мал. 2**, *1*).

Захаванасць прылады здавальняючая. Нягледзячы на глыбокую карозію, поўнасцю захавалася абушная частка разам з вусамі і каптурком. Невялікія пашкоджанні карозія нанесла толькі лязу. Такім чынам, дадзенае прыстасаванне захавала ўсе структурныя элементы, неабходныя для правядзення тыпалагічнага аналізу.

Наяўнасць барады, вусоў і каптурка даюць падставы для суаднясення дадзенай сякеры з тыпам IV паводле тыпалогіі А.М. Кірпічнікава, які датуецца X–XII стст. [**1**, с. 36]. Наяўнасць на лязе адтуліны, а таксама вельмі малыя памеры сякеры дазваляюць меркаваць аб выкарыстанні яе ў якасці прадмета ўзбраення.

5. Бародападобная сякера з каптурком і вусамі. У сувязі з глыбокай карозіяй дадзенай прылады вусы амаль не захаваліся (**Мал. 2**, *3*).

Паводле сваіх марфалагічных прыкмет дадзеная прылада можа быць аднесена да тыпу IV па тыпалогіі А.М. Кірпічнікава. Адпаведна яе даціроўка — X–XII стст. [**1**, с. 36]. Наяўнасць на лязе адтуліны, а таксама невялікія памеры вырабу дазваляюць меркаваць пра баявы характар прылады.

6. Бародападобная сякера з доўгай шыйкай і дзвюма сіметрычнымі парамі вусоў. Захаванасць прылады здавальняючая (НПГКМЗ КП2-1263) (**Мал. 3**, *2*). Сякера з'яўляецца выпадковай знаходкай і паводле акта прыёму датуецца XIII–XIV стст.

Аднак паводле сваіх марфалагічных характарыстык яна можа быць аднесена да тыпу VI па тыпалогіі А.Н. Кірпічнікава, які датуецца ў межах XI–XII стст.

Дадзены тып мае цэнтральна- і паўночнаеўрапейскае паходжанне. На гэтых тэрыторыях такія прылады былі вядомыя з VIII–IX стст. Большасць выяўленых на старажытнарускіх землях сякер дадзенага тыпу маюць рабочае прызначэнне. Да

тыпу рабочых прылад можа быць аднесены і полацкі экзэмпляр, хаця не выключана і яго баявое прызначэнне [**1**, с. 38].

7. Барадападобная сякера з апушчаным лязом і вусамі на асадзе (НПГКМЗ КДФ5-5531). Захаванасць прылады вельмі дрэнная. У выніку глыбокай карозіі на адным баку страчаны вусы, моцна пацярпела лязо (**Мал. 3**, *1*).

Прылада была выяўлена падчас археалагічнага даследавання тэрыторыі Гарадзішча старажытнага Полацка ў 2007 годзе. Статыграфічна прылада датуецца XI–XIII стст.

Дадзенае прыстасаванне можа быць аднесена да тыпу VI згодна тыпалогіі А.М. Кірпічнікава. Вырабы такога кшталту даследчык датуе XI–XII стст., што цалкам адпавядае дадзеным стратыграфіі [**1**, с. 38].

8. Вузкалязовая сякера з каптурком і злёгку апушчаным лязом. (НПГКМЗ КП5-2720/158). Захаванасць сякеры здавальняючая (**Мал. 2**, *4*). Прылада была знойдзена падчас археалагічных даследаванняў на Верхнім замку і перададзена ў фонды НПГКМЗ Г.В. Штыхавым у 1970 годзе.

Дадзены экземпляр найбольш блізкі да тыпу VIII паводле тыпалогіі А.М. Кірпічнікава. Гэты тып аб'ядноўвае вузкалязовыя калунавідныя сякеры, якія блізкія да тыпу III, аднак адрозніваюцца ад яго канструкцыйнымі асаблівасцямі абуха. Вырабы такога кшталту датуюцца даследчыкам XI–XIII стст. Г.В. Штыхаў з дапамогай дэндрахраналагічнага метаду датуе прыладу 20–30 гадамі XIII ст. [**1**, с. 39; 16, с. 21].

Мяркуючы па тым, што калунападобныя сякеры дастаткова рэдка выкарыстоўваліся ў якасці прадмета ўзбраення, з пэўнай доляй верагоднасці можна меркаваць аб выкарыстанні дадзенага экземплэра ў якасці рабочай прылады.

9. Вузкалязовая сякера без абуха (НПГКМЗ КП8-4383/158). Захаванасць сякеры дрэнная. Страчана абушная частка прылады, што значна ўскладняе працэс тыпалагічнага аналізу дадзенага вырабу (**Мал. 2**, *5*).

Сякера была перададзена ў фонды НПГКМЗ у 1988 г. Гэтая прылада была выяўлена падчас археалагічнага вывучэння культурных напластаванняў Верхняга замка ў г. Полацку. Кіраўнік раскопак Г.В. Штыхаў датуе сякеру 60–70 гг. XIII ст. [**16**, с. 58].

Адсутнасць абушной часткі значна ўскладняе працэс тыпалагічнага аналізу дадзенага прыстасавання. Мяркуючы па форме ляза, найбольш верагодна, што сякера магла адносіцца да тыпу VIII па тыпалогіі А.М. Кірпічнікава [**1**, с. 39]. Зыходзячы з таго, што вузкалязовыя, калунападобныя сякеры ў якасці спецыяльнага віду ўзбраення выкарыстоўваліся толькі да XI ст., наш экземпляр можна лічыць рабочай прыладай.

10. Барадападобная сякера з апушчаным лязом, каптурком і вузкай высокай шыйкай (НПГКМЗ КП5-2720/157). Захаванасць прылады здавальняючая (**Мал. 3**, *5*).

Сякера была перададзена ў фонды НПГКМЗ у 1970 г. Яна была выяўлена падчас археалагічнага вывучэння культурных напластаванняў Верхняга замка ў г. Полацку, якое праводзілася экспедыцыяй ІГ АН БССР. Кіраўнік раскопак Г.В. Штыхаў датуе гэтую сякеру 20–30 гадамі XIII ст. [**16**, с. 21].

Паводле сваіх марфалагічных прыкмет дадзены экзэмпляр можа быць аднесены да тыпу IV Б згодна пашыранай М.А. Плавінскім тыпалогіі А.М. Кірпічнікава. М.А. Плавінскі сякеры гэтага тыпу датуе ў шырокім дыяпазоне ад XI да XIV стагоддзя. Магчыма, што дадзены тып сякер быў характэрны менавіта для заходніх зямель старажытнай Русі [**13**]. Хутчэй за ўсё прылада мела рабочае прызначэнне.

11. Сякера з шырокім асіметрычным апушчаным лязом і магутным каптурком на абуху. (НПГКМЗ КП5-2535). Захаванасць прылады здавальняючая (**Мал. 4**, *2*).

Сякера была выпадкова знойдзена ў в. Баранава Грамоўскага с/с (сёння мікраараён Полацка Грамы). Паводле акта прыёму прылада датуецца XVI ст.

Тыпалагічную прыналежнасць сякеры вызначыць дастаткова складана. Падобная да нашай прылада была выяўлена ў слаі сярэдзіны XIV ст. у Ноўгарадзе. Б.А. Колчын аднёс яе да сякер індывідуальных формаў, якія не ўпісваюцца ў межы створанай ім тыпалогіі наўгародскіх рабочых сякер [**7**, с. 123].

Такім чынам, з-за адсутнасці іншых аналогій мусім пагадзіцца з меркаваннем Б.А. Колчына і прадатаваць дадзеную сякеру XIV ст. Магчыма, наш экзэмпляр з'яўляецца больш познім варыянтам рабочых сякер тыпу VIII па

А.М. Кірпічнікаву, пра што гаворыць наяўнасць каптурка і лязо спецыфічнай формы.

12. Барадападобная сякера з апушчаным лязом і крыху адцягнутай ў бок тапарышча асадай (НПГКМЗ КДФ3-1340). Захаванасць прылады дрэнная. На адным з яе бакоў праглядаецца гравіроўка ў выглядзе зубцоў, размешчаных уздоўж вертыкальнай паласы перпендыкулярна абуху (**Мал. 4**, *3*). Сякера з'яўляецца выпадковай знаходкай і паводле акта прыёма датуецца XVI ст.

Вырабы такога кшталту могуць быць аднесены да тыпу VIIIa згодна тыпалогіі познесярэднявечных сякер М. Глосэка. Аўтар адносіць да гэтага тыпу сякеры з выцягнутым у бок тапарышча абухом, з выразнай шыйкай, вузкім і доўгім лязом са зрэзанай барадой. М. Глосэк датуе прылады такога кшталту XIV–XVI стст. [**10**, с. 39].

Наш экзэмпляр упісваецца таксама і ў межы тыпу V паводле тыпалагічнай схемы, распрацаванай Г.М. Сагановічам для рабочых сякер XIV–XVIII стст. Даследчык адзначае, што падобныя вырабы бяруць пачатак яшчэ ў XII–XIII стст. (магчыма, маюць генетычную сувязь з сякерамі тыпу V A па А.М. Кірпічнікаву). Між тым, ідэнтычныя нашаму вырабы з'яўляюцца пазней — у XIV–XVII стст. [**11**, с. 262]. Такім чынам, наш экзэмпляр можа быць датаваны ў шырокім храналагічным дыяпазоне ад XIV да XVII стагоддзя.

Большасць сякер дадзенага тыпу маюць рабочае прызначэнне, але такая форма была характэрна і для баявых прыстасаванняў. Наяўнасць на нашым экзэмпляры арнаментацыі можа гаварыць на карысць таго, што перад намі прадмет узбраення.

13. Сякера з шырокім сіметрычным лязом, магутнай правушнай адтулінай амаль прамавугольнай формы і моцна сплюснутым малатком на асадзе. Захаванасць сякеры добрая. На адным баку асады вертыкальна размешчаны надпіс у выглядзе трох лацінскіх літар «MWD» (**Мал. 4**, *1*). Сякера была выпадкова знойдзена мясцовым жыхаром на дне возера Суя каля в. Гомель Полацкага раёна.

Наяўнасць на абуху малатка дазваляе аднесці дадзеную прыладу да тыпу чаканоў. Міжтым яе дастаткова складана

адназначна аднесці да аднаго з тыпаў познесярэднявечных прылад такога кшталту. На нашу думку, дадзены экземпляр найбольш блізкі да тыпу If па тыпалогіі М. Глосэка. Сякеры гэтага тыпу на тэрыторыі Польшчы і Чэхіі датуюцца ў межах XIV–XVIII стст. [**10**, с. 29].

Моцна спрацаваны малаток на асадзе можа сведчыць пра выкарыстанне сякеры ў якасці гаспадарча-універсальнай ці рамеснай прылады. Міжтым нельга выключаць і магчымасць яе баявога выкарыстання.

14. Сякера з сіметрычным шырокім лязом, якое аддалена нагадвае месяц са скругленымі рожкамі, клінападобнай правушнай адтулінай і двума сіметрычнымі трохвугольнымі выступамі на асадзе (НПГКМЗ КП17-19372). Захаванасць сякеры здавальняючая (**Мал. 5**, *2*). Прылада была выяўлена экспедыцыяй ІГ НАН Беларусі пад кіраўніцтвам Д.У. Дука ў 2001 годзе на тэрыторыі былога Запалоцкага пасада старажытнага Полацка.

Паводле сваіх марфалагічных асаблівасцяў дадзеная сякера набліжаецца да тыпу XIII паводле класіфікацыі М. Глосэка. Падобныя прылады былі распаўсюджаны ў Цэнтральнай, Заходняй і Паўночнай Еўропе ў XIII–XIV стст. [**10**, с. 53].

На думку Д.У. Дука, экзэмпляр з Полацка адрозніваецца ад іншых еўрапейскіх узораў артэфактаў дадзенага тыпу большай вышынёй асады, што надае вырабу ўзнёсласць. Па меркаванні даследчыка, сякера магла ўжывацца ў Полацку ў XV–XVI стст. [**17**, с. 167]. Відавочна, што яна мела баявое прызначэнне.

15. Шыракалязовая сякера з плоскім абухом. Захаванасць прылады добрая (**Мал. 5**, *1*). Сякера была выяўлена падчас археалагічных раскопак, што праводзіліся на тэрыторыі Вялікага пасада ў 2003 годзе пад кіраўніцтвам Д.У. Дука.

Дадзены выраб прадстаўляе сабой узор цяжкіх вытворчых прылад працы, прызначаных для працаёмкіх і грубых аперацый. Полацкі экзэмпляр вельмі блізкі да тыпу IV згодна з тыпалогіяй рабочых сякер Г.М. Сагановіча. Такая форма была распаўсюджанай у XVIII ст. і стала прататыпам сучасных рабочых сякер [**11**, с. 262–263; **17**, с. 162; **18**, мал. 60].

Калекцыя сякер X–XVIII стст. у фондах НПГКМЗ штогадова папаўняецца за кошт выпадковых знаходак і экзэмпляраў,

што выяўляюцца ў ходзе археалагічных раскопак. Між тым, значная колькасць прадметаў, якія ўжо захоўваюцца ў фондах НПГКМЗ, не мае дакладнай дацiроўкі і тэрытарыяльнай прывязкі. У сувязі з гэтым найбольш прыдатным спосабам устанаўлення адноснай храналогіі сякер з фондаў НПГКМЗ уяўляецца тыпалагічны метад, а таксама пошук аналогій нашым не датаваным вырабам у апублікаваных матэрыялах археалагічных даследаванняў іншых тэрыторый.

Зыходзячы з марфалагічных характарыстык, большасць сякер з фондаў запаведніка можа быць суаднесена з асноўнымі тыпамі, ужо вылучанымі спецыялістамі-археолагамі для пэўных храналагічных адрэзкаў. У сувязі з гэтым стварэнне самастойнай тыпалогіі полацкіх сякер ці вылучэнне спецыфічных для Полацка тыпаў на аснове ўжо распрацаваных схем не ўяўляецца магчымым. Полацкія матэрыялы даюць падставы толькі для правядзення параўнаўчага аналізу артэфактаў з розных тэрыторый, што можа аказаць вялікую дапамогу пры стварэнні абагульняючых тыпалагічных схем дадзенай групы прадметаў для розных гістарычных перыядаў.

Між тым, у ходзе праведзенага намі тыпалагічнага аналізу ўдалося ўстанавіць, што ў полацкай калекцыі захоўваюцца як дастаткова распаўсюджаныя, так і вельмі рэдкія тыпы сякер. Так, шырокалязовая сякера тыпу «M» (па тыпалогіі Я. Петэрсана) рэпрэзентуе сабой узор вырабаў, зробленых пад непасрэдным уздзеяннем паўночнаеўрапейскіх (скандынаўскіх) культурных традыцый. Аб выкарыстанні на Полацкай зямлі зброі ўсходняга паходжання, што атрымала шырокае распаўсюджванне і на старажытнарускіх землях, сведчыць чакан X ст., які знаходзіцца ў экспазіцыі Полацкага краязнаўчага музея. Да вельмі рэдкіх на беларускіх землях знаходак элементаў рыцарскай зброі варта аднесці і сякеру тыпу XIII паводле класіфікацыі М. Глосэка, якая была выпадкова знойдзена на тэрыторыі Запалоцця.

Найбольш распаўсюджанымі сякерамі на старажытных беларускіх землях з’яўляліся прылады тыпу IV (па тыпалогіі А.Н. Кірпічнікава). У полацкай калекцыі дадзены тып прадстаўлены 3 экзэмплярамі, што складае самую вялікую групу прылад, датаваных старажытнарускім часам.

Такім чынам, у фондах НПГКМЗ захоўваецца значная колькасць рэдкіх і каштоўных для даследчыкаў сякер X–XVIII стст. Далейшае іх вывучэнне на аснове найбольш прагрэсіўных метадалагічных падыходаў дазволіць пашырыць нашыя веды аб дадзенай групе прадметаў, што акажа неацэнную дапамогу пры напісанні навуковых пашпартоў і складанні якаснага апісання музейных прадметаў.

## Спіс літаратуры

**1.** Кирпичников, А.Н. Древнерусское оружие. Выпуск 2. Копья, сулицы, боевые топоры, булавы, кистени IX–XIII вв. // Археология СССР. Свод археологических источников. Е1-36. / Под редакцией Б.А. Рыбакова. — Л.: Наука, 1966. — С. 5–146.

**2.** Oakeshott Ewart R. The Archaeology of Weapons. Arms and Armour from Prehistory to the Age of Chivalry. — London: Dover Publications, 1996. — 384 p.

**3.** Кирпичников, А.Н. Военное дело на Руси в XIII–XV вв. — Л.: Наука, 1976. — 105 с.

**4.** Бохан, Ю.М. Вайсковая справа ў Вялікім княстве Літоўскім у другой палове XIV — канцы XVI ст. / Ю.М. Бохан. — Мінск: Беларуская навука. 2008. — 449 с.

**5.** Рабинович, М.Г. Из истории русского оружия IX–XV вв. // Труды института этнографии имени Н.Н. Миклухо-Маклая. Новая серия Т. 1. — М.-Л.: Изд-во АН СССР, 1947. — С. 65–97.

**6.** Nadolski A. Studia nad uzbrojeniem polskim w X, XI i XII wieku // Acta archaeologica universitatis lodziensis. — 1954. — Nr. 3. — S. 11–241.

**7.** Колчин, Б.А. Железообрабатывающее ремесло Новгорода Великого // Материалы и исследования по археологии СССР, № 65: Труды новгородской археологической экспедиции. Т 2. / Под ред. Б.А. Колчина и А.В. Арциховского. — М: Изд-во АН СССР, 1959. — С. 7–120.

**8.** Колчин, Б.А. Обработка дерева // Древняя Русь. Город, замок, село. — М.: Наука, 1985. — С. 254–260.

**9.** Колчин, Б.А. Хронология Новгородских древностей // Новгородский сборник. — М.: Наука, 1982. — С. 156–177.

**10.** Głosek, M. Późnośredniowieczna broń obuchowa w zbiorach polskich. — Warszawa — Łódź: Instytut Archeologii i Etnologii Polskiej Akademii Nauk, 1996. — 143 s.

**11.** Археалогія Беларусі: У 4 т. Т. 4. Помнікі XIV–XVIII стст. / В.М. Ляўко, М.Ф. Гурын, Ю.А. Заяц і інш.; Пад рэд. В.М. Ляўко і інш. — Мн.: Беларуская навука, 2001. — 597 с.

**12.** Штыхов, Г.В. Раскопки в Лукомле в 1966–1968 годах // Древности Белоруссии (Доклады и конференции по археоло-

гии Белоруссии) / Под редакцией В.Д. Будько, П.Ф. Лысенко, Л.Д. Поболя, М.М. Чернявского. — Мн.: Изд-во АН БССР, 1969. — С. 316–351.

**13.** Плавінскі, М. Сякеры другой паловы XI–XIII стст. з раскопак Мінскага замчышча // Acta archaeologica Albaruthenica. — 2007. — Вып. 2. — С. 68–82.

**14.** Petersen, J. De norske vikingesverd (en typologisk-kronologisk studie over vikingetidens vaaben). — Kristiania: I kommission hos Jakob Dybward, 1919. — 228 s.

**15.** Дернович, С.Д. Скандинавские древности эпохи викингов в Беларуси / С.Д. Дернович. — Мн.: Бел. наука, 2006. — 86 с.

16. Штыхов, Г.В. Древний Полоцк IX–XIII вв. — Мн.: Наука и техника, 1975. — 136 с.

**17.** Дук, Д.У. Полацк XVI–XVIII стагоддзяў: нарысы тапаграфіі, гісторыі матэрыяльнай культуры і арганізацыі жыццёвай прасторы насельніцтва беларускага горада / Д.У. Дук. — Наваполацк: ПДУ, 2007. — 268 с.

**18.** Дук, Д.У. Справаздача аб археалагічных раскопках у горадзе Полацку ў 2002 годзе: у 2-х ч. / Д.У. Дук // Архіў ІГ НАНРБ. — Воп. 1. — Спр. 2046. — Ч. 1: Тэкст і ілюстрацыі.




**Мал. 1.** Абазначэнні структурных элементаў сякеры
(паводле М. Глосэка).




**Мал. 2.** Сякеры X–XIII стст. з фондаў НПГКМЗ:
1–3 — тып IV; 4–5 — тып VIII (па тыпалогіі А.М. Кірпічнікава).



**Мал. 3.** Сякеры X–XIII стст. з фондаў НПГКМЗ:
1–2 — тып VI (па А.М. Кірпічнікаву); 3 — тып «М» (па Я. Петэрсану);
4 — тып Id (па А. Надольскаму); 5 — тып IV Б (па М.А. Плавінскаму).



**Мал. 4.** Сякеры XIV–XVIII стст. з фондаў НПГКМЗ:
1 — тып If (па М. Глосэку); 2 — сякера індывідуальнай формы
(па Б.А. Колчыну); 3 — тып VIIIa (па М. Глосэку).




**Мал. 5.** Сякеры XIV–XVIII стст. з фондаў НПГКМЗ (малюнкі паводле Д.У. Дука): 1 — тып IV (па Г.М. Сагановічу); 2 — тып XIII (па М. Глосэку).

# Абрусы з музейнага збору НПГКМЗ: уступны артыкул да тэматычнага каталога

*Пракоф'ева Ю.С.*

На Віцебшчыне, як і паўсюль на Беларусі, у мінулым былі шырока распаўсюджаны ўзорыстыя тканіны хатняга вырабу: адзенне, ручнікі, абрусы, посцілкі. У сялянскім асяроддзі іх выраблялі ў хатніх умовах і ўжывалі для ўласных патрэб. У мастацкіх адносінах традыцыйныя тканіны Віцебшчыны складаюць адметную групу, выразныя асаблівасці якіх вылучаюць іх сярод народнага тэкстылю іншых рэгіёнаў Беларусі. У віцебскіх вёсках ужо амаль не ткуць, і можна прывесці толькі адзінкавыя прыклады індывідуальнага занятку ў нашы дні гэтым традыцыйным рамяством. А вышыванне і вязанне існуюць як віды сучаснага рукадзелля і ўжо даўно страцілі свае адметныя арнаментальныя і мастацка-тэхналагічныя традыцыі, якія былі ўласцівы сялянскай культуры рэгіёна на пачатку XX стагоддзя [**11**, с. 836].

Традыцыйная культура беларусаў, як і іншых народаў свету, увасабляла ўсё атачэнне чалавека як знакавую сістэму. Прыродныя з'явы і сацыяльныя нормы, моўныя тэксты і матэрыяльныя прадметы, міфы, музыка ды іншыя з'явы культуры мелі адзінае поле значэнняў, у якасці якога выступала карціна свету.

Улучэнне прадметных сімвалаў у рытуальны сцэнар абрадаў жыццёвага цыклу чалавека, каляндарнага кола і гаспадарчай магіі дае падставы для вызначэння асноўных пазіцый семантычнай прасторы традыцыйнай культуры беларусаў. Сферы выкарыстання прадметаў і іх характарыстыкі заўсёды перасякаюцца і дапаўняюць адна адну. Сімволіка рэчы ў семантычнай прасторы культуры як бы «ачалавечвае» Сусвет і ў той жа час «касмізуе» жыццё чалавека. Варта адзначыць, што ўсе галоўныя моманты нараджэння, жыцця, смерці і памінання чалавека маркіруюцца абрусам, якім засцілаюць стол, — адным з найбольш рытуалізаваных і шанаваных прадметаў у традыцыйнай культуры. Паводле прасторавай характарыстыкі інтэр'ера, стол стасуецца з верхам, усходам і, адпаведна, святлом (трывалае месцазнаходжанне стала — покуць, чырвоны

кут). Падчас абрадавай трапезы стол набывае падкрэсленую функцыю сакральнага цэнтра, своеасаблівага ахвярніка, калі пачастунак прызначаецца не толькі прадстаўнікам чалавечай, але і касмічнай супольнасці [**8**, с. 489–490].

Найбольш архаічнай функцыяй абруса з'яўляецца выдзяленне ачышчанага і асвячонага месца для правядзення рытуалу (старэйшая за абрус функцыя любой распасцёртай і засланай тканіны). Абрусам засцілаліся магілы на Радаўніцу: «у гэты дзень хадзілі пасля абеду на могілкі, паміналі нябожчыкаў. Могілкі абмяталі. Магілу засцілалі скацеркай і абедалі» [**1**]. Шырока распаўсюджаным на Падзвінні быў звычай варожбы на Святкі па сене, пакладзеным пад абрус, аб ураджаі збожжа ў новым годзе. З-пад настольніка выцягвалі сцяблінны, даўжыня якіх мусіла спрагназаваць даўжыню будучага лёну, а то і жыцця кожнага з удзельнікаў варажбы. На навагоднія святы гаспадыня карміла курэй на абрусе, каб прывучыць іх да сваёй хаты. «Перад Пасхай вялікі пост. У чацьвер людзі чацьвяргуюць, а ў пятніцу і суботу нічога не ядуць. Ноччу з суботы на нядзелю ідуць на ўсеночную. Лічуць, што маць нарадзіла Ісуса ў хлеве і таму на першы дзень Пасхі на стол кладуць сена, накрываюць яго скацеркай, а зверху кладуць яйкі, хлеб. І пасля таго як пад'ядуць ідуць у госці» [**2**]. У дзень зажынак стол накрывалі чыстым абрусам на гумне, абрус рассцілалі перад ім або вешалі на браме гумна [**3,** с. 109].

Абрус абавязкова ўваходзіў у пасаг нявесты: «эта ж нада было не толькі ручнікоў, посцілак, скацёрак наткаць, а яшчэ гатовіла дзеўка фіранкі, прасціны, шмат чаго гатовіла, каб замуж узялі» [**9**]. Новым абрусам накрывалі стол, калі прымалі сватоў, у «зборны вечар» перад вянчаннем, калі прыязджалі ў дом маладога пасля вянца [**10**, с. 109]. Перамены страў падчас вясельнага піру ў старажытнасці прадугледжвалі і перамену абрусаў. Паводле некаторых звестак, перамены страў рабілі, здымаючы адзін за адным абрусы, што былі ў шмат слаёў пасланыя на стале [**12**, с. 130].

На сённяшні дзень, абрусаў, якія ўвайшлі ў дадзены каталог, на пастаянным захоўванні налічваецца 56 (з іх 2 кавалкі тканіны на абрус, 1 фрагмент настольніка). 9 абрусаў знаходзіцца ў экспазіцыі Музея традыцыйнага ручнога

ткацтва Паазер'я, 3 — у экспазіцыі Краязнаўчага музея, 44 — захоўваюцца ў фондах НПГКМЗ.

Храналагічна выраб абрусаў з калекцыі ахоплівае перыяд ад 1900 да 1970-х гадоў, акрамя КП14-10613, які датуецца 1887 годам.

У калекцыі прадстаўлены абрусы наступных раёнаў Віцебскай вобласці: Полацкага (16 адзінак), Міёрскага (10), Докшыцкага (7), Глыбоцкага (6), Шаркаўшчынскага (6), Пастаўскага (5), Верхнядзвінскага (2), Расонскага (1). Таксама два абрусы з Валожынскага і адзін з Капыльскага раёнў Мінскай вобласці.

Паводле метрычнай характарыстыкі абрусаў са збору НПГКМЗ, было выяўлена наступнае: у канцы XIX — пачатку XX стагоддзяў абрусы рабілі доўгімі — да 214,0 см. Шырыня вырабу вагалася ад 108,5 см да 183,0 см (па шырыні стала, які быў разлічаны на вялікую сям'ю). У пасляваенны час форма абрусаў змянілася: яны сталі меншымі і квадратнымі.

Калі казаць пра канструктыўныя асаблівасці крою, абрус складаецца звычайна з дзвюх полак, уяўляючы сабою два злучаныя ручнікі, працягваючы, такім чынам, лінію развіцця папярэдніх формаў, уключаючы іх тэхналагічныя, семантычныя і функцыянальныя параметры. Гэта канструкцыя маркіруе ролю абруса — распасцірацца, пакрываць, ствараць асобую прастору з яе старой якасцю — даўжынёй, і з новай — шырынёй [**12**, с. 129]. Адрозненне формы ручніковых палотнаў — іх архаічная даўжыня, працягласць, магчымасць сімвалізаваць рух у прасторы і часе, а таксама быць повяззю розных прастораў у шырокім сэнсе. Менавіта шырыню, як новую семантычную якасць, але спадкаемцу старых формаў, стварае і адзначае спосаб з'яднання двух «ручнікоў» у абрусе праз мярэжку-«размежаванне». Варта звярнуць увагу і на той факт, што месцы злучэння полак у абрусах маркіраваныя альбо чырвонай ніткай, альбо плеценымі ці вязанымі карункамі. Трэба вызначыць, што абрусы, якія рабіліся такім чынам, адносна позняя з'ява ў культуры XIX стагоддзя. Тым не менш, прынцыпы іх канструявання захавалі на інтуітыўным узроўні універсальны прынцып архаічных тэхналогій, які апынуўся фактарам кансервацыі культурных традыцый.

Ручное ўзорыстае ткацтва — адно з найцікавейшых тэхналагічных вынаходніцтваў чалавека. Навучыўшыся выкарыстоўваць пластычныя асаблівасці валакністых раслінных культур, ён атрымаў магчымасць выраблячь тканіну. Калекцыя ўтрымлівае 28 тканых абрусаў. Для настольнікаў «на кожны дзень», «абыдзенных» выкарыстоўвалі зрэбны лён, святочныя абрусы ткаліся з тонкай кужэльнай пражы.

Пры вырабе абрусаў выкарыстоўваліся наступныя тэхнікі: простае ткацтва («упроста») — двухнітовае, шматнітовае ткацтва (трох-, чатырохнітовае адна- ці двухуточнае, пяцінітовае, у шэсць, восем, дванаццаць, шаснаццаць нітоў); бранае (аднаўточнае — паўажурныя і фактурныя тканіны — і двухуточнае); пераборнае ткацтва (перабор пад слупок двух- ці аднабаковы), двухбаковы перабор «пад палатно», двухбаковы перабор «пад паркі», перабор з пупламі; закладное; выбарнае; двухасноўнае ткацтва [**6,** с. 495].

Адной з найбольш старажытных і распаўсюджаных тэхнік ткацтва з’яўляецца чатырохнітовае, узоры якой шырока прадстаўлены ў калекцыі НПГКМЗ. Вылучаюць аднаўточнае ткацтва, што дазваляла атрымліваць тканіну палатнянага, рыпсавага, саржавага, паўажурнага і ячэістага перапляцення. Ільняныя абрусавыя тканіны ткалі ўжо ў канцы XIX стагоддзя [**14,** с. 68]. Найбольш пашыраным у XX стагоддзі на Віцебшчыне было двухуточнае чатырохнітовае ткацтва. Паўсюдна шахматныя ўзоры народных тканін мелі назвы: «дымка», «у дымку», а яе разнавіднасці называлі «простая дымка», «ламаная дымка». Тканіны гэтага тыпу таксама называлі ў адпаведнасці з іх узорамі: «у кружочкі», «у кругі», «шашкі», «клеткі», «шклянкі». У Лепельскім раёне чатырохнітовыя ўзоры мелі назвы: «касая дымка» ці «арцабы з мандылямі» [**11,** с. 840]. Для іх характэрны рэльефны шашачны арнамент, які ствараецца ніцямі дадатковага ўзорнага ўтку, пракінутага праз усю шырыню тканіны (ён насцілаецца асобнымі ўчасткамі папераменна па правым і левым баку). Разнастайнасць узораў дасягалася рознымі варыянтамі накідання ніцей асновы ў ніты і парадкам ходу на панажах.

Аднаўточны варыянт васьмінітовага ткацтва таксама бытаваў на тэрыторыі Беларускага Падзвіння. Ён дазваляў

вырабляць тканіны саржавага перапляцення з простым геаметрычным арнаментам у выглядзе квадратаў, прамавугольнікаў, ромбаў [**7,** с. 539].

Сярод традыцыйных тэхнік беларускага ўзорыстага ткацтва ў канцы XIX — пачатку XX стагоддзяў найбольш распаўсюджанай была браная. Менавіта ёй аддавалася перавага пры аздабленні святочнага адзення —жаночых кашуль, фартухоў, намітак, а таксама ручнікоў-набожнікаў, абрусаў. Народныя майстрыхі віртуозна валодалі рознымі спосабамі бранага ткацтва і выкарыстоўвалі іх, як для стварэння яркіх рэльефных бардзюраў, насычаных чырвоным колерам, з выразным геаметрычным арнаментам (бранае двухуточнае ткацтва), так і для вырабу вельмі тонкіх белых тканін з ажурападобным ці фактурным ячэйкавым дэкорам (бранае аднаўточнае ткацтва) [**10,** с. 64]. Як па ўзору, так і па фактуры яны падобны да чатырохнітовых, бо рабіліся на маленькай колькасці пруткоў — адным, двух або трох. У пасляваенны час сталі ткаць браныя абрусы на вялікай колькасці дошчачак. Самы распаўсюджаны узор — «вянок»: сярэдзіна была затканая раслінным арнаментам, які размяшчаўся ў выглядзе эліпса, узор паўтараўся па краях. Асаблівасць гэтых абрусаў заключаецца ў тым, што іх ткалі каляравымі ніткамі — блакітнымі, жоўтымі на белым тле [**10,** с. 65].

У тэхніцы пераборнага ткацтва, якое прыйшло на змену старажытнаму бранаму і шматнітоваму ткацтву, на Віцебшчыне выраблялі пераважна посцілкі, але сустракаюцца і тканыя абрусы. Пераборнае ткацтва мае шмат разнавіднасцей, многія з якіх вядомы на Беларусі: перабор «пад палатно», перабор «пад паркі», аднабаковы перабор з прыціскной асновай, двухбаковы перабор з прыціскной асновай, перабор з выбарам, пяцельны перабор. Найбольш познія з іх — аднабаковы і двухбаковы віды перабору з прыціскной асновай вызначаюцца высокай дэкаратыўнасцю, магчымасцю перадаваць складаныя формы арнаменту і разнастайныя кампазіцыйныя рашэнні. Асаблівае развіццё і распаўсюджанне гэтых тэхнік ткацтва прыйшлося на сярэдзіну — другую палову XX стагоддзя [**6,** с. 496].

Двухбаковы перабор з прыціскной асновай сваёй тэхнікай выканання падобны на бранае двухуточнае ткацтва. Узор, таксама як і ў браным ткацтве, перабіраецца дошчачкай-бральніцай,

толькі не па ліку нітак асновы, а па ліку пучкоў нітак асновы, раздзеленых «страчавымі» ніткамі. Атрыманы зеў, як і ў браным ткацтве, фіксуецца паўнітамі («ніткамі») або доўгімі шнурамі («матузамі»), а ўзорны ўток пракідваецца чаўнаком праз усю шырыню тканіны [**10,** с. 66].

Адной з рэгіянальных асаблівасцей народнага тэкстылю Віцебшчыны з’яўляецца шырокая распаўсюджанасць тут ажурных тканін, якія маюць назву «рэдчыкі». Празрыстае, ажурнае, нібы карункі, палатно, выкананае на ткацкім станку непасрэдна падчас ткання, ужывалі ў сялянскім побыце для настольнікаў, полагаў, фіранак «у кут» і на вокны. Нярэдкасць на Віцебшчыне і цалкам ажурныя без арнаменту ручнікі-набожнікі, якія сустракаюцца ў Гарадоцкім і іншых раёнах. Найбольш ажурных тканін канца XIX — першай паловы XX стагоддзяў даследчыкамі было зафіксавана ва ўсходніх раёнах вобласці: Аршанскім, Сенненскім, Бешанковіцкім, Лёзненскім, Гарадоцкім, Талачынскім, Дубровенскім. У заходняй частцы Віцебшчыны ажурныя тканіны сустракаліся радзей [**5,** с. 89].

Узор ажурнага абруса будаваўся на чаргаванні ўчасткаў палатнянага перапляцення і буйных ажурных мярэжак, што размяшчаліся ў гарызантальным напрамку. Па тэхніцы вырабу гэта звычайнае палатно, выкананае на двух нітах. Для ўтварэння гарызантальных дарожак пры тканні ў адкрыты зеў закладвалі вузкую лінейку, за якой працягвалі ткаць звычайнае палатно, прыбіваючы да яе ніці ўтку. Наткаўшы патрэбную колькасць палатна, лінейку вымалі і зноў закладвалі ў зеў. Перавіўку ніцей у дарожках рабілі іголкай пасля зняцця тканіны са станка. У 40-я гады XX стагоддзя ажурныя тканіны страцілі сваё ўтылітарнае прызначэнне, але нейкі час яшчэ ўжываліся ў сялянскім быце ў якасці дэкаратыўных ручнікоў, абрусаў, посцілак [**5,** с.89].

Ажурнае ткацтва знікае з сялянскага рамяства разам з ільном, які сяляне перасталі вырошчваць для ўласных патрэб з утварэннем на вёсцы калектыўных гаспадарак (ва ўсходніх раёнах Віцебшчыны). Таксама ў 1930-я гады на вёсцы назіраецца заняпад шматнітовага ткацтва, вырабу простага палатна, узорыстых ручнікоў, настольнікаў, тканін для адзення [**11,** с. 844].

Адным з відаў беларускага народнага мастацтва з’яўляецца вязанне. Вязанне — складаны від пляцення, які

заснаваны на счапленні паміж сабой петляў адной ніткі [**16,** с. 403]. Пры гэтым у наш час існуе як пласт традыцыйнага вязання, якое можна ўбачыць у старадаўніх рэчах, так і пласт больш сучаснага, узоры і тэхнічныя прыёмы выканання якога маглі быць узяты з літаратуры і перыядычнага друку.

Вязанне не атрымала на Беларусі такога вялікага распаўсюджання, як, напрыклад, у краінах Скандынавіі ці Расіі. Цяжка сказаць, чаму ў старадаўнія часы на тэрыторыі Беларусі амаль не распаўсюджана было вязанне цэлых рэчаў, асабліва на прутках. Вязанне, як і іншыя віды традыцыйнага мастацтва, мае і агульныя рысы ў межах пэўнай тэрыторыі, і свае асаблівасці.

Вязаныя абрусы складаюць асобную групу ў фондах НПГКМЗ. Выкананыя ў ХХ стагоддзі, яны захавалі традыцыйныя формы, каларыт, узоры і назвы. Разнастайнымі з'яўляюцца тэхнікі іх выканання. Асабліва шырока ў музейным зборы прадстаўлены абрусы вязаныя кручком (16 адзінак).

Папулярнасць вязання ў першай палове ХХ стагоддзя спрыяла пашырэнню вырабу вязаных абрусаў. З часам ў народным мастацтве склаліся традыцыйныя прыёмы і тэхніка, якія перадаваліся з пакалення ў пакаленне. Часта ў карункавых узорах паўтараюцца матывы тканых узораў. Матэрыялам для вырабу вязаных кручком абрусаў служылі льняныя, ваўняныя, баваўняныя ніткі.

З дапамогай чаўнака (ігліцы) і дошчачкі на Падзвінні вязалі рыбалоўныя сеткі. Пачыналі вязаць сеткавае палатно, карыстаючыся, як правіла, кавалкам старой сеткі. Канец ніткі, наматанай на ігліцу, прывязвалі да крайняга левага вочка, вывязвалі некалькі радоў новых вочак, затым частку іх адразалі, крайні рад нанізвалі на вяроўку ці тоўстую нітку і давязвалі сетку да патрэбнай даўжыні [**4,** с. 461]. Па сетцы выконвалася вышыўка «ў насціл» ваўнянымі паліхромнымі ніткамі, шырока распаўсюджаная ў 20-я гады ХХ стагоддзя на Віцебшчыне, Гродзеншчыне, Магілёўшчыне, Міншчыне. Вышыўка на абрусах мела раслінна-кветкавы характар і дывановую кампазіцыю з акцэнтаваным цэнтрам, вугламі і бардзюрам. Для вышыўкі ўжывалі самапрадзеную пафарбаваную ў розныя яркія колеры воўну. Пераважнымі колерамі нітак былі чырвоны, сіні, зялё-

ны, жоўты. Вялікае значэнне меў фон, на якім выконвалася вышыўка. Часцей за ўсё ён быў чорнага колеру, таму арнамент успрымаўся вельмі выразна. Сеткі таксама маглі вязацца кручком або на раме.

У першай палове XX стагоддзя была распаўсюджана тэхніка вязання «на вілцы» кручком.

Яшчэ з канца XIX стагоддзя пашырэнне набывае вышыўка крыжыкам — адзін з тэхналагічных прыёмаў дэкору абрусаў калекцыі. Ва ўзорах пачатку XX стагоддзя раслінныя матывы займалі значнае месца. Сярод раслiннай арнаментыкі найбольшую папулярнасць набыў матыў пахіленай галінкі, ад якой у два бакі адыходзяць кветкі і лісце. Матывы вінаградных гронак і лістоў, карон звязаны з распаўсюджваннем штампаваных (бракараўскіх) узораў. Яны выконваліся якраз для аздаблення прадметаў бытавога ўжытку — ручнікоў ды абрусаў [**15,** с. 160].

Абрусы ўпрыгожваліся карункамі або махрамі. Вузкія канцы затыкаліся чырвонымі паскамі [**17,** с. 13]. Агульны кампазіцыйны сэнс чырвонай паласы па двух краях фрагмента настольніка — мяжа палатна. Дзве полкі маглі спалучацца прошваю, выкананай строчкаваю вышыўкай, якая паўтарае па колеры асноўную тканіну. Полкі таксама часта злучалі карункавым паскам (прошва, расшыўка).

Такім чынам, абрусы з музейнага збору НПГКМЗ, пры сваім стылявым адзінстве, пацвердзілі пэўныя рэгіянальныя адрозненні ў тэхніках ткацтва і прыёмах аздаблення. Настольнікі вызначаюцца разнастайнасцю арнаменту, дэтальнай распрацоўкай узораў. Асабліва трэба вылучыць ажурныя і сеткавыя, вышытыя раслінным буйнарапортным паліхромным арнаментам абрусы.

## Структура каталога

Сістэматызацыя прадметаў з'яўляецца важным этапам у працэсе падрыхтоўкі тэматычнага каталога. Выбар структуры залежыць ад асаблівасцей той ці іншай калекцыі. Улічваецца колькасць, аднатыпнасць прадметаў, прынцып камплектавання. У разглядаемым тэматычным каталозе абрусаў з музейнага

збору НПГМЗ, апісанне вырабаў падаецца ў храналагічным парадку з улікам тэхналагічных асаблівасцей выканання прадметаў.

Тэматычны каталог мае наступную структуру:

1. Уступны артыкул.
2. Асноўная частка (навуковае апісанне прадметаў, уключаных у калекцыю).
3. Бібліяграфія (кароткая даведка вывучэння тэмы).
4. Паказальнікі (імянны — паводле выканаўцаў, геаграфічны — паводле месца вырабу). Для зручнасці карыстання каталогам у «Паказальніках» пералічаны парадкавыя нумары музейных прадметаў па каталогу.
5. Слоўнік (тэрміналагічны).
6. Спіс скарачэнняў.

У каталожных дадзеных на кожны экспанат прыводзяцца наступныя звесткі:

1. Назва па функцыянальным прызначэнні абруса, яго мясцовая назва *(калі такія звесткі ёсць ў музейным апісанні экспаната).*
2. Дакладная дата ці прыкладнае датаванне вырабу абруса.
3. Матэрыял тканіны, тэхніка выканнання, тэхніка і матэрыял вышыўкі, дадатковыя аздобы, іншыя асаблівасці.
4. Памер абруса *(даўжыня х шырыня).*
5. Выканаўца *(гады яго жыцця ці год нараджэння).*
6. Месца стварэння *(вёска, раён, вобласць).*
7. Адкуль, ад каго, калі паступіў абрус.
8. Музейны інвентарны нумар.

Пры вылучэнні першаснасці тэхналагічнага прынцыпу пры сістэматызацыі абрусаў, вырабы былі падзелены на наступныя групы:

- тканыя
    - простае
    - шматнітовае
    - бранае
    - пераборнае
    - выбарнае
    - ажурнае
- вязаныя

  - кручком
  - «на вілцы»
  - пруткамі
- плеценыя
  - на раме

Такім чынам, абрусы з музейнага збору НПГКМЗ, якія ўключаны ў тэматычны каталог, пры дапаўненні іншымі матэрыяламі (палявымі назіраннямі, навуковымі працамі) — стануць каштоўнай навуковай крыніцай для вывучэння традыцыйнага тэкстылю Беларускага Падзвіння канца XIX — пачатку XX стагоддзяў.

## Спіс літаратуры

**1.** Архіў гісторыка-філалагічнага факультэта УА «Полацкі дзяржаўны універсітэт» (далей — АГФФ УА «ПДУ»): запісана этнаграфічнай экспедыцыяй 19.07.1996 г. ад Шастаковіча Віктара Юльянавіча, 1923 г.н., у в. Падрэзы Бешанковіцкага раёна.

**2.** АГФФ УА «ПДУ»: запісана этнаграфічнай экспедыцыяй 18.07.1996 г. ад Долгай Аляксандры Дзямідаўны, 1919 г.н., у в. Касмыры Бешанковіцкага раёна.

**3.** Беларускія народныя тканіны ў зборы Дзяржаўнага мастацкага музея БССР: Каталог. — Мн.: Беларусь, 1979. — 255 с., іл.

**4.** Браім, І.М. Сеткавязанне // Этнаграфія Беларусі: Энцыкл; Беларус. Сав. Энцыкл., Рэдкал.: І.П. Шамякін (гал. Рэд.) і інш. — Мн.: БелЭн., 1989. — С. 461.

**5.** Віннікава, М.М. Ажурныя тканіны Віцебшчыны / М.М. Віннікава // Помнікі мастацкай культуры Беларусі: Нов. даследаванні: Зб. Арт. / АН БССР. Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклора. Рэд. С.В. Марцэлеў. — Мн.: Навука і тэхніка, 1989. — С. 89–92.

**6.** Віннікава, М.М., Курыловіч, Г.М. Ткацтва // Этнаграфія Беларусі: Энцыкл; Беларус. Сав. Энцыкл., Рэдкал.: І.П. Шамякін (гал. Рэд.) і інш. — Мн.: БелЭн., 1989. — С. 495–497.

**7.** Віннікава, М.М. Шматнітовае ткацтва // Этнаграфія Беларусі: Энцыкл. (Беларус. Сав. Энцыкл., Рэдкал.: І.П. Шамякін (гал. Рэд.) і інш. — Мн.: БелЭн., 1989. — С. 539–540.

**8.** Дучыц, Л., Лобач, У. Стол // Беларуская міфалогія: Энцыклапед. слоўн. / С. Санько [і інш.] склад. І. Клімковіч. — 2-ое выд., дап. — Мн.: Беларусь, 2006. — С. 489–491.

**9.** Запісана аўтарам 13.08.2007 г. ад Назаравай Тамары Ільінішны, 1932 г.н., у в. Казакова Віцебскага раёна

**10.** Курилович, А.Н. Белорусское народное ткачество. Мн.: Наука и техника, 1981. — 119 с., ил.

**11.** Лабачэўская, В.А. Традыцыйны народны тэкстыль / В.А. Лабачэўская // Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. У 6 т. Т. 2. Віцебскае Падзвінне / Т.Б. Варфаламеева, А.М. Боганева, М.А. Козенка і інш.; Складальнік Т.Б. Варфаламеева. — Мн.: Бел. навука, 2004. — С. 835–891.

**12.** Нячаева, Г.Р. Арнамент: прастора рэчы і мова традыцыі. Жаночыя кашулі, «платкі» і абрусы. Неглюбка / Г.Р. Нячаева // Навуковыя запіскі Веткаўскага музея народнай творчасці / [уклад. Г.І. Лапацін]. — Гомель: Гомельскі дзярж. ун-т, 2004. — С. 111–138.

**13.** Селивончик, В.И., Винникова М.Н. Возрождение ремесла: Пособие по ручному узорному ткачеству. — Мн.: Полымя, 1993. — 142 с.: ил.

**14.** Пракоф'ева, Ю.С. Абрусы з калекцыі «Тканіна (тэкстыль) у фондах Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка» // Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых даследаванняў (да 80-годдзя пачатку археалагічных раскопак у г. Полацку): зб. навук.-практ. семінара, Полацк, 20–21 лістапада 2008 г. / пад агул. рэд. Д.У. Дука, У.А. Лобача. — Наваполацк: ПДУ, 2009. — С. 244–250.

**15.** Промыслы і рамёствы Беларусі / В.К. Бандарчык, В.С. Цітоў, Л.І. Мінько і інш. — Мн.: Навука і тэхніка, 1984. — 192 с.: іл.

**16.** Сахута, Я.М. Пляценне // Этнаграфія Беларусі: Энцыкл; Беларус. Сав. Энцыкл., Рэдкал.: І.П. Шамякін (гал. Рэд.) і інш. — Мн.: БелЭн., 1989. — С. 403–404.

**17.** Фадзеева, В.Я. Абрус // Народная культура Беларусі: Энцыкл. Даведнік. / Пад агул. рэд. В.С. Цітова; Маст. І.І. Бокі, У.М. Жук. — Мн.: БелЭн., 2002. — С. 13.

# Кірылічныя рукапісы XVIII — пач. XX стст. у фондах НПГКМЗ

*Шумовіч А.У.*

Для вывучэння гісторыі славянскай культуры неабходна прыцягваць матэрыялы старажытных славянскіх рукапісаў. Тэксты рукапісаў служаць крыніцай разнастайных гістарычных даследаванняў, іх вывучаюць гісторыкі, лінгвісты, літаратуразнаўцы, тэкстолагі і іншыя спецыялісты. Разам з тым, славянскія кодэксы ўяўляюць сабою гістарычныя помнікі, створаныя ў пэўную гістарычную эпоху на розных тэрыторыях, таму яны ўтрымліваюць каштоўную інфармацыю, якая паглыбляе і пашырае нашы веды аб мінулым.

Многія помнікі старажытнарускай пісьменнасці дайшлі да нашага часу дзякуючы стараверам. Выдаўцы са старавераў выпускалі зборнікі, якія мелі прамую сувязь са старажытнарускай рукапіснай традыцыяй, стваралі самі новыя або перадрукоўвалі рукапісныя зборнікі, якія скла́ліся раней у самім староверскім асяроддзі. У XVIII ст. друкуюцца ўсе найбольш вядомыя і любімыя старaверамі кнігі, якія перадрукоўваліся і перапісваліся і ў пазнейшы час. Пры гэтым крыніцай для многіх рукапісных спісаў у XVIII і XIX стст. служылі друкаваныя выданні.

Як вядома, многія рукапісы дайшлі да нашага часу не ў поўным выглядзе. Вядомы кнігі са страчаным пачаткам альбо канцом тэксту, часам адсутнічае раней існаваўшы тэкст у сярэдзіне. Прычыны страт розныя. Магчымы так званыя «натуральныя» страты, якія ўзніклі ў працэсе бытавання кніг. Пры частым карыстанні блок кнігі паступова разбураўся, страчваўся пераплёт, што прыводзіла да страты асобных аркушаў або сшыткаў з тэкстам. Часцей страчваліся пачатак і канцоўка тэксту. Гэта адзначаецца ў шматлікіх каталогах і апісаннях рукапісных кніг пры вызначэнні іх складу. Часам пры «натуральнай» страце тэксту сустракаюцца прыклады своеасаблівай рэстаўрацыі — узнаўлення страчанага. Нанова напісаныя і ўключаныя ў склад існуючых раней кодэксаў тэксты вельмі разнастайныя і па часе іх выканання, і па месцы, якое яны

займаюць у кодэксе. Больш новы тэкст можа быць устаўлены ў пачатак кнігі. Даследчыкі лічаць, што гэты тэкст можа быць напісаным замест страчанага. Уважлівае яго вывучэнне часам дазваляе зрабіць цікавыя гісторыка-культурныя высновы.

Невялікая па колькасці калекцыя кірылічных рукапісных кніг XVIII — пач. XX стст. захоўваецца і ў фондах НПГКМЗ. На сённяшні дзень яна складаецца з пяці адзінак. Пры вывучэнні гэтай калекцыі паўстала праблема правільнай атрыбуцыі кніг, якія ўваходзяць у яе. Асобнае месца ў рукапісным кірылічным кнігазборы запаведніка займае Псалтыр. Чатыры астатнія зборнікі — гэта так званыя пеўчыя кнігі знаменнага спеву.

Знаменны спеў — асноўны спеў старажытнарускай манадыйнай музыкі. Назва яго ад старажытнарускага слова «знамя» — знак, нота ў безлінейным запісе музыкі. Падпарадкаваны агульным кананічным прынцыпам праваслаўнай царкоўнай музыкі: папевачнаму развіццю, радку як асноўнаму вышыннаму ўзроўню формаўтварэння знаменнага песнапення, сістэме асмагласся. Выконваўся унісонным мужчынскім хорам. Песнапенні, запісаныя знаменнай натацыяй, са старажытнасці збіраліся ў асобныя зборнікі. Іх колькасць і склад пастаянна змяняліся і дапаўняліся.

У старапаморскай традыцыі і ў наш час асноўнымі з'яўляюцца наступныя пеўчыя кнігі: Ірмалой, Актай (Асмагласнік), Абіход, «Праздники», «Триодь», «Трезвон» («Стихераль»).

У богаслужбовай практыцы «по знамени» выконваецца не болей за 1/10 частку песнапенняў, якія ўваходзяць у пеўчыя кнігі. Таму паўсюдна складаліся разнастайныя кароткія зборнікі і скарочаныя рэдакцыі пеўчых кніг.

Навуковае апісанне кожнай рукапіснай кнігі складаецца з наступных раздзелаў:

- назва кнігі;
- імя аўтара, калі ён вядомы;
- дата напісання або перапіскі кнігі;
- матэрыял;
- тып пісьма (устаў, паўустаў, скарапіс...);
- колькасць аркушаў, сшыткаў, асаблівасці нумарацыі;
- фармат і памеры аркушаў кнігі;

– кароткая характарыстыка пераплёту або спасылка на яго адсутнасць;

– характарыстыка фізічнай захаванасці;

– наяўнасць запісаў (з поўным або частковым іх цытаваннем) і памет;

– характарыстыка мастацкага афармлення кнігі (мініяцюры, малюнкі, арнаментаваныя аркушы, застаўкі-рамкі, застаўкі, канцоўкі, ініцыялы, загалоўныя літары, вязь);

– характарыстыка натацыі ў пеўчых (нотных) рукапісах;

– склад кнігі;

– крыніца паступлення;

– уліковыя абазначэнні (№ па КП).

**1. Зборнік стараабрадніцкі** (У КП — «Распевы»).

Пасля 1789 г.

Папера ручнога адліву 1789 г. (фрагменты філіграні «1789 год»).

Паўустаў, крукі.

92 лл.

Фармат 8°. 17,0x11,5x2,5 см.

Пераплёт скураны, на дошках, зашпількі страчаны. Па скуры верхняй і ніжняй покрывак — цісненне раслінным арнаментам. Карашок з 4-х плашак. Па скуры карашка цісненне салярнымі знакамі.

Захаванасць: пачатак страчаны, забруджанасць аркушаў, плямы, адарваны першы аркуш.

Арнамент. На л. 3 а — малюнак: «Ключъ разуменія // отверзаетъ дверь // божественнаго пения...» — выява ключа, на ім адзначаны выявы знамен, асноўныя даўжыні гука («статия, полстатия» і інш.).

Натацыя: знаменны спеў.

Склад: 1) лл. 1 а — 2 б, «Проучки»; 2)лл. 3 а — «Ключъ разумения..», малюнак; 3) лл. 4 а — 13 б, «Имена знаменей»; 4) лл. 14 а — 43 а, «Фитникъ»; 5) лл. 44 а — 70 а, «Октоихъ»; 6) лл. 70 б — 85 а, «Задостойникъ»; 7) лл. 86 а — 92 б, «Начинает правого лика головщикъ».

Крыніца паступлення: закупка 1991 г., ад Рэйшэра Л.А., г. Полацк. (1800 руб.).

ПИКЗ КП11-6798.

**2. Обиходъ.**

1819–1900 гг.

Папера 1819 — 1939 гг. з ВЗ, філіграні: «18..2», «КГ»(«князь Гагарын»), «Улей» (без шчыта, на пастаменце, злева — 2 пчалы, справа — куст). Дрэва, скура, метал.

Паўустаў, крукі.

66 лл. Нумарацыя лл. адсутнічае.

Фармат 4°. 23,5х 8,7х3,0 (38,5) см.

Пераплёт скураны, на дошках, 2 металічныя зашпількі. На верхняй і ніжняй покрыўках рэшткі ціснення раслінным і кветкавым арнаментам. Карашок з 4-х плашак.

Захаванасць: пачатак страчаны, тэкст на л.1а закрэслены, пачатак на л.1б; плямы, забруджванні вуглоў, расплыванне тэксту, пажоўкласць паперы.

Запісы: на форзацы верхняй покрыўкі — 1) «пробы пяра»; 2) «БЕ БЕСПЛО // ТНОЕ».

На форзацы ніжняй покрыўкі: «Сия книга Федора Сафонова Рубина»

— алоўкам. ніжэй, другім почыркам: «Сия книга куплина у Федра // Сафонова Рубина».

Арнамент. Вязь, ламбарды.

Натацыя: знаменны спеў.

Склад: 1) л. 1 а, тэкст (магчыма, з Асьмігласніка) закрэслены; 2) л. 1 б — 66 б, «Обиход».

Крыніца паступлення: перадача ад Сапрончык С.Л., г. Полацк.

НПГКМЗ КП19-23244.

**3. Обиходъ.**

З 1862 па 1900 гг.

Папера 2-й паловы XIX ст. (1862–1882 гг.). На паперы штэмпелі прамавугольнай формы з закругленымі вугламі:

1) «Компании // Угличской // фабрики», 2) «Высочайше утв. Компании // Угличской фабрики».

Паўустаў, крукі.

270 лл.

Фармат 4°. 23,0х18,0х4,6 (36,5) см.

Пераплёт скураны, на дошках, вельмі пацёрты, зашпількі страчаны. На скуры пераплёту рэшткі ціснення геаметрычным і раслінным арнаментам. Карашок з 4-х плашак. Абрэз таніраваны.

Захаванасць: плямы, закапванні воскам, пажоўкласць паперы, пацёртасці і пашкоджанні скуры пераплёту, адарвана ніжняя покрыўка.

Арнамент. Рамка тытульнага аркуша, 2 ініцыялы, вязь, ламбарды.

Натацыя: знаменны спеў.

Склад: 1) л. 1 нн. а, тыт. л.; 2) л. 1 нн. б — 2 нн. а, «Начало всенощного бдения»; 3) л. 2 нн. б — 170 а, «Службы утренние, вечерние...»; 4) л. 171 а — 213 б, «Стихиры евангельские»; 5) л. 215 а — 230 б, «В неделю цветоносную»; 6) л. 230 б — 267 а, «Канон Пасце».

Крыніца паступлення: закупка 1987 г. ад Яфімава А.П. г. Наваполацк (50 руб.).

ПИАЗ КП4-2228.

**4. Псалтирь.**

З 1862 па 1910 г.

Папера к. XIX — пач. XX стст. На паперы штэмпель прамавугольны «Фабрика // № 6 // Аристархова».

Паўустаў.

520 лл.

Фармат 4°. 24,0х19,5х8,5 (44,7) см.

Пераплёт скураны, на дошках, 1 металічная зашпілька, аздобленая раслінным арнаментам, другая страчана. Карашок з 4-х плашак, аздоблены ціснennem геаметрычным арнаментам у выглядзе кругоў. На верхняй і ніжняй покрыўках рэшткі ціснення геаметрычным арнаментам.

Захаванасць: пажоўкласць паперы, загіны і зацёртасці

вуглоў, расшыты кніжны блок, пашкоджанні пераплёту, страта 1 зашпількі, закапванне воскам.

Запісы: 1) На форзацы верхняй покрыўкі — гаспадарчыя запісы (каму, або ў каго пазычаны грошы). 2) У пачатку кнігі ўшыты сшытак з шэрай паперы — роспіс парадку служб: « 1) Начало вечерьни и часов // 1 царю небесный (нрзб.) нет // 2 святый Боже 3 р. // 3 слава Отцу и Сыну // 4 присветая Троица // 5 Господи Помилуй 3 р. // 6 Слава Отцу // 7 Отче наш // Господи // 8 Господи помилуй 12 р. // Слава Отцу // приидите покл. Царю и богу нашему // Господи Ису // молитвы ради» — фіялет. чарн.

Арнамент. Малюнак «Цар Давыд», 150х105 (л. 2 нн. б), 29 маляваных заставак, 17 ініцыялаў, ламбарды, 1 канцоўка, вязь.

Склад: 1) лл. 1 нн. а — 2 нн. б, «Разумно да будеть, како начати иноку особь пети Псалтырь»; 2) лл. 2нн. б — малюнак «Цар Давыд», 150х105; 3) лл. 1 а — 170 б, кафізмы 1–20; 4) лл. 1 а 2 паг. — 18 а, «Песнь Моисеева во Исходе»; 5) лл. 18 а — 20 б, «Указ како совершити Псалтырь»; 6) лл. 1 а 3 паг. — 28 б, «Устав... всем, хотящим пети Псалтырь»; 7) лл. 1 а 4 паг. — 22 б, «Полунощница воскреная»; 8) лл. 23 а — 68 б, «Каноны»; 9) лл. 1 нн. а — 58 нн. а, «Месяцеслов (сент. — авг.)»; 10) лл. 58 нн. а — 232 нн. б, «Тропари и кондаки».

У пачатку кнігі ўстаўлены сшытак з шэра-блакітнай паперы (лл.1нн.б — 3нн.б) з тэкстам малітвы Архангелу Міхаілу (чорн. туш, паўустаў 1-й чв. XX ст.).

У канцы кнігі ўстаўлены сшытак з шэрай паперы з тэкстам малітваў (хімічны аловак, 1940–1950-я гг.).

Крыніца паступлення: закупка 2002 г. ад Далныгіна А.М., Полацкі раён.

ННГКМЗ КП17-19257.

**5. Зборнік стараабрадніцкі** (у КП — «Кніга рукапісная «Азбука певчая...»).

1890-я — 1910 гг.
Папера к. XIX — пач. XX стст.
Паўустаў, крукі.
238 лл.

Фармат 4°. 23,5х19,5х5,0 (39,0) см.

Пераплёт скураны, на дошках, вельмі пашкоджаны, закапаны воскам, зашпількі страчаны. Карашок з 4-х плашак.

Захаванасць дрэнная: шматлікія надрывы, страты фрагментаў аркушаў, пажоўкласць паперы, загіны вуглоў, закапванне воскам.

Запісы: на форзацы — «пробы пяра».

Арнамент. Малюнак у форме трохвугольнай піраміды (л.1б.), вязь, ламбарды.

Натацыя: знаменны спеў.

Склад: 1) л. 1 б, малюнак; 2) лл. 2 а — 18 а, «Азбука певческая»; 3) лл. 18 б — 30 а, «Фитникъ»; 4) лл. 30 б — 31 б, «Повесть о хмелю»; 5) лл. 32 б — 147 а, «Октай»; 6) лл. 147 б — 172 а, «Стихиры»; 7) лл. 172 б —173 б, «Толковое Евангелие. Слово на успение Богородицы» — рукапіс 30–40 гг. XX ст.; 8) лл. 174 а — 238 б, «Тропари, кафизмы».

Крыніца паступлення: 1989 г.

КВФ2-822.

## Спіс літаратуры

**1.** Беляева, О.К. К вопросу об использовании памятников древнерусской письменности в старообрядческих полемических сочинениях первой четверти XVIII в. // Общественное сознание, книжность, литература периода феодализма. — Новосибирск, 1990. — С. 9–16.

**2.** Знаменный распев // Христианство: Энцикл. словарь. Т. 1. — М., 1993. — С. 561.

**3.** Касцюкавец, Л.П. Знаменны спеў // Рэлігія і царква на Беларусі: Энцыкл. даведнік. — М., 2001. — С. 119.

**4.** Клепиков, С.А. Филиграни и штемпели на бумаге русского и иностранного производства XVII–XX века. — М., 1959.

**5.** Князевская, О.А. О значении кодикологического исследования рукописных источников // Общественное сознание, книжность, литература периода феодализма. — Новосибирск, 1990. — С. 128–133.

**6.** Лозовая, И.Е. Азбука певческая. // Православная энциклопедия. Т. 1. — М., 2000. — С. 330–332.

**7.** Обиход церковный. // Христианство: Энцикл. словарь. Т. 2. — М., 1992. — С. 235.

**8.** Октоих нотный // Христианство: Энцикл. словарь. Т. 2. — М., 1992. — С. 241–242.

**9.** Пособие по изучению церковного знаменного пения / Сост. Е. Григорьев. — Рига, 1992.

**10.** Экспертиза и научно-техническая обработка рукописных книг: Методические рекомендации / Гос. Библиотека СССР им. В.И. Ленина; Сост. Ю.Д. Рыков. — М., 1990.

# Дадаткі

# Система управления учебным контентом ATutor как информационная среда виртуального музея

***Оськин А.Ф.***
*Полоцкий государственный университет,*
*Полоцк*

**Введение**

Системы управления учебным контентом, типичным представителем которых является система ATutor, развиваются в направлении наращивания функциональности с постепенным преобразованием в многофункциональные и мультимодальные информационные среды с мощными презентационными и поисковыми возможностями.

Типичными примерами такого развития могут служить американские проекты «Alexandria Digital Earth Prototype» (ADEPT) [**1; 2; 3**] и «Digital Library for Earth System Education» (DLESE) [**4**], ориентированные на информационную поддержку обучения и научных исследований в области наук о Земле. Ещё одним примером могут служить эволюции американо-германского проекта «Archimedes», целью которого является создание интерактивной информационно-образовательной среды по истории механики.

В этом же направлении развивается и система управления учебным контентом ATutor, используемая в качестве системы управления обучением на кафедре технологий программирования Полоцкого государственного университета.

Разработанная в университете канадского Торонто и распространяемая как приложение с открытым кодом на условиях лицензии GNU General Public License (GPL), эта система в процессе эксплуатации обрастала дополнительными модулями и сейчас представляет собой многофункциональную информационную среду, которая может быть использована в качестве:

• образовательной системы, выполняющей функции информационной поддержки управляемой самостоятельной работы студентов;

• электронного архива, медиатеки с реализованным полнотекстовым поиском по описаниям документов (аннотациям и рефератам), а также с возможностями создания тематических коллекций документов с простой и удобной навигацией по ним;

• интерактивной экспозиции, виртуального музея с возможностями онлайн-взаимодействия с музейными Internet-ресурсами;

• электронной библиотеки с мощными средствами работы с текстом, а также с возможностями хранения, обработки и презентации нетекстовых единиц информации;

• социальной сети, типа сервисов «Одноклассники.ru» или «В контакте.ру».

Настоящая статья посвящена описанию системы управления учебным контентом ATutor и особенностей реализации интерактивных музейных экспозиций на его основе.

**Системы управления учебным контентом**

Прежде всего, опишем принципы, которых мы придерживались, создавая информационно-образовательную среду кафедры.

Во-первых, было решено, что система будет строиться на основе технологий клиент-сервер. Именно эти технологии используются при построении систем e-Learning, а также при построении корпоративных информационных систем, систем управления ресурсами предприятия и т.д.

Технологии клиент-сервер предполагают связь клиента с сервером с помощью локальной сети или через Интернет. Наиболее распространёнными сетевыми протоколами в настоящее время являются протоколы семейства TCP/IP. Кроме того, как показывает технико-экономический анализ, выполненный М. Сокольским в книге [**5**], построение системы на базе этих протоколов является наиболее экономичным. Учитывая это, протоколы семейства TCP/IP и были выбраны нами при реализации проекта.

Следующим важным шагом был выбор операционной системы, в которой будет реализовываться разрабатываемая

среда. Мы остановились на ОС Windows, как на наиболее широко используемой в учебных заведениях.

Теперь было необходимо определиться с выбором Web-сервера, системы управления базами данных и языка программирования. Проведённый анализ литературных источников (см. [**6–9**]) и Интернет-ресурсов [**10–18**] показал, что для указанных целей чаще всего используются следующие платформы:

- web-сервер Apache, система управления базами данных MySQL и язык программирования PHP;
- решения на основе Java-технологий;
- решения на базе сервера приложений Zope и язык программирования Pithon.

Платформа Apache+MySQL+PHP используется примерно в 65–70 % случаев, что и повлияло на наш выбор — было принято решение о реализации создаваемой среды именно на этой платформе.

Перед началом работы над проектом также необходимо было определиться с тем, как этот проект будет реализовываться. Здесь также возможны три решения.

- Самостоятельная разработка системы.
- Адаптация готовых коммерческих решений.
- Использование в проекте систем с открытым исходным кодом, т.е. систем, распространяемых на основе лицензии GNU [**19**].

Самостоятельно разрабатывать систему трудоёмко и долго. Необходим штат квалифицированных программистов, специалистов по внедрению и сопровождению и т.д. Неприемлемым представлялся и второй вариант из-за относительно высокой стоимости коммерческих решений и сложности сопровождения. Поэтому, учитывая, что перед нами стояла задача создания прототипа типовой системы в сжатые сроки, но с высоким качеством, мы остановились на третьем варианте. Использование систем с открытым кодом, кроме того, предоставляет разработчику прекрасные возможности для доработок и совершенствования системы, адаптации системы под нужды конкретного заказчика, создания и интеграции в систему новых модулей, апробация новых технологий обучения. Всё вышеперечисленное и определило наш выбор.

В большинстве европейских проектов, посвящённых системам e-Learning, в качестве технологической основы проекта рассматриваются Learning Management Systems (LMS) — системы управления обучением, комплексы программных средств, предназначенные для создания и распространения учебного контента, а также для контроля освоения этого контента обучаемыми.

Как уже было указано выше, система управления обучением является основой e-Learning-комплекса. К настоящему времени в мире разработано несколько сотен LMS, отличающихся друг от друга набором сервисов, стоимостью, удобством работы и другими параметрами.

Перечислим функции, которые должна реализовывать эта система:

- учет обучаемых, персонализация, разграничение прав доступа;
- управление процессом обучения, учет результатов обучения и тестирования;
- интеграция с механизмами синхронного и асинхронного общения;
- подготовка аналитической отчетности;
- интеграция с внешними информационными системами (например, с системой кадрового учета или с системой «Деканат»).

С помощью средств разработки учебного контента создаются учебные материалы и тесты, которые затем помещаются в базу данных системы управления обучением. Через неё обучаемые получают доступ к учебным материалам. Система обмена информацией позволяет обучаемым, преподавателям, экспертам и другим участникам учебного процесса обмениваться информацией между собой как в режиме реального времени (синхронно) так и асинхронно.

Учебный контент может быть как статическим (HTML страницы, тексты), так и интерактивным, с элементами анимации и голосовым сопровождением. Для создания статического контента можно использовать стандартные редакторы, такие как Microsoft Word. Интерактивный контент создаётся с помощью специальных программных продуктов.

Модуль обмена информацией LMS-системы позволяет реализовать следующие функции (в зависимости от выбранного программного обеспечения):

• асинхронное общение — форумы, доски объявлений, электронная почта;

• синхронное общение — голосовой и текстовой чат, видеоконференции, совместное использование программных продуктов, виртуальная аудитория.

На рынке программных продуктов имеется значительное количество LMS систем, существенно отличающихся друг от друга набором предоставляемых сервисов.

Для сравнительного анализа систем управления обучением воспользуемся ресурсом http://edutools.info — сайтом, созданным WCET (the Western Cooperative for Educational Telecommunications), организацией, объединяющей разработчиков и пользователей телекоммуникационных образовательных технологий. Стартовая страница сайта приведена на рисунке 1.

На странице CMS (Course Management System) данного ресурса собрана коллекция ссылок на наиболее популярные в мире системы управления обучением (системы управления курсом — Course Management System — по терминологии сайта EduTools). По каждой из систем приведён перечень инструментов, доступных пользователям различных категорий, и реализован механизм, позволяющий выполнить сравнение и выбор наиболее подходящей системы управления обучением. Системы сравниваются по следующим группам инструментов и характеристик.

• Инструментарий администратора системы.
• Инструментарий преподавателя.
• Инструментарий обучаемого.
• Технически характеристики сравниваемых систем.
• Дополнительные характеристики.

В раздел **«Инструментарий администратора системы»** входят следующие инструменты.

• Инструментарий идентификации пользователя. Наличие у системы этого инструмента позволяет разграничить доступ пользователей к различным разделам учебного ресурса

и настроить систему таким образом, чтобы обучаемый сразу попадал на нужную ему страницу.

• Запись обучаемого на курс. Эта функциональная характеристика позволяет вести учёт слушателей данного курса и управлять списком слушателей.

• Регистрация слушателей. С помощью регистрации можно добавлять и удалять студентов, пользующихся системой. Средства регистрации используются администраторами и преподавателями. В некоторых системах разрешена саморегистрация — студент может сам добавить себя в список пользователей системы, зайдя на соответствующую страницу регистрации.

**Инструментарий преподавателя.** В системах управления обучением реализуется следующий набор инструментов, доступных преподавателю.

• Средства разработки учебных курсов. Все системы управления обучением содержат этот инструмент. Кроме того, некоторые системы поддерживают импорт разработанных с помощью специальных программных средств, называемых инструментарием автора (Authoring Tools). Возможен импорт учебных курсов из централизованных хранилищ-репозиториев курсов. Для реализации этой функции необходимо, чтобы учебные курсы оформлялись в соответствии с существующими стандартами. Наибольшее распространение получил стандарт, разработанный Международным образовательным консорциумом (International Learning Consortium — IMS). Эта организация возникла в 1999 году, объединив крупнейших производителей программного обеспечения, таких как MicroSoft и Oracle, крупнейших производителей персональных компьютеров, таких как IBM и Apple, ряд издательств учебной литературы (Thomson Publisher и др.) и ряд университетов.

• Средства проверки знаний обучаемых. К этой группе инструментов относятся различные тестирующие и проверяющие системы. Эти инструменты включаются в состав всех систем управления обучением и различаются только набором типов тестов и опросов, реализованных в системе.

• Средства мониторинга действий студента. Эти средства позволяют преподавателю отслеживать динамику освоения курса каждым студентом, собирать и накапливать статистиче-

ские данные об относительной сложности разделов изучаемого курса, считая критерием сложности время, затраченное студентом на освоение того или иного раздела. В большинстве систем ведётся также статистика прохождения студентами тестов, позволяющая анализировать и оценивать сложность и качество используемых тестов и тестовых заданий.

• Ряд систем имеет дополнительные сервисы, такие как, например, наличие шаблонов учебных курсов, ускоряющих процесс создания новых курсов, средства, позволяющие изменять внешний вид созданных страниц, средства преподавательского дизайна, позволяющие самостоятельно оформить создаваемые страницы и т.д.

**Инструментарий обучаемого.** К инструментам обучаемого в системах управления обучением относятся следующие сервисы.

• Средства обучения. В эту группу входят различные средства, с помощью которых осуществляется доставка обучаемым учебного контента. Это электронные конспекты учебных курсов, внутренняя электронная почта, средства интерактивного общения — форумы и чаты, а также записные книжки, журналы, видео-сервисы.

• Средств повышения продуктивности обучения. Сюда относятся средства поиска нужного материала по изучаемому курсу, планировщики и средства контроля за исполнением планов, средства, позволяющие копировать и распечатывать нужные фрагменты изучаемых курсов или курсы целиком, закладки.

• Средства студенческого сотрудничества. Это средства, позволяющие организовать групповую работу над проектами, средства создания студенческих сообществ, средства для самооценивания, средства создания студенческих портфолио.

К техническим характеристикам систем относятся требования, предъявляемые системой к клиентскому браузеру, требования к используемым системам управления базами данных, требования к программному обеспечению сервера, а также используемая операционная система.

На основании сравнения систем управления обучением по перечисленным выше характеристикам нами и был осущест-

влён выбор LMS для нашего проекта. Кроме данных с сайта EduTools, мы использовали материалы с сайта UNESCO (http://www.unesco.org), на котором также имеется аннотированная коллекция ссылок, на свободно распространяемые системы управления обучением и системы, распространяемые на основе лицензии GNU [**19**].

После анализа более девяноста систем, на двух указанных сайтах, мы остановили свой выбор на системе управления учебным контентом ATutor (http://www.atutor.ca, см. **рис. 2**), разработанной в университете г. Торонто. Эта система имеет наиболее сбалансированный набор функциональных характеристик и идеально подходит для нашего проекта.

## Применение системы управления учебным контетентом ATutor в качестве информационной среды виртуального музея

Как уже отмечалось, система управления обучением ATutor успешно используется нами в качестве основы для построения информационно-образовательной среды кафедры и поддержки учебного процесса. Также отмечалось, что имеющийся в системе информационно-образовательный потенциал позволяет использовать её и в качестве рабочей среды для построения виртуальных музеев. Рассмотрим теперь подробнее, какие требования предъявляются к информационным средам для построения виртуальных музеев и как эти требования реализованы в системе ATutor.

Интернет-энциклопедия Википедия даёт следующее определение понятию «виртуальный музей».

«Виртуальный музей (вебсайт-музей) — тип веб-сайта, оптимизированный для экспозиции музейных материалов. Представленные материалы могут быть из самых различных областей: от предметов искусства и исторических артефактов до виртуальных коллекций и фамильных реликвий. Виртуальные музеи представляют собой удачный пример применения Интернет-технологий для решения проблем хранения, безопасности и широкого, быстрого и лёгкого доступа к экспонатам.

Первые вебсайт-музеи стали появляться в Интернете в 1991 году. Сначала виртуальные музеи были сайтами реальных музеев, но вскоре стали появляться и персональные вебсайт-музеи. Логика проста: если дом может стать домом-музеем, то домашняя страница может стать страницей-музеем. Первый персональный вебсайт-музей, назвавший себя таковым, появился в 1994 году.

Не всякий набор фотографий имеет право называться вебсайт-музеем. Цифровая коллекция виртуального музея должна иметь две отличительные характеристики:

- виртуальный тур;
- продвинутый поиск [см. http://ru.wikipedia.org].

Кроме этих требований, среда, используемая для создания виртуального музея, должна обладать следующими свойствами:

- лёгкостью и простотой модификации;
- соответствием современным требованиям к оформлению интерфейса виртуального музея;
- платформонезависимостью;
- небольшими материальными затратами на разработку и использование;
- максимальной автоматизацией процесса разработки и поддержки музея.

Как показывает наш опыт эксплуатации системы ATutor, она в полной мере соответствует перечисленным требованиям.

Действительно, виртуальные туры могут быть организованы в виде отдельных учебных модулей — основных дидактических единиц, с которыми работает ATutor. Модули могут монтироваться из имеющихся компонентов, хранящихся в репозитории системы.

Мощная поисковая система, реализованная в ATutor'е, решает проблемы продвинутого поиска.

Контент, созданный в описываемой среде, может быть легко и просто модифицирован благодаря имеющемуся в системе инструментарию для создания и редактирования учебного контента.

Интерфейс системы может быть легко изменён благодаря встроенным в ATutor инструментам.

Как уже указывалось выше, система написана на языке

PHP и использует в качестве базы данных СУБД MySQL, что делает ее платформонезависимым приложением.

Наконец, работы по созданию и поддержке виртуального музея могут быть в значительной степени автоматизированы, что, естественно, снижает затраты на его разработку и использование.

Таким образом, применение системы управления учебным контентом ATutor в качестве информационной среды для построения виртуального музея позволяет просто и элегантно решить все проблемы, возникающие перед разработчиками виртуальных музейных экспозиций.

## Список литературы

**1.** Smith, T. Some Aspects of Developing and Using the Digital Learning Environment in Alexandria Digital Earth Prototype / T. Smith, A. Ushakov, B. Heller // Proc. of the 5th National Russian Research Conference «Digital Libraries: Advanced Methods and Technologies, Digital Collections» RCDL'2003 / A. Ushakov, Bi. Heller., — St.-Petersburg, 2003. — P. 18–25.

**2.** Agapova, O. Developing Digital Library Visual Services for Building a Lesson-Design Environment Prototype / O. Agapova [et al.] // Proc. of the 5th National Russian Research Conference RCDL'2003, St.-Petersburg, Russia, 2003, p. 130–139.

**3.** Ushakov, A.S. Exploring the Semantic Types of Relationships for Visual Query Development / A.S. Ushakov [et al.] // Proc. of the 6th National Russian Research Conference RCDL'2004, Pushchino, Russia, Sept. 19 — Oct. 1, 2004, — P. 141–149.

**4.** Marlino, M. T. Sumner. A Model and Research Agenda for Educational Community-based Digital Libraries: The Digital Library for Earth System Education / M. Marlino, T. Sumner. // Proc. of the 5th National Russian Research Conference «Digital Libraries: Advanced Methods and Technologies, Digital Collections» RCDL'2003. — St.-Petersburg, 2003. — P. 26–34.

**5.** Сокольский, М. В. Все об Intranet и Internet. — М.: Элиот, 1998. — 254 с.

**6.** Захарова, И. Г. Формирование информационной образовательной среды высшего учебного заведения: автореф. дис. …д-ра пед. наук. — Тюмень, 2003.

**7.** Захарова, И.Г. Возможности информационных технологий в совершенствовании образовательного процесса высшей школы: Монография. — Тюмень: ТюмГУ, 2002. — 176 с.

**8.** Захарова, И.Г. Формирование образовательной среды университетского комплекса на базе Web-сервера // Образовательные технологии: Сб. научных трудов. Вып. 9. — Воронеж: ВГПУ, 2002. — С. 12–15.

**9.** Григорьев, С.Г. Методико-технологические основы создания электронных средств обучения / С.Г. Григорьев, В.В. Гриншкун, С.И. Макаров. — Самара: Изд-во Самарской государственной экономической академии, 2002. — 110 с.

10. E-Learning Centre — http://www.e-learningcentre.co.uk/eclipse/index.html.

11. Distance Educator — http://www.distance-educator.com/Online.

12. VNU Learning — http://www.vnulearning.com.

13. Learnavity — http://www.learnativity.com/index.html Сайт, содержащий большую подборку аналитических материалов по e-learning

14. ELearners — http://www.elearners.com.

15. Learning Circuits — http://www.learningcircuits.com.

16. Distance Learning Resource Network — http://www.dlrn.org.

17. Yahoo Distance Learning — http://dir.yahoo.com/Education/distance_learning.

18. e-commerce.ru — http://www.e-commerce.ru/analytics/analytics-part/analytics12.html.

19. GNU GENERAL PUBLIC LICENSE Copyright (C) 1989, 1991 Free Software Foundation, Inc. 59 Temple Place, Suite 330, Boston, MA 02111-1307 USA




**Рис. 1.** Стартовая страница сайта EduTools




**Рис. 2.** Страница разработчиков системы управления учебным контентом ATutor.

## Змест

Ад укладальніка ........................................................................ 3

**Навуковыя даследаванні**

**Андреева Н.А., Смирнова Т.Р.** Роль музейного предмета в образовательно-воспитательной функции музеев ..........7

**Воднева І.П.** Полацкае Дваранскае павятовае вучылішча ... 21

**Мельянцава Т.А**. Інфармацыйны агляд па выніках наведвання культавых устаноў Полацкага раёна .......... 25

**Орлова Т.А.** Историческая застройка квартала, ограниченного улицами Ленина, Нижне-Покровская, Свердлова ........................................................................ 33

**Поляков С.И.** Полоцкий кадетский корпус. История в лицах ................................................................ 48

**Салаўёў А.А.** Даследаванні другога паверха корпуса «В» полацкага езуіцкага калегіума (падчас рамонту 2003–2008 гг.) ......................................... 60

**Студзенікіна Ю.У.** Агульныя тэндэнцыі развіцця гандлю ў Полацку ў XIX ст. ........................................................... 82

**Сыревич И.В.** «И вспомнить страшно, и забыть нельзя…» ........................................................... 97

**Агляд калекцый, каталогі прадметаў з фондаў НПГКМЗ**

**Анучына Н.У.** Выданні беларускага замежжа ў фондах НПГКМЗ ........................................................... 125

**Волков А.И.** К вопросу об историческом исследовании коллекции живописи XVIII века Национального Полоцкого историко-культурного музея-заповедника ... 132

**Даражкоўскі С.Л.** Агляд калекцыі шклянога посуду з фондаў НПГКМЗ ..............................................................173

**Магалінскі І.У.** Сякеры X–XVIII стст. з фондаў Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка ............................................................ 179

**Пракоф'ева Ю.С.** Абрусы з музейнага збору НПГКМЗ: уступны артыкул да тэматычнага каталога ...................196

**Шумовіч А.У.** Кірылічныя рукапісы
XVIII — пач. XX стст. у фондах НПГКМЗ .................... 208

**Дадаткі**

**Оськин А.Ф.** Система управления учебным контентом ATutor
как информационная среда виртуального музея ............. 219

# Матэрыялы
# навукова-практычнай канферэнцыі
(па выніках навукова-даследчай работы ў 2008 г.)

Укладальнік
**Джумантаева Тамара Аляксандраўна**,
намеснік дырэктара па навуковай рабоце

Адказны за выпуск *В.У. Гаўрылаў*
Карэктар *В.Я. Ашуева*
Камп'ютэрная вёрстка *С.Г. Урбан*
Дызайн вокладкі *С.Г. Урбан*

Падпісана да друку 01.12.2009 г.
Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$. Папера «HP Papers». Гарнітура «Times», «Arial»
Друк лазерны. Тыраж 50 экз.

Надрукавана на абсталяванні
навукова-інфармацыйнага аддзела НПГКМЗ
211400, г. Полацк, вул. Ніжне-Пакроўская, 22

Нацыянальны Полацкі
гісторыка-культурны
музей-запаведнік